Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

16 СТУДЗЕНЯ 2015 г. ПЯТНІЦА № 8 (27866) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Прадстаўляючы прэм'ер-міністра Андрэя Кабякова дэпутатам, Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка абазначыў асноўныя задачы, якія стаяць перад урадам і яго новым кіраўніком, а таксама прыярытэты дзяржаўнай палітыкі. СТАР. 2

Шлях у прафесію пачаўся з футбола СТАР. 5

Ці трэба вяртаць чужыя мільёны? СТАР. 13

ЦЫТАТА ДНЯ

Анатоль ЛІС, старшыня Брэсцкага аблвыканкама:

«Адна з задач у рабоце з моладдзю — гэта максімальнае яе ўцягванне ў актыўны і здаровы вольны час і грамадска карысныя справы. Трэба адцягваць маладых людзей ад камп'ютара, пустога баўлення часу ў сацыяльных сетках: акрамя таго, што чалавек адрываецца ад рэальнага свету, праз інтэрнэт ідзе і шмат негатыўнага. Вялікай праблемай у маладзёжным асяроддзі з'яўляецца распаўсюджванне спайсаў, наркотыкаў. З майго пункту гледжання, гэтая праблема ўзнікае ў тым выпадку, калі ў маладых людзей шмат вольнага часу і яны прадастаўлены самі сабе. Калі малады чалавек увесь час заняты нейкай справай — вучобай, спартыўнымі секцыямі, яму няма калі думаць аб дрэнным».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 16.01.2015 г.

Долар ЗША	14960,00	▼
Еўра	17620,00	▼
Рас. руб.	230,00	▲
Укр. грыўня	945,64	▼

ISSN 1990 - 763X

Прыемныя клопаты

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Надвор'е

ПАНУЮЦЬ ГАЛЁШЫ,

АЛЕ Ў НАСТУПНУЮ СЕРАДУ СТАНЕ НА 2–3 ГРАДУСЫ ХАЛАДНЕЙ

У пятніцу на тэрыторыю Беларусі пачне паступаць паветраная маса з боку паўднёвага захаду Еўропы. Таму ў асобных раёнах на поўначы краіны пройдуць мокры снег і дождж, паведаміла спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.

Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе ад нуля да 6 °С цяпла. У суботу кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу чакаюцца ў паўночна-заходнім рэгіёне краіны. Уначы і раніцай месцамі — туман і галалёд, на дарогах — галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы на суботу складзе ад мінус 4 да плюс 2 градусаў, удзень — ад 0 да плюс 7 градусаў. У нядзелю да нас завітаюць актыўныя атмасферныя франты, таму ўжо паўсюдна пройдуць мокры снег і дождж. Уначы месцамі — туман і галалёдныя з'явы. Тэмпература паветра ўначы на нядзелю прагназуецца ў межах ад мінус 2 да плюс 3 градусаў, удзень — ад 0 да 6 °С цяпла.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных спецыялістаў, у пачатку наступнага тыдня характар надвор'я істотна не зменіцца. Часам будуць ісці мокры снег і дождж. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 3 да плюс 3 градусаў, удзень будзе ад 0 да плюс 5 градусаў. У сярэдзіне наступнага тыдня стане крыху халадней, бо прагназуецца, што сярэднясутачная тэмпература стане на 2–3 градусы ніжэйшай. Месцамі будуць ісці снег і мокры снег.

Сяргей КУРКАЧ.

Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

НА ПРАМОЙ ЛІНІІ — МІНІСТР КУЛЬТУРЫ

Кожны чытач «Звязды», грамадзянін, беларус — увогуле чалавек мае дачыненне да пытанняў культуры. За якой стаяць і міжчалавечыя адносіны, і захаванне нацыянальнай спадчыны, і новыя пастаноўкі ў тэатрах, і сучаснае кіно, і літаратурныя тэндэнцыі... Культура — гэта аснова развіцця, станаўлення асобы, нашай будучыні.

Па якой сістэме, у якіх напрамках павінна развівацца беларуская культура з усімі яе складнікамі, чытачам «Звязды» раскажа **міністр культуры Барыс Уладзіміравіч СВЯТЛОЎ** падчас прамой лініі, якая адбудзецца ў рэдакцыі газеты «Звязда» **30 студзеня**. Дакладны час будзе вядомы пазней.

Каб папярэдне пакінуць свае пытанні, дасылайце іх на электронны адрас (info@zvyazda.minsk.by з пазнакай «Прамая лінія») ці тэлефануйце па нумары: 287-18-51.

АБ'ЯДНАЦЬ РЭСУРСЫ, ЗДОЛЬНАСЦІ, МАГЧЫМАСЦІ І ТАЛЕНТЫ

Толькі так можна выстаяць у сучасных умовах

Учора на пасяджэнні шостай пазачарговай сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу дэпутаты далі згоду на назначэнне Андрэя Кабякова прэм'ер-міністрам. Пазачарговая сесія была склікана ў адпаведнасці з ч. 6 арт. 95 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Прадстаўляючы Андрэя Кабякова дэпутатам, Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка абазначыў асноўныя задачы, якія стаяць перад урадам і яго новым кіраўніком, а таксама прыярытэты дзяржаўнай палітыкі.

Свежыя ідэі для збалансавання эканомікі

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што паставіў задачу ўраду пачаць работу над праектам Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на 2016–2020 гады. Пры гэтым Прэзідэнт падкрэсліў, што прыярытэты дзяржаўнай эканамічнай палітыкі застаюцца ранейшымі. «У цэнтры ўвагі павінны быць развіццё чалавечага патэнцыялу, стымуляванне дзелавой ініцыятывы, прадпрымальніцтва, рост і збалансаванасць знешняга гандлю, устойлівае развіццё рэгіёнаў, якаснае даступнае жыллё і прадукты харчавання, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Нічога новага, усё гэта мы ўжо праходзілі».

«Моцная сацыяльная палітыка, клопат пра чалавека, увага да моладзі, стварэнне камфортных умоў для жыццядзейнасці людзей былі, ёсць і будуць найвышэйшымі мэтамі нашай дзяржавы», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што краіна перажывае складаны перыяд і цяперашняму ўраду будзе няпроста. Аднак, на думку кіраўніка дзяржавы, ёсць і станоўчыя моманты. «Тое, што нам сёння не трэба думаць пра выпрацоўку нейкіх новых напрамкаў. У нас перад урадам няма пытання: а як працаваць? Мы ўжо ўсё паспрабавалі не проста тэарэтычна, у букварах недзе, у кніжках пачыталі і думаем: падыдзе — не падыдзе. Мы гэта на практыцы праверылі», — сказаў ён.

Прэзідэнт таксама падкрэсліў, што ў рабоце ўрада не павінна быць ніякіх лішніх пасяджэнняў і нарад. «Прычым так павінна настроіцца на работу і ўся вертыкаль улады. Ад раёна, вобласці да рэспубліканскага ўзроўню. Нам трэба адысці ад бясконцых нарад, справаздач і дакладаў, сканцэнтраваўшыся на галоўным. Рашэнні прымаць аператыўна, браць на сябе ініцыятыву і адказнасць. Менавіта гэтага я чакаю ад членаў урада», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«Урад павінен быць калегіяльным органам, дзе галоўнае звяно — міністр», — адзначыў Прэзідэнт. Ён таксама падкрэсліў: «Рашэнні міністра павінны выконвацца неадкладна. Любое рашэнне, якое ён прыме, законнае. Але і адказнасць за яго нясе ў першую чаргу міністр. Калі гаварыць сцісла, то міністр не мае права, робячы справаздачу ў парламенце або дакладваючы Прэзідэнту, сказаць, што ў яго не хапала паўнамоцтваў або нейкай нарматыўна-прававой базы».

Спажывецкі рынак — на асаблівы кантроль

Прэзідэнт патрабуе асаблівага кантролю за станам спажывецкага рынку. «Шырокія паўнамоцтвы для гэтага членам урада і губернатарам прадастаўлены», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Пры гэтым ён папярэдзіў: «Мы не павінны зрабіць так, асабліва ў сферы цэнаўтварэння, каб загубіць бізнес. Ні ў якім разе!»

Прэзідэнт адзначыў, што, прымаючы рашэнне аб стрымліванні росту цэн, ён перш за ўсё меў на ўвазе наступнае: у нас непараўнальна з мінулымі крызісамі таннейшыя рэсурсы. Таму нічога страшнага няма, калі мы пратрымаемся на гэтым узроўні цэн. Мы іх не зніжаем, але, можа, недзе і ўручную давядзецца іх адрэгуляваць на асобныя групы тавараў. У гэтым няма ніякага страху».

Прэзідэнт адзначыў, што ў Еўразійскім эканамічным саюзе фарміруецца агульны спажывецкі рынак. «Гэта пераходны перыяд, і ён мае пэўныя выдаткі. Мы ўжо з імі сутыкнуліся. У сувязі з гэтым нашы людзі павінны быць абаронены. Чалавек мае законнае права прыйсці ў магазін або на рынак і купіць неабходны яму тавар — добрай якасці і па справядлівай цане», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Адстойваць нацыянальныя інтарэсы

Аляксандр Лукашэнка патрабуе ад урада рэалізацыі курсу на паслядоўнае паглыбленне еўразійскай інтэграцыі пры цвёрдым і папераджальным адстойванні нацыянальных інтарэсаў. «Трэба на ўсіх узроўнях паслядоўна праводзіць палітыку стварэння раўнапраўнага саюза, без выключэнняў і абмежаванняў свабоды руху тавараў, паслуг, капіталу і рабочай сілы», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. «Мы павінны выкарыстоўваць нашы канкурэнтныя перавагі, не ўпусціць патэнцыяльныя магчымасці, што адкрыліся, і заняць выгадныя нам нішы», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

«Мы не супраць імпарту, але абараніць уласнага таваравытворцу мы павінны. І, як я разумею, урад пачаў ужо ў гэтым напрамку дзейнічаць. Выходзіць трэба з уласных інтарэсаў, не ствараючы лішніх праблем для нашых суседзяў, партнёраў і гэтак далей. Трэба дзейнічаць, прынамсі, на ўзаемнай аснове», — адзначыў Прэзідэнт.

Гаворачы аб адносінах нашай краіны з Расійскай Федэрацыяй, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Беларусь працягне супрацоўніцтва з ёю як з вельмі блізкай, брацкай дзяржавай. Пры гэтым ён адзначыў, што нароўні з прадаўжэннем супрацоўніцтва з Расіяй Беларусь будзе імкнуцца да нармалізацыі адносін з краінамі Еўрасаюза і ЗША. Разам з тым ён выказаў разуменне наконт таго, што замежныя дзяржавы чакаюць, як пройдуць прэзідэнцкія выбары ў Беларусі. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што яны пройдуць сумленна, на аснове Канстытуцыі, якая не супярэчыць міжнародным стандартам. «Калі нам народ давярае, ён падтрымае нас у самыя цяжкія часы. Але такіх часоў у Беларусі не будзе. Я ўсіх магу запэўніць: мы зробім усё, каб мінімізаваць вынікі тых катаклізмаў, што створаны не намі і не на нашай тэрыторыі», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Скарачэнне затрат, прыцягненне інвестыцый, дыверсіфікацыя экспарту

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў: «Неабходна не толькі стабілізаваць сітуацыю ў эканоміцы, але і стварыць умовы для ўстойлівага развіцця краіны на аснове росту прадукцыйнасці працы, эфектыўнага выкарыстання дзяржаўнай уласнасці, стымулявання дзелавой актыўнасці і ініцыятывы грамадзян».

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што ў другой палове 2014 года Беларусь сутыкнулася са знешнімі выклікамі, пра ўзнікненне якіх яшчэ ў пачатку года ніхто не мог і падумаць. Адкрытая эканоміка Беларусі балюча рэагуе на гэта.

Паводле яго слоў, як з гэтым змагацца, вядома. «Рэцэпты эканамічнага росту вызначаны: скарачэнне затрат і прыцягненне інвестыцый. Іншых рэцэптаў няма. А для гэтага неабходна на ўзроўні прадпрыемстваў фінансавы стан браць за аснову», — лічыць кіраўнік дзяржавы.

«У гэты складаны час можна і трэба разлічваць толькі на сябе», — падкрэсліў Прэзідэнт. «Калі мы вырашым толькі адно пытанне — дыверсіфікацыі экспарту (у плане выпадаючых продажаў нашых тавараў у Расію) — і пераарыентуем прадукцыю на іншыя рынкі, то мы адыдзем ад абвалаў у эканоміцы, у фінансах. Таму пытанне нумар адзін — дыверсіфікацыя экспарту», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Неабходна больш актыўна працаваць на знешніх рынках, асабліва з улікам прыязных адносін з многімі замежнымі дзяржавамі.

Новыя падыходы ў дзяржпадтрымцы

З гэтага года будуць дзейнічаць новыя падыходы да аказання дзяржаўнай падтрымкі ў эканоміцы. Паводле слоў Прэзідэнта, існуючыя рэсурсы сканцэнтруюцца выключна на прыярытэтных напрамках развіцця. «Галоўныя прынцыпы — конкурсны падыход, роўны доступ, акупнасць праекта і адказнасць за рэалізацыю і дасягненне заяўленых параметраў», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

На яго думку, трэба рашуча змагацца з утрыманствам, каб усе разумелі: дабрабыт кожнага ў яго руках. «У мінулым годзе нам удалося змяніць тэндэнцыю апераджальнага росту заработнай платы над ростам вытворчасці працы, — сказаў Прэзідэнт. — І нам трэба няўхільна гэтага прытрымлівацца. Кожны рубель павінен быць рэальна зароблены. Патрабую ад урада замацаваць гэты вынік».

Патрабаванні ўлады да дзяржаўных і прыватных прадпрыемстваў павінны быць аднолькавыя.

Улада павінна быць адкрытай і празрыстай

Прэзідэнт патрабуе адкрытасці і празрыстасці ўсіх органаў улады, асабліва на мясцовым узроўні, дзе яна бліжэй за ўсё працуе з насельніцтвам. На думку Аляксандра Лукашэнкі, трэба, у тым ліку пад эгідай Савета дэпутатаў, пашыраць практыку грамадскіх абмеркаванняў найважнейшых рашэнняў, уключаючы тым самым грамадзян у кіраванне дзяржавай, ствараючы надзейны бар'ер карупцыі.

Гаворачы аб кадравай палітыцы, Прэзідэнт адзначыў, што яна павінна арыентавацца на пошук і выхаванне новых, перспектыўных людзей, здольных па-сучаснаму мысліць і генерыраваць эфектыўныя рашэнні.

«Сёння жыццё патрабуе максімальнай сабранасці, аператыўных і зладжаных дзеянняў усіх дзяржаўных органаў па ключавых напрамках унутранай і знешняй палітыкі. Калі не аб'яднаемся, не аб'яднаем нашы рэсурсы, здольнасці, магчымасці, таленты, мы не выстаім!» — лічыць кіраўнік дзяржавы.

«Агульнымі намаганнямі мы зможам пераадолець любыя перашкоды, якія б ні існавалі перад намі, — сцвярджае Аляксандр Лукашэнка. — Нічога асабліва ў гэтым выпадку і складанага для нас няма. Мы вырашалі і ведаем, як вырашаць гэтыя праблемы. І я ўпэўнены, што мы іх вырашым. Ёсць толькі адно — крыху змяніліся ўмовы. Нам гэта таксама знаёма. Таму трэба прыстасавацца да новых умоў, яны не ўсюды, не па ўсім фронце новыя, прыстасаваць нашу эканоміку, перш за ўсё фінансы, і наша сацыяльна-эканамічнае жыццё ў дзяржаве».

Паводле БЕЛТА.

АНДРЭЙ КАБЯКОЎ АДКАЗАЎ НА ПЫТАННІ ДЭПУТАТАЎ

Перад галасаваннем, падчас якога парламентарыі маглі прыняць або адхіліць кандыдатуру новага прэм'ера, дэпутаты Палаты прадстаўнікоў задалі Андрэю Кабякову шэраг пытанняў.

Арыентацыя на вынік

Віталь БУСЬКО, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах, спытаў пра стратэгію ўрада па павелічэнні экспарту і дыверсіфікацыі рынкаў.

Андрэй Кабякоў у першую чаргу адзначыў, што асноўны рынак для нашай краіны — Расійская Федэрацыя, краіны Еўрапейскага саюза.

Фота БЕЛТА.

Рашэнне аб дачы згоды на назначэнне прэм'ер-міністра было праведзена праз тайнае галасаванне, у якім прынялі ўдзел 106 дэпутатаў.

— Але вы цудоўна разумееце, што стан эканомікі нашых геаграфічна блізкіх партнёраў дастаткова складаны, — звярнуў увагу ён. — Нарасціць фізічныя аб'ёмы экспарту там будзе няпроста: трэба працаваць і над сабекоштам, і над затратамі, і над якасцю ўласнай прадукцыі.

Але асноўны рэзерв, на якім у нас ёсць магчымасць зарабіць, — гэта краіны «дальняй дугі»: азіяцкія — Кітай, В'етнам, Інданезія, Індыя, афрыканскія і лацінаамерыканскія.

— Натуральна, што ў краінах, якія развіваюцца, ёсць нішы, дзе мы можам і абавязаны заняць сваё месца. Па рэкамендацыях нашых замежных прадстаўніцтваў, у першым квартале 2015 года плануецца больш за 60 візітаў нашых кіраўнікоў міністэрстваў, ведамстваў, аблвыканкамаў амаль у 40 краін. Галоўнае — не проста паехаць адзначыцца і сустрэцца, а атрымаць вынік: кантракты, пастаўкі, грошы. Таму пастаўлена задача не проста забяспечыць адпаведны працэс, але і атрымаць пэўныя вынікі.

«Камуналка» будзе расці паралельна з даходамі

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, спорце, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Алена ШАМАЛЬ пацікавілася, ці адмовіцца краіна ад перакрыжаванага субсідзіравання, калі прадпрыемствы аплачваюць частку кошту камунальных паслуг, аказаных насельніцтву. Парламентарый нагадала, што ў сферах электра- і цеплаэнергетыкі ўрад спадзяваўся ўжо сёлета адысці ад такога метаду аплаты камунальных паслуг.

— Тэма гэта няпростая і, натуральна, ад перакрыжаванага субсідзіравання ў перспектыве неабходна адыходзіць, — упэўнены Андрэй Кабякоў. — Але ёсць патрабаванні кіраўніка дзяржавы пра тое, што гэта праблема павінна вырашацца паралельна росту даходаў насельніцтва.

Андрэй Кабякоў нагадаў, што дзейнічае Указ кіраўніка дзяржавы № 550, дзе прадастаўлена права ўраду і аблвыканкамам аднамомантава за год павялічваць тарыфы на 5 долараў у эквіваленце.

— Рухацца далей у гэтым кірунку будзем у адпаведнасці з магчымасцямі і патэнцыялам росту даходаў насельніцтва. У нас сацыяльная дзяржава, сацыяльна арыентаваная эканоміка. Ад гэтага мы адмаўляцца не збіраемся. Калі ж паглядзець больш глыбока, то не для ўсіх прадпрыемстваў перакрыжаванае субсідзіраванне — гэта адназначна дрэнна.

Мы не беражом сябе?

Дэпутат Тамара КРАСОЎСКАЯ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі, пацікавілася, якой у найбліжэйшыя гады бачыць Андрэй Кабякоў дэмаграфічную сітуацыю ў нашай краіне.

— У мінулым годзе па даручэнні кіраўніка дзяржавы мы рыхтавалі прапанову па так званым праекце «Вялікая сям'я». Быў прыняты адпаведны ўказ, — паведаміў выступоўца. — Пачынаючы з 2016 года пачнецца яго рэалізацыя.

Андрэй Кабякоў пагадзіўся з тым, што краіна мае пэўны вынік у рашэнні дэмаграфічных праблем. У мінулым годзе ўпершыню за суверэнную гісторыю назіраўся прырост насельніцтва, праўда, з улікам міграцыі.

— Але я звярнуў бы ўвагу на яшчэ адзін важны аспект, які мы ўсе лічым натуральным, але, тым не менш, ён патрабуе вельмі пільнай увагі. У мінулым годзе ў нас па прычынах, якія можна прадухіліць, памерла 10,3 тысячы чалавек. З іх 1600 — ад атручвання алкаголем, 1100 — у дарожна-транспартных здарэннях, 700 — на пажарах, 600 чалавек утапіліся… Складваецца такое ўражанне, што мы, беларусы, не беражом сябе!

Андрэй Кабякоў заўважыў, што новая дэмаграфічная праграма неабходна. Падчас падрыхтоўкі адпаведных прапаноў урад зверне ўвагу і на вышэйназваныя фактары. Па словах выступоўцы, там ёсць добрая перспектыва зменшыць колькасць ахвяр.

* * *

Таксама ўчора Палата прадстаўнікоў прыняла антынаркатычныя дакументы. Першы законапраект быў прысвечаны Дэкрэту Прэзідэнта № 6 «Аб неадкладных мерах па прадухіленні незаконнаму абароту наркотыкаў», другі — зменам у Крымінальны кодэкс, што робяць больш жорсткімі антынаркатычныя меры.

Надзея ЮШКЕВІЧ.

КАДРАВЫЯ ПЕРАСТАНОЎКІ ВА ЗБРОЕНЫХ СІЛАХ

Аляксандр Лукашэнка адпаведным указам назначыў палкоўніка Андрэя Гурцэвіча начальнікам факультэта Генеральнага штаба — намеснікам начальніка Ваеннай акадэміі, вызваліўшы яго ад пасады камандуючага войскамі Заходняга аператыўна-тактычнага камандавання Ваенна-паветраных сіл і войскаў проціпаветранай абароны Узброеных Сіл Беларусі, паведамляе БЕЛТА.

Прэзідэнт назначыў генерал-маёра Аляксандра Вальфовіча камандуючым войскамі Паўночна-заходняга аператыўнага камандавання Узброеных Сіл, вызваліўшы яго ад пасады начальніка штаба — першага намесніка камандуючага войскамі Паўночна-заходняга аператыўнага камандавання Узброеных Сіл.

Генерал-маёр Валерый Гнілазуб назначаны начальнікам штаба — першым намеснікам камандуючага войскамі Паўночна-заходняга аператыўнага камандавання Узброеных Сіл, ён вызвалены ад пасады начальніка 72-га гвардзейскага аб'яднанага вучэбнага цэнтра падрыхтоўкі прапаршчыкаў і малодшых спецыялістаў Узброеных Сіл.

Палкоўнік Ігар Кароль назначаны начальнікам 72-га гвардзейскага аб'яднанага вучэбнага цэнтра падрыхтоўкі прапаршчыкаў і малодшых спецыялістаў Узброеных Сіл Беларусі.

ЕДЗЕМ ПА-НОВАМУ!

СЁННЯ ЎСТУПАЮЦЬ У СІЛУ ЗМЯНЕННІ Ў ПРАВІЛЫ ДАРОЖНАГА РУХУ

З 16 студзеня ўступае ў сілу ўказ №483, які ўносіць змяненні і дапаўненні ва ўказ №551 «Аб мерах па павышэнні бяспекі дарожнага руху» ад 28 лістапада 2005 года, паведамляе БЕЛТА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У адпаведнасці з указам №483 вадзіцелі будуць абавязаны перавозіць дзяцей ва ўзросце да 12 гадоў у легкавым аўтамабілі **з выкарыстаннем дзіцячых утрымліваючых устройстваў** або іншых сродкаў, якія даюць магчымасць бяспечна прышпіліць дзіця з дапамогай рамянёў бяспекі. За парушэнне гэтага патрабавання вадзіцелям будзе пагражаць штраф да 4 базавых велічынь (1 базавая велічыня цяпер роўная Br180 тыс.), за паўторнае парушэнне на працягу года штраф складзе ад 2 да 8 базавых велічынь. Новаўвядзенне не распаўсюджваецца на аўтамабілі-таксі і выпадкі, калі рост дзіцяці перавышае 150 см.

З 1 снежня па 1 сакавіка становіцца абавязковым **выкарыстоўваць зімовыя шыны** на аўтамабілях з тэхнічна дапушчальнай агульнай масай да 3,5 т, легкавых і грузапасажырскіх аўтамабілях масай большай за 3,5 т, а таксама аўтобусах масай да 5 т. Вадзіцелі, якія парушаюць ПДР у гэтай частцы, атрымаюць папярэджанне або штраф да 0,5 базавай велічыні. Калі зімовая рызіна не адпавядае патрабаванням (яе пратэктар меншы за 4 мм), гэта парушэнне прадугледжвае папярэджанне або штраф да 1 базавай велічыні. За паўторнае парушэнне на працягу года штраф павысіцца да 2–5 базавых велічынь.

У адпаведнасці з дакументам, **мінімальная ступень святлопрапускання** для ветравога шкла транспартнага сродку, пры якой дапускаецца яго ўдзел у дарожным руху, змяняецца з 75 працэнтаў да 70 працэнтаў. За невыкананне норм таніравання аўташкла прадугледжана адказнасць у выглядзе папярэджання або штрафу да 1 базавай велічыні. За паўторнае парушэнне на працягу года — штраф ад 2 да 5 базавых велічынь.

Змяненні закранулі і аўташколы. Так, з 16 студзеня павялічваецца **час навучання практычнаму ваджэнню** аўтамабіля пры падрыхтоўцы вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў катэгорыі «В» з 40 да 50 гадзін. Пры гэтым аўташколам прадастаўляецца чатырохмесячны тэрмін для арганізацыі падрыхтоўкі вадзіцеляў у адпаведнасці з новымі патрабаваннямі.

Для арганізацыі руху веласіпедыстаў, а таксама для абазначэння напрамкаў руху па палосах на скрыжаваннях са складанай канфігурацыяй уводзяцца **новыя віды дарожнай разметкі.**

З 16 студзеня, згодна з указам №483, да элементаў дарогі будуць аднесены размешчаныя на праезнай частцы дарогі пасадачныя пляцоўкі і астраўкі бяспекі. Гэта дасць магчымасць распаўсюдзіць абавязак уладальнікаў дарог па **ўтрыманні элементаў дарог у бяспечным для руху стане** на названыя збудаванні.

ЗАКОННАЯ БАРАЦЬБА З НАРКАГАНДЛЕМ

Меры па супрацьдзеянні незаконнаму абароту наркотыкаў стануць больш жорсткімі. Дэкрэт №6 і адпаведны законапраект аб антынаркатычных папраўках у заканадаўства адобрылі ўчора сенатары на 7-й пазачарговай сесіі Савета Рэспублікі.

— Дэкрэт утрымлівае шэраг новых прававых норм, — адзначае міністр унутраных спраў Беларусі Ігар Шуневіч. — Частка з іх накіравана на прафілактыку злачынстваў і правапарушэнняў у сферы незаконнага абароту наркотыкаў. Частка — на ўзмацненне розных відаў адказнасці. Больш жорсткімі стануць і меры да парушэнняў дзейнасці кіраўнікоў і арганізацый, у тым ліку банкаў. Такім чынам уводзіцца новы комплекс мер, які зараз неабходны для барацьбы з наркагандлем. Акрамя гэтага, у дэкрэце прадугледжваецца больш жорсткае пакаранне за здзяйсненне асабліва цяжкіх правапарушэнняў у сферы наркатрафіку.

«Дэкрэт найбольш актуальны ў адпаведнасці з тымі выклікамі і пагрозамі, якія нясе наркасітуацыя сёння ў краіне», — дадаў Ігар Шуневіч.

Трэба адзначыць, што адна з асаблівасцяў наркагандлю — гэта здольнасць падладжвацца пад існуючыя законы. Таму Дэкрэт №6 з'яўляецца аператыўным адказам на абвостраную наркасітуацыю ў краіне.

Падчас 7-й пазачарговай сесіі сенатары павіншавалі Андрэя Шорца і Міхаіла Мясніковіча, якіх Прэзідэнт прызначыў членамі Савета Рэспублікі ў снежні мінулага года.

Вераніка ПУСТАВІТ.

ЭКЗАМЕН НА СТАЛАСЦЬ

«Абвешчаны кіраўніком нашай дзяржавы Год моладзі адкрывае для маладых людзей шырокія магчымасці для ажыццяўлення сваіх праектаў, ідэй, каштоўнасцяў і планаў, — заявіў журналістам намеснік міністра адукацыі Віктар ЯКЖЫК. — Улічваючы, што Беларусь стала на інавацыйны шлях развіцця, а моладзь з'яўляецца галоўным каталізатарам укаранення ідэй і ініцыятыў, прыцягнуць маладых людзей да актыўнага ўдзелу ў жыцці і развіцці нашай краіны надзвычай важна. Таму гэта яшчэ і год адказнасці моладзі перад дзяржавай».

Маладыя людзі ва ўзросце ад 14 да 31 года складаюць у Беларусі больш за 23% ад агульнай колькасці насельніцтва. Самая шматлікая маладзёжная група — ва ўзросце 25–30 гадоў: на пачатак 2014 года — 939,9 тысячы чалавек (43%). 83,2% маладых людзей пражываюць у гарадах і пасёлках гарадскога тыпу, і толькі 16,8% — у сельскай мясцовасці. Каля 38% ад агульнай колькасці моладзі жывуць у Мінску і Мінскай вобласці (831,2 тысячы).

Найважнейшым дакументам, які вызначае асновы маладзёжнай палітыкі, з'яўляецца Закон «Аб асновах дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі», які быў прыняты адным з першых у СНД. Цяпер у Беларусі адносіны, звязаныя з абаронай правоў і інтарэсаў моладзі, рэгулююць Канстытуцыя, 8 кодэксаў, 20 законаў, каля 40 указаў кіраўніка дзяржавы і больш за 100 пастаноў урада. Заканадаўчая база пастаянна ўдасканальваецца і абнаўляецца ў адпаведнасці з патрабаваннямі часу. «Самы свежы прыклад — указ «Аб дадатковых мерах дзяржаўнай падтрымкі сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей». Гэты дакумент уводзіць новае паняцце — сямейны капітал, што закліканы аказаць падтрымку беларускім сем'ям, у тым ліку і маладым», — адзначыў намеснік міністра.

Віктар Якжык паведаміў, што Рэспубліканскі план па рэалізацыі Года моладзі ўключае больш за 70 пунктаў: мерапрыемствы, прысвечаныя патрыятычнаму выхаванню моладзі, прапагандзе здаровага ладу жыцця, развіццю масавага спорту, падтрымцы маладых людзей, якія трапілі ў складаную жыццёвую сітуацыю і г.д.

19–20 студзеня ў Мінску пройдзе 42 з'езд БРСМ. Яны адбываюцца раз на тры гады. Чарговы з'езд пройдзе ў фармаце адкрытага дыялогу. Як паведаміў **другі сакратар Цэнтральнага камітэта БРСМ Андрэй БЕЛЯКОЎ,** у маштабным форуме возьмуць удзел каля 3 тысяч чалавек.

20 студзеня ў Палацы Рэспублікі разгорнецца выстава патрыятычнай фатаграфіі «Разам дом пабудуем», на якой будуць прадстаўлены найбольш яркія моманты з жыцця арганізацыі. Падчас цэнтральнага мерапрыемства з'езда — адкрытага дыялогу «Моладзь Беларусі: традыцыі і будучыня» — будуць падведзены вынікі працы арганізацыі за тры гады, а таксама вызначана стратэгія развіцця на найбліжэйшыя некалькі гадоў. «2015 год для нас асаблівы: гэта Год моладзі, год святкавання 70-годдзя Перамогі, год выбараў кіраўніка дзяржавы. Мы ініцыюем разгляд пытанняў па развіцці маладзёжнага руху з канкрэтнымі прапановамі для ўнясення ў адпаведныя праграмы і нарматыўна-прававыя акты», — падкрэсліў Андрэй Белякоў.

Па яго словах, у рамках «Адкрытага дыялогу» на працягу некалькіх месяцаў у розных гарадах і населеных пунктах краіны адбылося каля 5 тысяч сустрэч, падчас якіх маладымі людзьмі было выказана шмат слушных прапаноў. Ёсць ідэі, што патрабуюць падтрымкі на ўзроўні мясцовых уладаў, але ёсць і больш глабальныя прапановы. Адна з апошніх — абвясціць будаўніцтва маладзёжнага патрыятычнага цэнтра на тэрыторыі Брэсцкай крэпасці. Стварэнне цэнтра на базе Брэсцкай крэпасці як нельга лепш адпавядае трэнду бягучага года. Ініцыятыва пераклікаецца і з 70-годдзем Вялікай Перамогі, і з Годам моладзі.

Гаворачы пра планы на 2015 год, Андрэй Белякоў падкрэсліў, што адным з ключавых кірункаў працы арганізацыі застанецца грамадзянска-патрыятычная тэматыка. «Наша задача — дайсці да кожнага ветэрана, дапамагчы, падтрымаць, выслухаць гісторыі гэтых людзей. Таму рэалізуецца шэраг праектаў: «70 гадоў міру», «Героі Перамогі». Будзе развівацца далей валанцёрскі рух. Яшчэ адна тэма — маладзёжныя ініцыятывы. Працягнецца і праект «100 ідэй для Беларусі». Дарэчы, у 2016 годзе пад куратарствам беларускага боку адбудзецца фінал конкурса «100 ідэй для СНД».

Надзея НІКАЛАЕВА.

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Продавец: ОАО «Барановичиметаллопторг» (ликвидационная комиссия). Тел.: (017) 398-24-86; 398-64-33. Организатор аукциона: ЗАО «Центр промышленной оценки» (г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703, тел.: (017) 280-36-37).

ЛОТ № 1: имущество, расположенное на земельном участке пл. 0,4034 га, по адресу: Брестская область, г. Барановичи, ул. Слонимское Шоссе, 18Г, в составе:
Цех услуг (в т.ч. забор, покрытие), общ. пл. 649,6 кв.м, инвентарный номер: 110/С-86090; **Туалет, пл.** 1,5 кв.м, инвентарный номер: 110/С-99715; **Кран подвесной в цехе услуг**, инв. № по бух. учету 4170.
Начальная цена с НДС 20% – 1 936 053 600 бел. руб.
ЛОТ № 2: имущество, расположенное на земельных участках пл. 2,5253 га; пл. 0,0137 га; по адресу: Брестская область, г. Барановичи, ул. Слонимское Шоссе, 18 В, 18В/2, в составе:
Пост охраны, общ. пл. 7,7 кв.м, инвентарный номер: 110/С-99750. **Открытый склад № 1,** общ. пл. 8916,3 кв.м, инвентарный номер: 110/С-62149. Составные части и принадлежности: бетонное покрытие пл. 7730 кв.м; плиточное покрытие пл. 1155 кв.м; забор ж/б, h-2.00., пл. 640 кв.м; подъездной ж/д путь, протяженность 384 м.п.; двое металлических ворот. **Торговые павильоны,** общ. пл. 345,8 кв.м, инвентарный номер: 110/С-100114. **Магазин автозапчастей**, общ. пл. 98,8 кв.м, инвентарный номер: 110/С-86092. **Туалет,** общ. пл. 28,6 кв.м, инвентарный номер: 110/С-99800.
Передвижные киоски (3 шт.), инв. № по бух. учету 1000020; 1000021; 1000022. **Ворота въездные**, инв. № по бух. учету 10000135. **Заезд на эстакаду**, инв. № по бух. учету 10000146. **Эстакада**, инв. № по бух. учету 10000119. **Шлагбаум** электромеханический X-BAR 01079, инв. № по бух. учету 9169; **Шлагбаум** DITEC, инв. № по бух. учету 9059; **Рекламный щит № 4**, инв. № по бух. учету 10000116; **Рекламный щит № 4**, инв. № по бух. учету 10000114.
Начальная цена с НДС 20% – 14 783 313 600 бел. руб.
ЛОТ № 3: Аппарат правильно-отрезной мод. ПРА-498А, инв. № 9203. Начальная цена с НДС 20% – 265 965 360 бел. руб.
ЛОТ № 4: Аппарат сварочный, инв. № 4800. Начальная цена с НДС 20% – 250 920 бел. руб.
ЛОТ № 5: Аппарат сварочный, инв. № 9062. Начальная цена с НДС 20% – 4 472 280 бел. руб.
ЛОТ № 6: Аппарат сварочный, инв. № 9063. Начальная цена с НДС 20% – 4 472 280 бел. руб.
ЛОТ № 7: Блок подачи проволоки «ФЕБ-02», инв. № 9069. Начальная цена с НДС 20% – 1 345 680 бел. руб.
ЛОТ № 8: Вальцы электромеханические полноприводные ВЭПЛ-25/30, инв. № 10000143. Начальная цена с НДС 20% – 136 496 520 бел. руб.
ЛОТ № 9: Вентилятор, инв. № 4792. Начальная цена с НДС 20% – 105 720 бел. руб.
ЛОТ № 10: Источник питания для дуговой сварки «МАГМА», инв. № 9068. Начальная цена с НДС 20% – 8 143 440 бел. руб.
ЛОТ № 11: Листогиб, инв. № 4342. Начальная цена с НДС 20% – 1 491 960 бел. руб.
ЛОТ № 12: Листогиб ручной, ZGR-2000/2, инв. № 9189. Начальная цена с НДС 20% – 20 526 600 бел. руб.
ЛОТ № 13: Листогибочная машина ЛГМ 4х2,5, инв. № 10000141. Начальная цена с НДС 20% – 352 472 040 бел. руб.
ЛОТ № 14: Молот пневматический, инв. № 9055. Начальная цена с НДС 20% – 42 083 880 бел. руб.
ЛОТ № 15: Полуавтомат ПДГ-351У3.1, инв. № 9064. Начальная цена с НДС 20% – 7 032 840 бел. руб.
ЛОТ № 16: Полуавтомат ПДГ-351У3.1, инв. № 9065. Начальная цена с НДС 20% – 7 032 840 бел. руб.
ЛОТ № 17: Полуавтомат сварочный ПДГ-350 СЭУ, инв. № 9067. Начальная цена с НДС 20% – 5 193 600 бел. руб.
ЛОТ № 18: Пресс-ножницы комбинированные мод. НГ 5222, инв. № 10000140. Начальная цена с НДС 20% – 124 176 000 бел. руб.
ЛОТ № 19: Станок прессовочный КД, инв. № 4341 (требуется ремонт). Начальная цена с НДС 20% – 14 204 280 бел. руб.
ЛОТ № 20: Станок ВМЗ-2А, инв. № 4340. Начальная цена с НДС 20% – 650 520 бел. руб.
ЛОТ № 21: Станок настольно-сверлильный, инв. № 4020. Начальная цена с НДС 20%– 247 080 бел. руб.
ЛОТ № 22: Станок сверлильный, инв. № 4347. Начальная цена с НДС 20% – 1 806 960 бел. руб.
ЛОТ № 23: Станок СТД-9А, инв. № 4339 (требуется ремонт). Начальная цена с НДС 20% – 16 873 680 бел. руб.
ЛОТ № 24: Станок токарно-винторезный, инв. № 4216 (требуется ремонт). Начальная цена с НДС 20% – 9 252 960 бел. руб.
ЛОТ № 25: Станок точильный, инв. № 4019. Начальная цена с НДС 20% – 552 360 бел. руб.
ЛОТ № 26: Станок универсально - вертикальный, фрезерный, инв. № 4021 (требуется ремонт). Начальная цена с НДС 20% – 10 017 600 бел. руб.
ЛОТ № 27: Станок шлифовальный, инв. № 9110. Начальная цена с НДС 20% – 877 560 бел. руб.
ЛОТ № 28: Стеллаж для ЦМИ, инв. № 10000180. Начальная цена с НДС 20% – 5 869 920 бел. руб.
ЛОТ № 29: Универсальный гибочный станок УГС-6/1, инв. № 10000142. Начальная цена с НДС 20% – 83 265 840 бел. руб.

Шаг аукциона	5 (пять процентов) от начальной цены Лота.
Затраты на организацию и проведение аукциона возмещаются организатору аукциона победителем аукциона, либо единственным участником аукциона, согласившимся приобрести предмет аукциона (Лот) по начальной цене, увеличенной на 5%, в течение 5 дней со дня проведения торгов. Покупатель возмещает затраты в размере 0,129% от начальной цены продажи предмета аукциона с НДС. Общая сумма затрат по всем лотам не превышает **23 000 000** белорусских рублей	
Срок подписания договора к/продажи	В течение 15 (пятнадцати) рабочих дней с даты проведения аукциона
Срок оплаты предмета аукциона	Не более 30 (тридцати) дней со дня заключения договора купли-продажи

Задаток 10% от начальной цены Лота перечисляется: резидентами РБ на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в ЦБУ № 507 г. Минска ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки».

Требования к участникам торгов: лицо, желающее участвовать в торгах, обязано подать организатору торгов в указанный в извещении срок заявление на участие в торгах, документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка. Кроме того, представляются следующие документы: юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь – копии устава (учредительного договора – для коммерческой организации, действующей только на основании учредительного договора), имеющего штамп, свидетельствующий о проведении государственной регистрации, и свидетельства о государственной регистрации и их подлинники для заверения копий организатором аукциона, доверенность представителю юридического лица (если юридическое лицо представляет не руководитель) или документ, подтверждающий полномочия руководителя юридического лица (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор либо иные документы в соответствии с законодательством); юридическим лицом, иной организацией – нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до даты подачи заявления) или иное равнозначное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык, легализованная в установленном порядке доверенность представителю юридического лица, иной организации или другие легализованные в установленном порядке документы с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык; индивидуальным предпринимателем – резидентом Республики Беларусь – копия свидетельства о государственной регистрации и подлинник для заверения копии организатором аукциона; индивидуальным предпринимателем – нерезидентом Республики Беларусь – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык; представителем гражданина Республики Беларусь, индивидуального предпринимателя – резидента Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного физического лица, индивидуального предпринимателя – нерезидента Республики Беларусь – легализованная в установленном порядке доверенность с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов на участие в торгах физическое лицо, индивидуальный предприниматель, представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица, иной организации предъявляют оригинал документа, удостоверяющего личность, и представляют его копию, которая заверяется организатором торгов. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке.

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5%.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 17.02.2015 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703.
Тел.: +375 17 280 36 37; 8029-183-69-71.
www.cpo.by. E-mail: auction@cpo.by

Дата и место проведения аукциона	**19.02.2015 в 14.00** по адресу: г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 1-й км, актовый зал

Иные сведения: Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица».

■ Гандаль

САПСАВАНЫ ПРАДУКТ ДА СПАЖЫЎЦА НЕ ДОЙДЗЕ

Спецыялісты абмеркавалі сітуацыю з захаваннем санітарных нормаў і правілаў у сферы рознічнага гандлю і грамадскага харчавання

Цяпер, згодна з Указам №567 «Аб дадатковых мерах па абароне правоў спажыўцоў», намеснік міністра аховы здароўя — галоўны дзяржаўны санітарны ўрач краіны — атрымаў дадатковыя паўнамоцтвы па кантролі за выкананнем санітарных нормаў і правілаў у сферы рознічнага гандлю і грамадскага харчавання. Сёння санітарныя службы надзелены правам прымаць рашэнні аб прыпыненні працы аб'ектаў гандлю і грамадскага харчавання ў выпадку выяўлення парушэнняў правілаў утрымання вытворчых і гандлёвых памяшканняў, рэалізацыі тавараў са скончаным тэрмінам прыдатнасці, без маркіроўкі і суправаджальных дакументаў, якія паказваюць паходжанне і тэрміны рэалізацыі. Згодна з дакументам галоўны санітарны ўрач таксама мае права прымаць рашэнні аб забароне ўвозу на тэрыторыю Беларусі ці абарачэння на яе тэрыторыі прадукцыі, якая не адпавядае патрабаванням заканадаўства ў галіне санітарна-эпідэміялагічнага дабрабыту насельніцтва. Падчас анлайн-канферэнцыі на сайце БЕЛТА галоўны дзяржаўны санітарны ўрач краіны Ігар ГАЕЎСКІ расказаў пра першыя вынікі працы ў адпаведнасці з новымі паўнамоцтвамі.

ЗАКРЫЦЦЁ АБ'ЕКТАЎ ГАНДЛЮ — КРАЙНЯЯ МЕРА

Намеснік міністра паведаміў, што за месяц дзейнасці Указа №567, якім былі нададзеныя дадатковыя паўнамоцтвы, санітарныя службы вынеслі 240 рашэнняў аб прыпыненні працы аб'ектаў гандлю і грамадскага харчавання. Дынаміка такая: адбываецца па-рознаму, але ў цэлым назіраецца тэндэнцыя да змяншэння закрыццяў.

Ігар Гаеўскі лічыць, што ў гандлі сёння даволі няпросты перыяд, бо завяршыліся навагоднія святы. Людзі ўжо купілі тое, што хацелі, таму актыўнасць спажыўцоў зніжаецца. Гандлёвыя прадпрыемствы да святаў маглі функцыянаваць з пэўным запасам, а ў выніку нейкія прадукты засталіся некупленымі. Таму ў нас гэты перыяд лічыцца адказным. Трэба не дапусціць, каб сапсаваны тавар трапіў да пакупнікоў. Сёння адпаведныя службы пільна сочаць за дзейнасцю прадпрыемстваў гандлю і кантралююць, каб такіх тавараў у рэалізацыі не было.

Спецыяліст упэўнены, што названы перыяд не будзе доўгім. Санітарныя службы адзначаюць, што суб'екты гаспадарання вельмі сур'ёзна заклапочаны і сталі рабіць правільныя высновы, прымаць правільныя кіраўнічыя рашэнні. Рызыка быць зачыненым нікому не падабаецца. Больш за тое, некаторыя юрасобы ўпэўнены, што іх пакрыўдзілі неабгрунтавана. На імя намесніка міністра накіроўваюцца звароты з боку гандлёвых сетак, якія лічаць: санітарныя службы часам недзе празмерна жорстка падыходзяць да тых ці іншых сітуацый і прыпыняюць працу аб'екта там, дзе можна было б гэтага не рабіць. Ігар Гаеўскі запэўніў, што з падобнымі выпадкамі надалей спецыялісты будуць разбірацца больш уважліва. Закрыццё, па сутнасці, нікому не трэба. Гэта прыводзіць да таго, што людзі не атрымліваюць зарплату, не выплачваюцца падаткі, пакутуюць спажыўцы, якія прывыклі да гэтага аб'екта. «Негатыўных момантаў шмат, таму мы да закрыцця ставімся як да крайняй меры, што вымушаны ўжываць, калі астатнія не прыносяць жаданага выніку», — адзначае Ігар Гаеўскі.

Усім будзе прыемна, напэўна, наведваць тую ўстанову, дзе перад вачыма праходзіць увесь працэс падрыхтоўкі страў.

Дадатковых паўнамоцтваў, звыш таго, што нададзены ўказам, санслужбам не трэба. Але раней гэтага дакумента ім у сваёй дзейнасці не хапала. Пакуль існуе пэўная колькасць нядобрасумленных юрыдычных і службовых асоб, што спачатку плацяць штрафы, а толькі потым глядзяць, якая выгада ад таго, што ў іх няма дадатковага штату, які сочыць за тэрмінамі рэалізацыі тавару. Яны бачылі, што выплата штрафаў больш выгадная, чым выкананне заканадаўства ад А да Я. Цяпер сітуацыя змянілася, бо калі пагражае закрыццё, пра якую выгаду можа ісці гаворка. Пры закрыцці аб'екта ніякай выгады няма ў прынцыпе. Гэта выдатна дапамагае кіраваць сітуацыяй на спажывецкім рынку ў плане выканання заканадаўства.

МЕЦЬ ІДЭАЛЬНУЮ КУХНЮ

На анлайн-канферэнцыі ўздымалася пытанне аб якасці айчынных рэстаранаў і кафэ. На гэты конт **галоўны дзяржаўны санітарны ўрач Мінска Наталля ЖУКАВА** адзначыла, што летась было вынесена 224 пастановы аб прыпыненні дзейнасці мінскіх аб'ектаў грамадскага харчавання. Штрафаў было значна больш. Дарэчы, у сталічных аб'ектах было забракавана каля 2,6 тоны прадукцыі негарантаванай якасці: альбо са скончаным тэрмінам прыдатнасці, альбо без дакументаў, якія сведчылі б, адкуль атрыманы тавар.

Многія ўладальнікі рэстаранаў і кавярняў скардзяцца на жорсткія санітарныя нормы, што існуюць у нас. «Напрыклад, навошта два халадзільнікі на гатовую і сырую прадукцыю? Мы ж дома так не робім і не атручваемся», — абураюцца часта яны. І такіх скаргаў вельмі шмат. Пры гэтым многія сцвярджаюць, што ў той жа Польшчы такіх жорсткіх патрабаванняў няма. І гэта адна з прычын, па якіх там бюджэтных кавярняў і невялікіх закусачных значна больш, чым у нас.

А вось Ігар Гаеўскі не згодны з тым, што патрабаванні да аб'ектаў грамадскага харчавання ў Беларусі празмерныя. Калі б гэта было так, то не адкрываліся б яны на сціплых плошчах. А магчымасць адкрыць невялікую кавярню ёсць заўсёды.

Існуючыя патрабаванні неабходна ўспрымаць як культуру прыгатавання ежы, культуру знаходжання на працоўным месцы персаналу і кожнага ўдзельніка грамадскага харчавання асабіста. У кухараў рэстаранаў павінен быць высокі ўзровень свядомасці. Прыгатаваць якасную, эстэтычную і бяспечную для кліента страву па-іншаму немагчыма. Разважаць пра тое, што прапісаныя патрабаванні занадта жорсткія, могуць толькі тыя, хто гэта не да канца разумее, ці тыя, хто не збіраецца сачыць за парадкам на кухні, упэўнены галоўны дзяржаўны санітарны ўрач краіны.

Беларускія работнікі сферы грамадскага харчавання часам выязджаюць у Польшчу, Францыю, Бельгію і іншыя краіны. Вяртаюцца і дзеляцца сваімі ўражаннямі. Быў, напрыклад, выпадак, калі ў адным з чэшскіх прыдарожных рэстаранаў наведвальніка накармілі шклом. Ігар Гаеўскі лічыць, што, калі чалавек корміць іншых, ён адказвае за іх здароўе. І павінен разумець, якая ступень адказнасці ляжыць на ім. Усім будзе прыемна, напэўна, наведваць тую ўстанову, дзе перад вачыма праходзіць увесь працэс падрыхтоўкі страў: калі можна назіраць, як працуюць шэф-кухары і яго памочнікі, як мыецца посуд, у якой вопратцы працуе персанал і якая тэхналогія падрыхтоўкі выкарыстоўваецца. Такія рэстараны ёсць, і да іх не ўзнікае ніводнага пытання. «Але часам, калі я заходжу на кухню, я назіраю непрыемную карціну: там брудна, адсутнічае тэхналогія прыгатавання. Мы змагаліся і працягнем змагацца з такімі ўстановамі. Я хацеў бы, каб нам не было сорамна за беларускія кавярні», — удакладніў сваю пазіцыю спецыяліст.

ЗАКРЫЦЬ МОГУЦЬ І НА СУТКІ

Калі магазін закрываюць, то яго кіраўніцтва пачынае даволі актыўна варушыцца, каб у мінімальны тэрмін выправіць усе недахопы. Калі за месяц было вынесена 240 рашэнняў аб прыпыненні дзейнасці аб'ектаў гандлю і грамадскага харчавання, то сёння ўжо 173 аб'екты аднавілі працу. Тэрміны прыпынення вагаліся ад сутак да 90 дзён. Калі казаць пра сталіцу, то за месяц з лішкам да адміністрацыйнай адказнасці тут прыцягнуты 223 службовыя асобы, прыпынялася эксплуатацыя 110 прадпрыемстваў. Цяпер на 15 з іх назіраецца актыўная стадыя па ліквідацыі парушэнняў.

Сяргей КУРКАЧ

НАРКАДЫЛЕРАМ ДАДУЦЬ БОЙ

У краіне створана адмысловая крымінальная выведка ў інтэрнэце, распаўсюднікам дурману не хапае кур'еraў, а ў Міністэрства сувязі і інфарматызацыі ўжо адправілі прашэнне аб закрыцці шасці сайтаў, праз якія распаўсюджваюць наркотыкі.

Пра гэта і іншае на прэс-канферэнцыі, прысвечанай рэалізацыі антынаркатычнага дэкрэта, паведаміў Васіль ЛОСІЧ, начальнік галоўнага ўпраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі МУС Беларусі.



ПАТЭНЦЫЙНЫХ «ЗАКЛАДЧЫКАЎ» СПАКУШАЮЦЬ БОНУСАМІ

Не сакрэт, што мінулы год вызначыўся вялікай колькасцю нарказлачынстваў. Ад праваахоўнікаў даволі часта паступалі звесткі аб затрыманні, а ад медыкаў, на жаль, інфармацыя пра атручанні і смерці...

— Летась выяўлена 7319 злачынстваў, звязаных з незаконным абаротам наркотыкаў. Гэта значны прырост у параўнанні з 2013 годам, — заўважае Васіль Лосіч. — Што выклікае непакой? У 4 разы павялічылася колькасць крымінальных спраў, якія завялі за нарказлачынствы з удзелам непаўналетніх.

Але паводле слоў Васіля Лосіча, пасля падпісання Дэкрэта №6 «Аб неадкладных мерах па супрацьдзеянні незаконнаму абароту наркотыкаў» сітуацыя пачала мяняцца.

— Дэкрэт запрацаваў. Мы пачалі адсочваць інтэрнэт, і ў частцы прафілактыкі гэты дакумент ужо нам дапамагае. Нават такія з'явы, як павышэнне цэнаў на наркотыкі, больш асцярожныя дзеянні наркадылераў, сведчаць пра тое, што адчуваецца ўплыў нарматыўнага акта. Безумоўна, меркаваць пра працу цяжка, бо прайшло толькі некалькі тыдняў са дня падпісання дэкрэта. Аднак гэта той інструмент, які дазволіць больш эфектыўна супрацьстаяць наркаагрэсіі.

— Але чаму не закрываюць сайты, на якіх размяшчаюць аб'явы аб продажы наркотыкаў? — звярнуліся да кіраўніка галоўнага ўпраўлення па наркакантролі.

— Я прадбачыў падобнае пытанне, — кажа Васіль Лосіч і дэманструе прысутным стос лістоў. — Мне раздрукавалі спіс гэтых сайтаў. Сярод іх не толькі беларускія, расійскія, але і казахскія. Мы насамрэч усе іх ведаем і ў адносінах да ўсіх працуем. Аднак ёсць свая спецыфіка. Мы вядзём сваю гульню. Важна дайсці да пастаўшчыка, канкрэтнага збытчыка, вызначыць канал пастаўкі і затрымаць усіх удзельнікаў працэсу. Але такія аб'явы ў інтэрнэце, як «патрабуюцца закладчыкі», паказваюць, што адчуваецца дэфіцыт у той «пяхоце», што выкарыстоўвалася для закладак. Моладзь ужо спрабуюць спакусіць бонусамі, заахвочваннямі. Што тычыцца ліквідацыі сайтаў, у Міністэрства сувязі і інфарматызацыі адпраўлены ліст аб закрыцці шасці падобных парталаў.

АД АФГАНІСТАНА ДА МАРОКА

Летась у Беларусі перакрылі 40 каналаў паступлення і транзіту наркотыкаў. Частка з іх не прызначалася для нашай краіны.

— Восенню затрымалі буйную партыю гераіну, якая часткова прызначалася для Украіны, часткова для Літвы, — працягвае Васіль Лосіч. — Але наркотыкі да нас пераважна паступаюць з тэрыторыі Расіі. Мытны саюз не прадугледжвае кантролю на мяжы, а таму многія лічаць гэты маршрут самым бяспечным. Пры гэтым мы ўзмацнілі кантроль за паштовымі адпраўленнямі, бандэролямі, пасылкамі. Справа ў тым, што 1 дозу курыцельнай сумесі можна зрабіць з дзвюх тысячных грама рэагенту. Яе можна атрымаць па пошце, развесці саматужным метадам — і вось патрэбная колькасць рэчыва для спажывання.

Сінтэтычныя наркотыкі ў Беларусь традыцыйна пастаўляюць з Літвы і Польшчы, макавую саломку — з Украіны, марыхуану — з Галандыі. А вось гашыш праз транзітныя каналы трапляе ў Беларусь з Іспаніі і Марока.

ШКОЛЬНІКІ ПРОЙДУЦЬ ТЭСЦІРАВАННЕ

Іван КАНАРАЗАЎ, галоўны нарколаг Міністэрства аховы здароўя, лічыць антынаркатычны дэкрэт даволі своечасовым, прыводзіць некалькі цікавых фактаў:

— У 2014 годзе ў медыцынскія ўстановы з перадазіроўкай псіхаактыўнымі рэчывамі даставілі 1351 чалавека (у 2013 годзе — 759 пацыентаў). Усе гэтыя асобы знаходзяцца ў аддзяленнях рэанімацыі, інтэнсіўнай тэрапіі. Адзін дзень утрымання ў іх каштуе прыкладна 2 мільёны рублёў. Можна толькі падлічыць, колькі сродкаў было затрачана дзяржавай на аказанне ім медыцынскай дапамогі. У нармальных умовах грошы маглі б пераарыентавацца на тых, хто пакутуе на сардэчна-сасудзістыя і іншыя захворванні. Летась таксама зафіксавалі 32 выпадкі атручання са смяротным зыходам. У 2013 годзе такіх было 83. З чым звязана падобнае зніжэнне? З агрэсіўнай прафілактычнай палітыкай і інфармаваннем насельніцтва.

Іван Канаразаў таксама дадаў, што міністэрствы аховы здароўя і адукацыі распрацавалі алгарытм тэсціравання школьнікаў на ўжыванне псіхатропных рэчываў. Анкетаванне будуць праводзіць не менш за адзін раз на год сярод школьнікаў, якія дасягнулі 11-гадовага ўзросту, а таксама сярод студэнтаў. Пры выяўленні схільнасці да спажывання наркотыкаў навучэнца накіруюць на медагляд. Пры гэтым усё павінна праходзіць з дазволу бацькоў (законных прадстаўнікоў) дзіцяці.

Тарас ШЧЫРЫ.
Фота Надзеі БУЖАН.

ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Андрэй БАНДАРЭНКА:

«ДЗЕЛЯ МАРЫ ВАРТА РЫЗЫКАВАЦЬ»

Вядучы АНТ лічыць, што мэты яшчэ не дасягнуў, але ўпэўнены: яна блізка

Спортам, у прыватнасці футболам, ён захапляўся з дзяцінства. І змог не толькі захаваць гэта захапленне па жыцці, але і зрабіць прафесіяй. Яго прыход у журналістыку адбыўся на Гомельскім тэлебачанні, а потым выпаў шанц выбіраць: размеранае жыццё альбо шлях, які наблізіць да мары... Хоць у поўнай меры жаданае яшчэ не спраўдзілася, аднак сёння Андрэй Бандарэнка працуе вядучым і карэспандэнтам праграмы «Навіны спорту» на Агульнанацыянальным тэлебачанні. Мы сустрэліся напярэдадні яго адлёту ў Катар на чэмпіянат свету па гандболе, каб пагаварыць пра рызыку ў прафесіі, любоў да футбола і фаварытаў у ім.

— Андрэй, як захапленне спортам перарасло ў прафесію?

— Мабыць, самае галоўнае, што гэта была дзіцячая мара, але не так ярка выражаная, як «хачу трапіць на экран»! Усё прыйшло з часам і даволі нечакана. Пачалося з захаплення футболам, як тое бывае ў мільёнаў хлапчукоў, асабліва ў глыбінцы, дзе я рос і дзе іншых, больш прывабных, заняткаў не было. Вучыцца на «выдатна» да пэўнага часу мне не хацелася, а вось збіраць людзей і гуляць у двары падабалася. Пазней інтарэс да гэтага віду спорту перарос у жаданне быць на роўных са старэйшымі хлопцамі, калі тыя абмяркоўвалі футбол. Пачаў купляць розныя тэматычныя часопісы, некаторыя нават прасіў знаёмых прывозіць мне з-за мяжы. У прыватнасці, вельмі цікавіўся нямецкім футболам (зрэшты, раблю гэта і сёння). Хоць паступіў ва ўніверсітэт на гістарычны факультэт, але, прыйшоўшы на першую практыку ў школу, зразумеў: не маё гэта. І дзеці мяне сур'ёзна не ўспрымалі. А тады на Гомельскім тэлебачанні быў аб'яўлены кастынг, куды я і падаўся, не да канца ўсведамляючы, навошта. Размовы аб працы ў кадры не было, але ж я песціў мару стаць спартыўным каментатарам і распавядаць пра тое, што адбываецца на полі... Пачаў рабіць нейкія сюжэты, у тым ліку і спартыўныя. А ў 2012 годзе з'явілася спартыўная праграма, і я стаў у кадр — зусім яшчэ зялёны хлопчык, якому тады быў 21 год.

— А як трапілі на тэлеканал АНТ?

— Усё ішло сваім ходам, пакуль у Гомелі не аказалася дырэктар карэспандэнцкай сеткі АНТ, якая мяне выпадкова ўбачыла і запрасіла на сустрэчу. Прапанавала папрацаваць карэспандэнтам па Гомельскай вобласці. Я прыехаў у Мінск, пабыў тут некалькі дзён і вярнуўся назад. А праз пару тыдняў патэлефанаваў мне дырэктар інфармацыйнага вяшчання і сказаў, што мяне чакаюць тут. Я пакінуў усё і паехаў у сталіцу па тое, да чаго так доўга імкнуўся. Да апагею сваёй мары я яшчэ не дабраўся, але, думаю, у хуткім часе буду блізка...

— У Гомелі ў вас была праца, сваё жыллё, а тут такія крутыя перамены. Рызыка аказалася апраўданай?

— Першыя месяцы ў Мінску мне здавалася, што я зрабіў памылку: я аддаваў пяцьсот долараў за кватэру, а потым заставаўся амаль з такімі ж грашыма, як і ў Гомелі. Пазней зразумеў: хоць фінансавы бок і вельмі важны, але магчымасць знаёміцца і кантактаваць з тымі людзьмі, якія раней былі для мяне недасяжнымі, яшчэ важнейшая. Глядзеў па тэлевізары на таго ж Лёшу Багдановіча, і хацелася на такога чалавека раўняцца, бо ён аб'ездзіў свет, пабываў на многіх знакавых спартыўных турнірах... І Каця Валовік, і Марыя Лемешава — тыя, хто здаваліся незямнымі людзьмі, сёння мае калегі. Паступова жыццё нармалізавалася. Удалося і жыллё знайсці таннейшае, і навучыцца эканоміць. А галоўнае — я ўбачыў зусім іншы ўзровень працы.

— Вам даводзілася працаваць у экстрэмальных умовах?

— Так, падчас чэмпіянату свету па хакеі было шмат эфіраў і здымак, а 25 мая, калі сыгралі фінал, у мяне паднялася тэмпература, якую не мог нічым збіць дні тры. Экстрэмальнай была і мая першая паездка ў Катар (гэта краіна з жорсткімі мусульманскімі законамі). У мінулы раз мы прыляцелі ў Доху ў маі, трапіўшы на свяшчэнны Рамадан. На мытні ў нас адабралі камеру, і цэлыя суткі я страціў, каб праз пасольства вярнуць яе назад, да таго ж згубіўся наш багаж... Было страшна, бо ты за некалькі тысяч кіламетраў ад дома і можаш вярнуцца без матэрыялу проста з-за збегу абставін. Цяпер вось зноў ляцім туды на дваццаць дзён. Спадзяюся, што мінулы вопыт мне дапаможа, калі раптам нешта здарыцца.

— Вы прызнаваліся, што падчас першага прамога эфіру на АНТ страшна перажывалі...

— Першы мой прамы эфір быў 1 ліпеня 2013 года. У той дзень Ігар Старавойтаў адсутнічаў, Каця Валовік, якая вяла «Навіны спорту» да мяне, сышла ў дэкрэт, а Марыі Лемешавай трэба было прадстаўляць наш тэлеканал на нейкім важным мерапрыемстве. Паколькі не было каго «пасадзіць» у кадр, то ўзгадалі, што ёсць я, які ўжо не першы тыдзень рыхтуецца да гэтага кроку... Было страшна, здавалася, што зараз страчу прытомнасць. Выйшаў мокры, але мне сказалі: усё прайшло добра. І, каб гледачы прывыклі да новага твару, паставілі мяне працаваць у прамым эфіры некалькі дзён запар... Тыя адчуванні я магу параўнаць хіба што з эмоцыямі, калі зборная Германіі выйграла чэмпіянат свету ў 2014 годзе. За гэтую каманду я хварэю з шасці гадоў (калі ўпершыню ўбачыў футбол і пазнаёміўся з Марыа Баслерам). Я спяваў з немцамі гімн, весяліўся да раніцы. Такія ж прыкладна эмоцыі мяне перапаўнялі і пасля першага прамога эфіру на АНТ.

— Дарэчы, а як пазнаёміліся з Марыа Баслерам?

— Я нарадзіўся ў Хойніках — не сакрэт, што цяпер гэта чарнобыльская зона. У 1996 годзе была практыка, што беларускіх дзяцей вазілі ў Германію на аздараўленне. І мы з мамай у складзе вялікай дэлегацыі таксама паехалі туды. У рамках экскурсіі нас павялі на футбольны матч, гулялі каманды «Кайзэрслаўтэрн» і «Баварыя Мюнхен». Гэта была запамінальная падзея ў маім жыцці, бо ўпершыню я пабачыў стадыён на 45 тысяч чалавек, дзе адбывалася нешта неверагоднае. Пасля матча нас павялі на абед, потым давалі падарункі. І калі я ўбачыў шмат мячоў, то захацеў адзін узяць сабе. Мой намер, як аказалася, заўважыў адзін мужчына. Ён падышоў да мяне і запытаў, ці хачу я сабе мяч? Пасля майго ківання галавой сышоў, а вярнуўшыся, уручыў мне свой імянны мяч і футболку. Гэта і быў Марыа Баслер — адзін з самых крутых футбалістаў «Мюнхенскай Баварыі». І з той пары гэтая каманда ў маім сэрцы адзіная. Нашу гадзіннік гэтай каманды і сплю пад яе пледам.

— Сярод беларускіх камандаў у вас ёсць фаварыты?

— Пра беларускі футбол не бяруся разважаць з пазіцыі эксперта, але найбольш эмацыянальна рэагую на падзеі з удзелам футбольнага клуба «Гомель». Іншых камандаў у нашым футболе не прызнаю і да іх поспеху стаўлюся спакойна.

— А што скажаце пра жанчын у футболе?

— Калі было ўручэнне «Залатога мяча», то меў месца эпізод, калі лепшым гульцом-жанчынай прызналі Надзін Кеслер з каманды «Вольфсбург». І калі б усе дзяўчаты гулялі так, як Надзін, то стэрэатып пра жанчын у футболе перастаў бы існаваць. Ёсць таксама цудоўныя жанчыны, якія судзяць мужчынскія матчы. Таму жанчына — не самае страшнае ў футболе; калі яна прафесіянал, то чаму б не паказаць сябе?

— Сёння ваш вольны час па-ранейшаму засяроджаны на спорце?

— Выхадны дзень выпадае недзе адзін раз на тыдзень. Традыцыйна хочацца паспаць, бо мы хоць і не вагоны разгружаем, але ж стамляемся. Апошнім часам свае выхадныя імкнуся праводзіць з каханай дзяўчынай, якая жыве ў Гомелі. Пры магчымасці еду да яе.

— Вы вельмі пастаянны ў любові да футбола, а ў адносінах з дзяўчатамі такі ж?

— Так, але тут складана адказаць адназначна, бо былі розныя адносіны ў маім жыцці. Я лічыў іх сур'ёзнымі, аднак у пэўны момант нешта не атрымлівалася. Магчыма, я не мог уседзець на адным месцы, бо я лёгкі на пад'ём, люблю рызыкаваць, і хочацца побач бачыць чалавека, які будзе гатовы падтрымаць мае рашэнні альбо не стане працівіцца ім... Для мяне не істотна, напрыклад, ці будзе дзяўчына падзяляць мой інтарэс да спорту, бо яго мне хапае на працы. Ужо няма ранейшага фанатызму, калі хацелася нічога не прапусціць. Цяпер я дакладна вызначаю, што для мяне самае важнае. І хочацца, каб дзяўчына побач адчувала, што яна важнейшая за нейкую спартыўную падзею. Перыядычна трэба і саступаць адно аднаму.

— У 2012 годзе вы сталі трэцім на «Тэлевяршыні» ў намінацыі «Лепшы спартыўны вядучы». Ёсць мара быць нумарам адзін?

— Мая прафесійная мара — выйсці ў прамым эфіры і пракаментаваць нейкую значную футбольную падзею. А калі казаць пра «Тэлевяршыню», то хочацца, безумоўна, дасягнуць яе. Каб табе не здавалася, што ты працуеш толькі для сябе і сваіх блізкіх, якія бачаць, як цяжка часам гэта даецца. І тады з'яўляецца стымул: «Вось выйду на працу заўтра і зраблю яшчэ лепш»!

Алена ДРАПКО

Фота БЕЛТА.

■ Глядзіце!

Матчы НБА — на канале «Беларусь 5»

Тэлеканал «Беларусь 5» пачне трансляваць матчы Нацыянальнай баскетбольнай асацыяцыі ўжо на наступным тыдні. Першы матч, які ўбачаць у прамым эфіры прыхільнікі баскетбола 19 студзеня, — супрацьстаянне «Дэтройта» і «Атланты», а потым пачнецца прамая трансляцыя гульні «Мемфіса» і «Даласа». Плануецца, што за тыдзень «Беларусь 5» пакажа ў рэжыме анлайн 8 гульняў — трансляцыі будуць позна вечарам ці ноччу, а таксама ў паўторы ў зручны для гледачоў час.

Як падкрэсліў кіраўнік тэлеканала «Беларусь 5» Павел Булацкі, Нацыянальная баскетбольная асацыяцыя ўваходзіць у пяцёрку самых папулярных ліг у свеце, а яе аўдыторыя налічвае больш за мільярд аматараў спорту: «Там гуляюць суперпрафесіяналы, і выдатна, што за гульнёй такіх «зорак» будуць назіраць і балельшчыкі ў нашай краіне... «Беларусь 5» будзе трансляваць матчы ў найбольш зручны для гледачоў час. Спадзяюся, гэта стане яшчэ адным штуршком для развіцця баскетбола ў нашай краіне, і я ўдзячны за падтрымку гэтага праекта Беларускай федэрацыі баскетбола, кампаніі «Маналіт-Груп» і кіраўніцтву БДТРК».

Падзяліўся сваімі думкамі на гэты конт і старшыня Беларускай федэрацыі баскетбола Максім Рыжанкоў:

— Я ведаю, што многія прыхільнікі баскетбола чакалі моманту, калі на беларускім тэлебачанні зноў з'явіцца трансляцыя гульняў лепшай баскетбольнай лігі свету. І гэта цяпер стала магчымым. Я ўпэўнены, што з'яўленне матчаў на «Беларусь 5» стане чарговым імпульсам для развіцця беларускага баскетбола і павышанага інтарэсу да гэтага віду спорту сярод дзяцей і моладзі. Відовішча і майстэрства, якія дэманструюць гульцы НБА, здольны стымуляваць зацікаўленасць баскетболам. Мы не будзем спыняцца і пастараемся арганізаваць далейшае супрацоўніцтва з Нацыянальнай баскетбольнай асацыяцыяй, будзем рэалізоўваць сумесныя праекты. У прыватнасці, ужо праз некалькі месяцаў Беларусь можа наведаць каманда былых гульцоў НБА, якая правядзе некалькі паказальных матчаў у розных гарадах нашай краіны.

Прамыя трансляцыі матчаў Нацыянальнай баскетбольнай асацыяцыі на тэлеканале сталі магчымымі дзякуючы сумеснай працы Беларускай федэрацыі баскетбола і першага спартыўнага нацыянальнага тэлеканала краіны, а таксама пры спонсарскай падтрымцы ААТ «Маналіт Груп». Аказваць падтрымку Беларускай федэрацыі баскетбола кампанія вырашыла пасля таго, як восенню мінулага года пабывала на чэмпіянаце свету ў Турцыі, дзе падтрымлівала нашу жаночую зборную. У рамках супрацоўніцтва запланавана рэалізацыя шэрагу праектаў, сярод якіх і арганізацыя трансляцый НБА ў сезонах 2014/2015 і 2015/2016 на тэлеканале «Беларусь 5».

Алена ДРАПКО.

ВОДЗІМ РЭЙ НА ТАКУ

Штотыдзень у эфіры тэлеканала «Беларусь 3» — гульня «Размаўляем па-беларуску». Для таго, каб стаць яе ўдзельнікамі, неабходна зайсці на сайт http://tvrgomel.by або http://3belarus.by і праз банер «Размаўляем па-беларуску» запоўніць заяўку на каманду з трох чалавек. Папярэдне ж праверыць сваё веданне роднай мовы можна з дапамогай «Звязды». Ці ведалі вы, што:

Драбіны — прыстаўная лесвіца.

Камізэ́лька — адзежына без рукавоў і каўняра.

Касава́ць — выкрэсліваць, закрэсліваць; адмяняць.

Лямантава́ць — моцна і працягла крычаць.

Ле́йцы — рамяні для кіравання коньмі.

Ток — земляная падлога (звычайна гліняная).

Застацца з носам — застацца ні з чым, пры сваіх інтарэсах, застацца на бабах, застацца з макам. Па-рускy — «остаться у разбитого корыта». Ёсць версія, што некалі падарунак, які прыносіў з сабой жаніх пры сватанні, называўся «нос» — гэта значыць выкуп. І калі бацькі нявесты яму адмаўлялі, то хлопец (жаніх) заставаўся «з носам» — са сваім падарункам.

Весці рэй — быць завадатарам, верхаводзіць, правіць баль, іграць першую скрыпку. Рускі аналаг — «командовать парадом». «У гульні сама рэй водзіць, весела міргае, задзіўляе усіх чыста, як зара якая», сказ з паэмы Я. Купалы «Бандароўна».

Чарговыя выпускі тэлевіктарыны глядзіце ў эфіры «Беларусь 3» кожную суботу ў 11.10—11.25.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

■ Тэлесеткі

СЛАВА, ГРОШЫ, ЧАТЫРЫ КОЛЫ

Пасля невялікага паслясвяточнага перапынку творчая група Белтэлерадыёкампаніі пачала здымкі першых шасці выпускаў народнага шоу талентаў «Я магу!». Папярэдне арганізатары прагледзелі больш як 700 нумароў у самых розных жанрах, ад дэкламавання да майстэрства ілюзіі, і адабралі па выніках кастынгу 120 найбольш яркіх з іх.

«Удзельнікаў першага паўфіналу вялізнага інтэрактыўнага шоу гледачы ўбачаць на «Беларусь 1» ужо 31 студзеня, а далей выпускі «Я магу!» будуць выходзіць кожную суботу ў вячэрнім эфіры», — паведаміла **кіраўнік праекта Вольга ШЛЯГЕР.**

Нагадаем, таленавітыя суайчыннікі з розных рэгіёнаў краіны выступяць перад публікай і журы не толькі ўласна дзеля таго, каб сябе паказаць. Пераможца шоу, які атрымае максімальную падтрымку па выніках галасавання тэлегледачоў, будзе адзначаны матэрыяльна — аўтамабілем GEELY EX7 і значнай грашовай сумай.

Але да фінальнага выпуску «Я магу!», запланаванага ў эфіры на 25 красавіка, дабяруцца далёка не ўсе. Каму з канкурсантаў даць «дабро» на далейшы ўдзел, а з кім развітацца, будуць вырашаць і гледачы, і прафесійнае журы з 5 чалавек, якіх арганізатары праекта выберуць з ліку медыяперсон, прадстаўнікоў творчай інтэлігенцыі, прадзюсараў, журналістаў. У выніку ў кожным паўфінале журы мусіць выбраць усяго аднаго ўдзельніка, яшчэ аднаму падараць пуцёўку ў фінал гледачы (а калі дзве гэтыя кандыдатуры супадуць, вакантнае месца дастанецца канкурсанту, які зойме 2-е месца па выніках галасавання гледачоў).

Вікторыя ЦЕЛЯШУК

■

ПАНЯДЗЕЛАК, 19 СТУДЗЕНЯ

БЕЛАРУСЬ 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00 (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.10** Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 19.40, 23.50 Зона Х.
8.50 Слова Мітрапаліта Паўла на свята Вадохрышча.
9.10 Галоўны эфір.
10.05 Клуб рэдактараў.
10.45 «Зорнае жыццё». «Вайна за спадчыну».
11.00, 13.00, 16.00 90 секунд.
11.40 Меладрама «Нявеста на заказ».
13.50, 16.05 Драма «А снег кружыць...».
15.15, 18.40 Навіны рэгіёна.
17.35 Беларуская часінка.
19.20 Арэна.
20.00 Форум з Дзмітрыем Бачковым.
21.00 Панарама.
21.45 Серыял «След».
23.35 Актуальнае інтэрв'ю.
0.25 Дзень спорту.
0.40 Фантастыка «Людзі Ікс: Першы клас».

БЕЛАРУСЬ 2

7.00 Тэлераніца.
9.00, 10.00, 21.20 Тэлебарометр.
9.05, 14.55 Серыял «Сашка». Заключная серыя.
10.30 Фільм-казка «Снежная каралева».
12.00 Дэтэктыў «Сустрэчная плынь».
13.45 «Comedy Батл». Без межаў».
15.55, 23.30 Серыял «Таксі».
16.55 Гандбол. Чэмпіянат свету. Беларусь — Бразілія.
18.50 Серыял «Універ».
20.50 Мазгавы штурм.
21.25 КЕНО.
21.30 Дэтэктыў «Падмані мяне».
22.25 Дэтэктыў «Выпадковы сведка».
23.25 Хачу ў тэлевізар!
0.25 Серыял «Бафі — знішчальніца вампіраў».

БЕЛАРУСЬ 3

7.15 «Дабраранак».
7.50 «Хачу ўсё ведаць!».
8.00, 19.00, 23.40 «Размовы пра духоўнае».
8.10, 17.10 «Дыя@блог P.S.».
8.35 «Больш грошай». Камедыя.
10.05 «Культпрасвет».
10.40 «Прыгоды Тома Соера і Гекльберы Фіна». Дзіцячы фільм.
14.05 «Карусель». Камедыя.
15.10 «Камертон». Рэгент Патрыяршага хору Маскоўскага Данілава манастыра Георгій Сафонаў.
15.35 «Мужыкі!». Меладрама.

17.35 «Пярсцёнак княгіні Ганны». Маст. фільм.
19.10 «Таежная аповесць». Драма.
20.45 «Калыханка».
21.15 Хіт парад. «Сто песень для Беларусі».
22.05 «Дыя@блог». «Пра літаратуру».
22.30 «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
23.00 «Подых струн». Музычная праграма. Госць — Юлія Міцько.

БЕЛАРУСЬ 5

7.00, 4.10 PRO спорт. Навіны.
8.00 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Манчэстэр Сіці» — «Арсенал».
9.50, 14.10, 19.40 Фрыстайл. Чэмпіянат свету.
11.20 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Вэст Хэм» — «Хал Сіці».
13.10 Фактар сілы.
13.40 Свет англійскай прэм'ер-лігі.
15.35 Гандбол. Чэмпіянат свету. Беларусь — Славенія.
17.00 Біятлон. Этап Кубка свету. Рупольдзінг. Масстарт. Мужчыны.
17.50 Біятлон. Этап Кубка свету. Рупольдзінг. Масстарт. Жанчыны.
18.45 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
21.05 Гандбол. Чэмпіянат свету. Беларусь — Бразілія.
22.35 Баскетбол. НБА. Дэтройт — Атланта.
1.05 Баскетбол. НБА. Далас — Мемфіс.
3.15 Еўрапейскі покерны тур.

АНТ

6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 Контуры.
10.00 «Жыць здорава!».
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00 Навіны спорту.
11.10 «Фазэнда».
11.50 «Модны прыгавор».
13.10 «Мужчынскае/Жаночае».
14.10 «Сам-насам з усімі».
15.10, 16.15 «Сёння вечарам».
16.50 «Давай пажэнімся!».
18.20 «Адваротны адлік. «Еўфрасіння Полацкая. Жыццё пасля смерці». Фільм першы.
19.00 «Чакай мяне».
20.00 Час.
21.05 «Справа прынцыпу».
22.15 Камедыя «Адпетыя мхляры».

0.10 Начныя навіны.

СТБ

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.20 «Міншчына».
6.20, 7.45 «Раніца. Студыя добрага настрою».
7.40, 20.10, 22.55 «СТБ-спорт».
8.30 «Тыдзень».
9.45 «Вялікае сняданне».
10.40, 13.50, 16.50 «Гарады, якія спяваюць».
10.45, 17.30 «Званая вячэра».
11.40 «Сямейныя драмы».
12.35 «Не хлусі мне!».
13.55 «Вялікі горад».
14.30 «Зорны рынг».
15.30 «Ежа багоў».
16.20 «Наша справа».
16.55 «Далёкія сваякі».
18.30 «Скрытая пагроза»: «Сіла знака».
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.15 «Ваенная тайна».
23.00 «Тыдзень спорту».
23.30 «Дзіўная справа».
0.20 «Джокер». Серыял.

МІР

6.00 «180 хвілін».
9.00 «Беларусь сёння».
9.30, 1.50 Маст. фільм «Тайна запісной кніжкі».
11.00 Маст. фільм «Ты ёсць...».
12.30 «За сталом з правадырамі».
13.00, 16.00, 19.00, 23.00 Навіны (бягучы радок).
13.20, 4.15 Серыял «Дарогі Індыі».
15.05, 3.20 Серыял «У свеце ежы».
16.25, 0.55 Ток-шоу «Слова за слова».
17.20 Серыял «Доктар Тырса».
19.25 Маст. фільм «Адэль».
21.15, 23.15 Серыял «Браты-дэтэктывы».
0.15 Навіны (бягучы радок). Галоўная тэма.
0.25 «Наша марка».

РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 «Раніца Расіі».
10.55 Надвор'е на тыдзень.
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.35 «Прамы эфір».
12.50 «Асаблівы выпадак».
13.50, 16.50, 19.50, 23.20 Навіны — Беларусь.
14.30 «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
15.40 «Вожык супраць свастыкі».
16.40 «Касманаўтыка».
17.15 «Уся Расія».
18.00 Серыял «Сэрца зоркі».
18.55 Серыял «Пакуль станіца спіць».
20.55 Серыял «Бедныя сваякі».
21.55, 23.30 Серыял «Касатка».
0.40 «Дзяжурны па краіне». Міхаіл Жванецкі.

НТБ—БЕЛАРУСЬ

6.00 «НТБ раніцай».
8.30 «Справа ўрачоў».
9.25, 10.35 Серыял «Вяртанне Мухтара».
10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
11.55 «Суд прысяжных».
13.15 «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
14.15 «Ядзім дома».
14.50 Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
15.10 «Пракурорская праверка».
16.20 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».
18.05 «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
19.55 Серыял «Святло і цень маяка».
22.40 «Анатомія дня».
23.30 Серыял «Пятніцкі».

8 КАНАЛ

7.00, 13.35, 19.50, 20.55, 23.30 «Надвор'е».
7.05, 16.00 Мультпарад.
7.30 «Сёння клюе».
8.00 Камедыя «Знаёмства з бацькамі».
9.45 Серыял «Лэдзі-дэтэктыў».
10.45 «Кінаблакнот».
11.00 Дак. фільм «Вада».
13.40 Серыял «Чарцяня».
15.15, 19.35 «Тэлемагазін».
16.30 «Золата маўчання».
17.00 Дак. фільм «Дзеці свету».
18.00 Серыял «Эўрыка».
18.50 Серыял «Ведзьмы ўсходняга ўзбярэжжа».
19.55 Серыял «Спас пад бярозамі».
20.45 «Вечарніца».
21.00 Трылер «Улада страху».
23.00 Серыял «Прыгарад».

ВТВ

6.00, 3.00 «PLAY».
8.00 М/ф «Смяшарыкі».
8.30, 14.00, 17.00, 0.30 Скетч-шоу «6 кадраў».
9.00, 19.00 Серыял «Думай як жанчына».
11.00, 18.00 Серыял «Кухня».
12.00 Фэнтэзі «Вікінгі».
14.30, 17.30 «Лаві момант».
15.00 Серыял «90210: Новае пакаленне».
16.00, 23.10 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
16.30 Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
21.10 Камедыя «Прывітанне, мы ваш дах!».
0.00 «Дурні і дарогі».
1.00 Серыял «Зачараваныя».

КУЛЬТУРА

7.00 «Еўраньюс».
10.00, 15.00, 19.00, 23.40 Навіны культуры.
10.15 «Наглядальнік».
11.15 «Расследаванні камісара Мегрэ». Серыял.
12.00 Святы. Хрышчэнне Гасподняе.
12.30 «Веньямін Радамысленскі. Па конях!». Дак. фільм.
13.10 «Лінія жыцця». Аляксандр Філіпенка.
14.00 «Сусветныя скарбы культуры».
14.15 «Асоба дваранскага паходжання. Аляксей Ляпуноў». Дак. фільм.
15.10 «70 гадоў Вадзіму Абдрашытаву. «Спыніўся цягнік». Маст. фільм.
16.40 «Астравы». Вадзім Абдрашытаў.
17.20 «Там, дзе цячэ Іардан». Дак. фільм.
17.45 «80 гадоў дырыжору. «Аляксандр Дзмітрыеў». Дак. фільм.
18.10 «Паліглот». Партугальская з нуля за 16 гадзін! № 5.
19.15 Галоўная роля.
19.30 «Саці. Нясумная класіка...».
20.10 «Правілы жыцця».
20.40 «Добрай ночы, малыя!».
20.50 «Георгій Кастакі. Расчыніць акно». Дак. фільм.
21.35 «Тым часам».
22.25 Прыступкі цывілізацыі. «Скрозь кратовую нару з Морганам Фрыменам». Дак. серыял.
23.10 Памяці Алены Абразцовай. «Людзі. Опера. Жыццё». Фільм 1-ы.
0.00 Дакументальная камера. «Жан Рэнуар. Прысвячэнне».
0.40 «Джэміракуаі». Канцэрт у Вероне.
1.40 «Пецярбургскія тайны». Серыял.
2.40 «Pro memoria».

НАСТАЛЬГІЯ

6.00, 0.00 Дак. фільм «Хакей Анатоля Тарасава».
7.00 «Мелодыі Барыса Макрavусава». 1981 год.
8.10 «Вечар паэзіі. Лужнікі». 1976 год.
9.35, 14.20, 19.05, 0.55 Канцэрт замежнай эстрады.
10.00, 15.45 Маст. фільм «Мы, ніжэйпадпісаныя». 1-я серыя.

11.10 «Баль у Астанкіна, або Сядзі і глядзі». Навагодняя эстрадная праграма. 1991 год.
12.05 «Пад знакам задыяка. Казярог». 1994 год.
13.20 Дак. фільм «А што ў вас?».
14.45 «Вам песня прысвячаецца, або Зноў «Карнавальная ноч». Навагодні кінаканцэрт. 1983 год.
17.00 «Праграма А». Навагодні спецвыпуск: «Ноч кашмараў». 2-я частка. 1990 год.
18.00 «Да 16 і старэйшым». 1990 год.
18.50 М/ф «Вось такі рассеяны».
19.30 Тэлеспектакль «Гэты фантастычны свет». 1979 год.
20.30 Фільм-канцэрт «Танцуе Махмуд Эсамбаеў». 1978 год.
21.00, 3.00 «Час».
22.00 «Народжаныя ў СССР».
23.00 «Песня-81». 1-е аддзяленне.
1.15 Тэлефільм «Следства вядуць знатакі».
4.00 «Колба часу».
5.00 «Кінапанарама». 1983 год.

EUROSPORT

3.00, 5.00, 12.45, 0.30 Тэніс. Турнір Вялікага шлема. Адкрытае першынство Аўстраліі.
12.30 Тэніс.
16.15, 0.00, 2.30 Тэніс. Гейм, Сэт і Матс.
16.45 Лыжныя гонкі. Jizerska padesatka.
17.45 Зімовыя віды спорту. Скі-пас.
18.00 Скачкі на лыжах з трамплiна. Кубак свету.
18.30 WATTS.
18.45, 21.45 Футбол. Кубак афрыканскіх нацый.
21.00 Футбол. Еўрагалы.
21.30 Футбол.

КАМЕДЫЯ

6.00, 10.00, 14.35, 17.30, 22.00, 3.10 Серыял «Кірсці».
6.45 Камедыя «Прага золата».
8.05, 12.20, 14.15, 19.45, 22.40, 0.45, 2.50, 5.40 Скетчком «Паміж намі».
8.25 Камедыя «Правадыр разнаскурых».
10.45 Камедыя «Вялікі бізнес».
12.45 Камедыя «Канікулы ў Грэцыі. Усё ўключана».
15.20 Меладрама «Зоймемся любоўю».
18.20 Меладрама «Красуні».
20.20 Камедыя «Памылкова абвінавачаны Леслі Нільсен».
21.40 «Камедыянты. Лепшае». 1-я серыя.
23.10 Камедыя «Мамчын сынок».
1.15 Камедыя «Няма чаго губляць».
4.00 Меладрама «Купі, пазыч, украдзі».

ТБ3

6.00 М/ф.
8.20, 18.50, 2.15 «Каханне і пакаранне». Серыял.
9.55, 4.25 «Па справах няпоўнагадовых». Дак. серыял.
11.40, 18.00 «Справа Астахава». Дак. серыял.
12.35 «Сто пытанняў дарасламу».
13.20 «Аўрора». Серыял.
14.15 «Жонка. Гісторыя кахання».
15.35, 22.45, 3.40 «Зорныя гісторыі».
16.35 «Шчырая размова».
17.30 «Простыя складанасці».
20.40 «Шулер». Серыял.
21.45, 1.20 «Брыгада». Серыял.
23.40 «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.
0.25 «Часова даступны».

ТБ1000

6.00 Драма «Палёт даўжынёю ў жыццё».
7.45, 18.15 Драма «Сакавіцкія іды».
9.30 Камедыя «Гамбіт».
11.00, 23.30 Трылер «Крывавы дыямент».
13.30 Драма «Добрай ночы і ўдачы».
15.00 Камедыя «Дзеці сексу не перашкода».
16.45 Баявік «Агент пад прыкрыццём».
20.00 Камедыя «Даю год».
21.45 Баявік «Кілеры».
2.00 Трылер «Сірыяна».
4.15 Фільм жахаў «Жанчына ў чорным».

ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

6.20 Казка «Варвара краса — доўгая каса».
7.50 Меладрама «Начныя забавы».
9.40 Меладрама «Кітайская бабуля».
11.10 Мюзікл «Востраў загінулых караблёў».
13.40 Камедыя «Апельсінавы сок».
15.30 Трагікамедыя «Пра жонку, мару і яшчэ адну...».
16.50 Баявік «Брыгада: Наследнік».
18.40 Камедыя «Падарунак з характарам».
20.20 Драма «Золата».
22.20 Драма «Дом».
0.40 Фантастыка «Кантакт».
2.40 Меладрама «Марафон».
4.50 Прыгоды «Стрэлы Робін Гуда».

NATIONAL GEOGRAPHIC

6.00 Інжынерныя ідэі.
6.43 Гульні розуму.
7.07 Займальная навука.
7.28, 13.27 Навуковыя недарэчнасці.
7.52, 12.41 Зрабі або памры.
8.13, 19.29 90-я: дзесяцігоддзе, якое нас аб'яднала.
9.42, 14.12 Апакаліпсіс: Другая сусветная вайна.
11.11 Мегазаводы.
11.56, 18.44 Скарбашукальнікі.
15.43 Палярны мядзведзь.
16.26 Экстрэмальнае падарожжа.
17.13 Сутыкненне з астэроідам.
17.59, 3.02 Канвоі: бітва за Атлантыку.
21.00, 0.47, 3.46 Міжнародны аэрапорт Дубай.
21.45, 1.32, 4.30 Расследаванні авіякатастроф.
22.31, 5.15 Непаражальныя канструкцыі.
23.16 80-я: Найвялікшыя футбольныя моманты.
0.01, 2.17 Эвакуацыя Зямлі.

DISCOVERY

8.00, 10.55, 15.55, 21.20 Як гэта зроблена?
8.25, 10.30, 15.30, 21.45 Як гэта ўстроена?
8.50, 11.20 Трой.
9.40, 13.50 У пагоні за класікай.
12.10, 18.00 Каралі аўкцыёнаў.
13.00, 22.10, 7.05 Голыя і напалоханыя.
14.40, 6.05 Як мы вынайшлі свет.
16.20, 4.25 Хуткія і гучныя.
17.10, 5.15 Махінатары.
18.50 Хлопцы з Юкана.
19.40 Мяцежнікі ледзянога возера.
20.30 Эфект Карбанара.
23.00 Востраў.
23.50 Экстрэмальныя выхадныя.
0.40, 3.35 Паляўнічыя на рэліквіі.
1.30 Top Gear.
2.20 Маланкавыя катастрофы.
2.45 Сапраўдныя аферысты.

АЎТОРАК, 20 СТУДЗЕНЯ

БЕЛАРУСЬ 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00 (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 1.15** Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 19.40, 0.45 Зона Х.
9.10, 23.05 Серыял «След».
11.00, 13.00, 16.00 90 секунд.
11.05, 20.00 Серыял «Выходжу цябе шукаць».
12.10, 16.40 Серыял «Сямейныя меладрамы-3».
13.05 Дзень у вялікім горадзе.
14.00 Серыял «А шчасце дзесьці побач».
15.15, 18.40 Навіны рэгіёна.
15.25, 1.45 Серыял «Сваты 5».
17.35 Беларуская часінка.
19.20, 1.00 Сфера інтарэсаў.
21.00 Панарама.
21.45 42 з'езд Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі.
1.35 Дзень спорту.

БЕЛАРУСЬ 2

7.00 Тэлераніца.
9.00, 21.20 Тэлебарометр.
9.05, 16.40 Баявік «Кулінар». 1-я серыя.
10.05 «Fitnews».
10.40, 21.35 Дэтэктыў «Падмані мяне».
11.35, 22.30 Дэтэктыў «Выпадковы сведка».
12.45 Кіпень.
13.00 Ікра.
13.35, 18.50 Серыял «Універ».
15.40 «Comedy woman».
17.50, 23.35 Серыял «Таксі».
20.50 Мазгавы штурм.
21.25 Спортлато 6 з 49.
21.30 КЕНО.
23.30 Хачу ў тэлевізар!
0.25 Серыял «Бафі — знішчальніца вампіраў».

БЕЛАРУСЬ 3

7.15 «Дабраранак».
7.50 «Хачу ўсё ведаць!».
8.00, 16.20 «Эпоха». Станіслаў Аўгуст Панятоўскі — апошні кароль польскі і вялікі князь літоўскі.
8.55 «Таежная аповесць». Драма.
10.25, 17.15 «Дыя@блог». «Пра літаратуру».
10.55 «Навагоднія вечары ў Маладзечне». Беларускі дзяржаўны ансамбль «Песняры».
11.55 «Подых струн». Музычная праграма. Госць: Юлія Міцько.
12.30 «Прыцягненне Альберта Вейніка». Дак. фільм.
13.25, 0.30 «Святло далёкай зоркі». Памяці мастака Антона Бархаткова.
13.50 «Васіліса Прыгожая». Фільм-казка.
15.00 М/ф.
15.20 «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
15.55 «Пейзажы скрозь час». Амерыканскія імпрэсіяністы на рацэ Лейтэнант.
17.40 «У адлюстраванні зорак». Канцэрт салістаў Марыінскага тэатра.
19.10 «Шурачка». Драма.
20.45 Калыханка.
21.10, 23.00 «Даурыя». Драма.
22.35 «Дыя@блог». «Пра мову».

БЕЛАРУСЬ 5

7.00, 1.05 PRO спорт. Навіны.
7.40 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
8.30 Гандбол. Чэмпіянат свету. Беларусь — Бразілія.
10.00 Баскетбол. НБА. Далас — Мемфіс.
11.45 Баскетбол. НБА. Дэтройт — Атланта.
13.30 Фрыстайл. Чэмпіянат свету.
15.00 Біятлон. Этап Кубка свету. Рупольдзінг. Эстафета. Жанчыны.
16.30 Баскетбол. Адзіная ліга ВТБ. «Хімкі» — «Цмокі-Мінск».
18.05 Біятлон. Этап Кубка свету. Рупольдзінг. Эстафета. Мужчыны.
19.40 Баскетбол. НБА. Мемфіс — Далас.
21.25 Хакей. КХЛ. «Слован» (Браціслава) — «Дынама» (Мінск).
23.40 Спорт-кадр.
0.10 Еўрапейскі покерны тур.

АНТ

6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 «Жыць здорава!».
10.25 «Кантрольная закупка».
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00 Навіны спорту.
11.10 «Фазэнда».
11.50 «Модны прыгавор».
13.10 «Мужчынскае/Жаночае».
14.10 «Сам-насам з усімі».
15.10, 16.15 «Час пакажа».
16.50 «Давай пажэнімся!».
18.20 Серыял «ЗАГС».
18.50 «Няхай гавораць».
20.00 Час.
21.05 Серыял «Кат».
23.05 Серыял «Адналюбы».
0.10 Начныя навіны.

СТБ

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.20 «Міншчына».
6.20, 7.45 «Раніца. Студыя добрага настрою».
7.40, 20.10, 22.55 «СТБ-спорт».
8.55 «Глядзець усім!».
9.10 «Тыдзень спорту».
9.40 «Такі лёс».
10.40, 13.50, 16.50 «Гарады, якія спяваюць».
10.45, 17.30 «Званая вячэра».
11.40 «Сямейныя драмы».
12.35 «Не хлусі мне!».
13.55 Меладрама «Спатканне ўсляпую».
15.40 «Ежа багоў».
16.55 «Далёкія сваякі».
18.30 «Скрытая пагроза»: «Усё пад кантролем».
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.15 Баявік «13 раён: Ультыматум».
22.10 «Глядзець усім!».
23.00 «Разумней не прыдумаеш. «Белы сезон».
0.00 «Аўтапанарама».
0.20 «Джокер». Серыял.

МІР

6.00 «180 хвілін».
9.00 «Агульны інтарэс».
9.30, 1.45 Маст. фільм «Дыяменты для Марыі».
10.55 Маст. фільм «Адэль».
13.00, 16.00, 19.00, 23.00 Навіны (бягучы радок).
13.20, 4.05 Серыял «Дарогі Індыі».
15.05, 3.10 Серыял «Шлюб без ахвяр».
16.25, 0.55 Ток-шоу «Слова за слова».
17.20 Серыял «Доктар Тырса».
19.25 Маст. фільм «Трывожны водпуск адваката Ларынай».

21.10, 23.15 Серыял «Браты-дэтэктывы».
0.15 Навіны (бягучы радок). Галоўная тэма.
0.25 «Наша марка».

РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 «Раніца Расіі».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.35 «Прамы эфір».
12.50 «Асаблівы выпадак».
13.50, 16.50, 19.50, 23.20 Навіны — Беларусь.
14.30 «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
15.40 «Скальпель для першых асоб. Тайная хірургія».
16.35 «Факты».
17.15 «Уся Расія».
18.00 Серыял «Сэрца зоркі».
18.55 Серыял «Пакуль стаіца спіць».
20.55 Серыял «Бедныя сваякі».
21.55, 23.30 Серыял «Касатка».
0.40 «Сорак саракоў».

НТБ—БЕЛАРУСЬ

6.00 «НТБ раніцай».
8.30 «Справа ўрачоў».
9.25, 10.35 Серыял «Вяртанне Мухтара».
10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
11.55 «Суд прысяжных».
13.15 «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
14.15 «Справа густу».
14.45 Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
15.10 «Пракурорская праверка».
16.20 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».
18.05 «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
19.50 Серыял «Святло і цень маяка».
22.40 «Анатомія дня».
23.30 Серыял «Пятніцкі».

8 КАНАЛ

7.00, 13.35, 19.45, 20.55, 23.25 «Надвор'е».
7.05, 16.00 Мультпарад.
7.30 Камедыя «Як важна быць сур'ёзным».
9.10, 15.15 «Тэлемагазін».
9.30 Серыял «Лэдзі-дэтэктыў».
10.30 «Кулінарныя парады».
11.00 Драма «Дзеці Хуанг-Шы».
13.40 Серыял «Чарцяня».
16.30 «Золата маўчання».
17.15 Серыял «Іх пераблыталі ў радзільні».
18.45 Серыял «Ведзьмы ўсходняга ўзбярэжжа».
19.30 «Тваё здароўе».
19.50 Серыял «Спас пад бярозамі».
20.45 «Вечарніца».
21.00 «Даведнік па краінах і кантынентах».
21.10 Драма «Венера ў мяхах».
23.00 Серыял «Прыгарад».

ВТБ

6.00, 3.00 «PLAY».
8.00 М/ф «Смяшарыкі».
8.30, 14.00, 17.00, 0.30 Скетч-шоу «6 кадраў».
9.00, 19.00 Серыял «Думай як жанчына».
11.00, 18.00 Серыял «Кухня».
12.00 Камедыя «Прывітанне, мы ваш дах!».

14.30, 17.30 «Лаві момант».
15.00 Серыял «90210: Новае пакаленне».
16.00, 23.10, 2.30 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
16.30 Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
21.10 Камедыя «Рэальныя дзяўчаты».
0.00 «Дурні і дарогі».
1.00 Серыял «Зачараваныя».

КУЛЬТУРА

6.30 «Еўраньюс».
10.00, 15.00, 19.00, 23.40 Навіны культуры.
10.15 «Наглядальнік».
11.15 «Расследаванні камісара Мегрэ». Серыял.
12.05, 17.00, 21.30, 1.35 «Сусветныя скарбы культуры».
12.20, 20.10 «Правілы жыцця».
12.50 «Пятае вымярэнне».
13.15, 22.25 «Скрозь кратовую нару з Морганам Фрыменам». Дак. серыял.
14.00 «Пецярбургскія тайны». Серыял.
15.10 «Паляванне на Льва». 1-я серыя.
15.40 «Саці. Нясумная класіка...».
16.20 Да 90-годдзя з дня нараджэння Валянціна Бярлінскага. «Я заўсёды хацеў іграць у квартэце». Дак. фільм.
17.20 «Чатыры стагоддзі інструментальнага канцэрта». А. Вівальдзі.
18.00 «Сірано дэ Бержэрак». Дак. фільм.
18.10 «Паліглот». Партугальская з нуля за 16 гадзін! № 6.
19.15 Галоўная роля.
19.30 Штучны адбор.
20.40 «Добрай ночы, малыя!».
20.50 «Больш, чым каханне». Франклін і Элеанора Рузвельт.
21.45 «Гульня ў бісер». «Яўген Еўтушэнка. Лірыка».
23.10 «Людзі. Опера. Жыццё».
0.00 95 гадоў з дня нараджэння Ф. Феліні. «Гэтае дзіўнае імя Федэрыка». Дак. фільм.

НАСТАЛЬГІЯ

6.00 «Пад знакам задыяка. Казярог». 1994 год.
7.20 Дак. фільм «А што ў вас?».
8.20, 13.05, 19.10, 3.35 Канцэрт замежнай эстрады.
8.45 «Вам песня прысвячаецца, або Зноў «Карнавальная ноч». Навагодні кінаканцэрт. 1983 год.
9.45, 4.00 Маст. фільм «Мы, нiжэйпадпісаныя».
11.00 «Праграма А». Навагодні спецвыпуск: «Ноч кашмараў». 2-я частка. 1990 год.
12.00 «Да 16 і старэйшым». 1990 год.
12.50 М/ф «Вось такі рассеяны».
13.30 Тэлеспектакль «Гэты фантастычны свет». 1979 год.
14.30 Фільм-канцэрт «Танцуе Махмуд Эсамбаеў». 1978 год.
15.00, 21.00 «Час».
16.00, 22.00 «Народжаныя ў СССР».
17.00, 23.00 «Песня-81».
18.00 «Яловая субмарына». «Гісторыя рускага рока». «Гукі Му». 2-я частка. 2006 год.
19.30 Тэлеспектакль «Альманах сатыры і гумару». 1980 год.
20.30 Фільм-канцэрт «Песні пра каханне». 1975 год.
0.00 Дак. фільм «Хакей Анатоля Тарасава».
1.00 «Мелодыі Барыса Макрavусава». 1981 год.
2.10 «Вечар паэзіі. Лужнікі». 1976 год.
5.10 «Баль у Астанкіна, або Сядзі і глядзі». Навагодняя эстрадная праграма. 1991 год.

EUROSPORT

3.00, 5.00, 12.45, 16.45, 0.45 Тэніс. Турнір Вялікага шлема. Адкрытае першынство Аўстраліі.
12.30 Тэніс.
16.15, 0.00, 2.30 Тэніс. Гейм, Сэт і Матс.
18.45, 21.45 Футбол. Кубак афрыканскіх нацый.
21.00 Футбол.
0.30 Аўта- і мотаспорт.

КАМЕДЫЯ

6.00, 10.00, 14.35, 17.30, 1.15 Серыял «Кірсці».
6.45 Камедыя «Правадыр разнаскурых».
8.25 Камедыя «Канікулы ў Грэцыі. Усё ўключана».
10.45 Меладрама «Зоймемся любоўю».
12.45 Меладрама «Красуні».
14.15, 16.55, 19.55, 21.40, 22.50, 0.55 Скетчком «Паміж намі».
15.20 Камедыя «Мамчын сынок».
18.20 Камедыя «Памылкова абвінавачаны Леслі Нільсен».
19.40 «Камедыянты. Лепшае».
20.20 Камедыя «Рэстаран спадара Сэптыма».
22.00 Серыял «Маё вялікае армянскае вяселле». 1-я серыя.

23.10 Меладрама «Стыльная штучка».
2.00 — Прафілактыка на канале.

ТБ3

6.00 М/ф.
7.45, 14.10 «Доктар І...».
8.15, 18.50, 1.50 «Каханне і пакаранне». Серыял.
9.45, 4.25 «Па справах няпоўнагадовых». Дак. серыял.
11.30, 17.50 «Справа Астахава». Дак. серыял.
12.25, 16.25 «Шчырая размова».
13.20 «Аўрора». Серыял.
14.40, 0.15 «Каменская». Серыял.
15.30, 22.45, 3.20 «Зорныя гісторыі».
16.25 «Шчырая размова».
20.35 «Шулер». Серыял.
21.40, 1.00 «Брыгада». Серыял.
23.30 «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.
4.00 «Простыя складанасці».

ТБ1000

6.00, 13.30 Камедыя «Сцюарт Літл 2».
7.30 Фантастыка «Паралельныя светы».
9.30 Трылер «Сірыяна».
11.45 Фэнтэзі «Віхор».
15.00 Камедыя «Добры хлопец».
16.30 Камедыя «Поўнач у Парыжы».
18.15 Драма «7 дзён і начэй з Мэрылін».
20.00 Камедыя «Гамбіт».
21.30 Драма «Дарыян Грэй».
23.30 Драма «Паляванне».
1.45 Драма «Сакавіцкія іды».
3.45 Камедыя «Джэк і Джыл: Каханне на чамаданах».

ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

6.20 Казка «Вечары на хутары паблізу Дзіканькі».
7.50 Камедыя «З Новым годам, мамы!».
9.30 Камедыя «Цётачкі».
11.10 Драма «Каляфутбола».
13.00 Меладрама «Начныя забавы».
14.50 Фантастыка «Кантакт».
16.40 Трагікамедыя «Рэпетыцыі».
18.30 Баявік «Спіраль».
20.20 Камедыя «Прывітанне, я ваш тата!».
22.30 Драма «Размова».
0.00 Баявік «Бой з ценем 3D: Апошні раўнд».
2.20 Меладрама «Вось гэта каханне!».
4.20 Трагікамедыя «Баламут».

NATIONAL GEOGRAPHIC

6.00 Інжынерныя ідэі.
6.43 Гульні розуму.
7.07 Займальная навука.
7.28, 13.27 Навуковыя недарэчнасці.
7.52, 12.41 Зрабі або памры.
8.13 Апакаліпсіс: Другая сусветная вайна.
9.42, 14.12, 19.29 Міжнародны аэрапорт Дубай.
10.27, 14.57, 20.15 Расследаванні авіякатастроф.
11.11 Мегазаводы.
11.56, 18.44 Скарбашукальнікі.
15.43 Маё жыццё з гарыламі.
16.28 Экстрэмальнае падарожжа.
17.13 У пошуках да Вінчы.
17.59, 3.02 Канвоі: бітва за Атлантыку.
21.00, 0.47, 3.46 Папулярная навука.
21.45, 23.00, 1.32, 4.30, 5.15 Кіраванне натоўпам.
23.16 80-я: Найвялікшыя тэхнічныя навінкі.
0.01, 2.17 Эвакуацыя Зямлі.

DISCOVERY

8.00, 10.55, 15.55, 21.20 Як гэта зроблена?
8.25, 10.30, 15.30, 21.45 Як гэта ўстроена?
8.50, 11.20 Як мы вынайшлі свет.
9.40, 13.50, 22.10 Хуткія і гучныя.
12.10, 18.00 Паляўнічыя на рэліквіі.
13.00, 7.05 Голае выжыванне.
14.40, 6.05 Забойныя дылемы.
16.20, 4.25 Класіка з Паўднёвага пляжа.
17.10, 5.15 Махінатары.
18.50 Экстрэмальныя выхадныя.
19.40 Востраў.
20.30 Голыя і напалоханыя.
23.00 Мяцежны гараж.
23.50 Легендарны аўтамабіль.
0.40, 3.35 Склады.
1.30 Top Gear.
2.20 Маланкавыя катастрофы.
2.45 Сапраўдныя аферысты.

■ Тэлесеткі

Хто хоча, той даб'ецца?

Кандыдатам у тэлевядучыя давядзецца спаборнічаць на вачах ва ўсёй краіны

Праект тэлеканала «Беларусь 2» «Хачу ў тэлевізар» перарасце ў аднайменнае маштабнае рэаліці-шоу. Першыя выпускі яго гледачы ўбачаць ужо ў лютым.

Апынуцца па той бок экрана і выпрабаваць свае сілы ў якасці тэлевядучых з мая мінулага года пажадалі больш як 100 чалавек з розных рэгіёнаў Беларусі, якія даслалі свае заяўкі ў праграму «Хачу ў тэлевізар». Усім ім была дадзена магчымасць, так бы мовіць, паказаць тавар тварам і прадэманстраваць свае таленты ў эфіры. У выніку большасць прэтэндэнтаў адсеялася, і строгае тэлевізійнае журы адабрала толькі 25 чалавек для ўдзелу ў рэаліці-шоу. Цяпер ім цягам двух месяцаў давядзецца паспрабаваць асвоіць прафесію тэлевядучага ў палявых умовах і даказаць словам і справай, што менавіта яны — лепшыя.

7.28, 13.27 Навуковыя недарэчнасці.
7.52, 12.41 Зрабі або памры.
8.13 Машыны: разабраць і прадаць.
8.57 Шаша праз пекла.
9.42, 14.12, 19.29 Дыстанцыйнае выжыванне.
10.27, 14.57, 20.15 Золата Юкана.
11.11 Мегазаводы.
11.56, 18.44 Скарбашукальнікі.
15.43 Няўлоўная кошка.
16.28 Па слядах міфічных пачвар.
17.13 Страчаная грабніца Чынгісхана.
17.59, 3.02 Вялікія ўцёкі.
21.00, 23.16, 0.47, 3.46 90-я: дзесяцігоддзе, якое нас аб'яднала.
22.31, 5.15 Аферысты і турысты.
0.01, 2.17 Рэальнае паранармальнае.

DISCOVERY

8.00, 10.55, 15.55, 21.20 Як гэта зроблена?
8.25, 10.30, 15.30, 21.45 Як гэта ўстроена?
8.50, 11.20 Навука магіі.
9.40, 13.50 Што ў вас у гаражы?
12.10, 18.00 У пагоні за выгадай.
13.00, 7.05 Горш быць не магло.
14.40, 6.05 Трой.
16.20, 4.25 У пагоні за класікай.
17.10, 5.15 Махінатары.
18.50 Стальныя мышцы.
19.40 Акварыумны бізнес.
20.30 Дамы на дрэвах.
22.10 Хлопцы з Юкана.
23.00 Мяцежнікі ледзянога возера.
23.50 Чыгунка Аляскі.
0.40, 3.35 Каралі аўкцыёнаў.
1.30 Top Gear.
2.20 Маланкавыя катастрофы.
2.45 Сапраўдныя аферысты.

СУБОТА, 24 СТУДЗЕНЯ

БЕЛАРУСЬ 1

6.45 Існасць.
7.15 Меладрама «Дзякуй за каханне».
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
9.10 Клуб рэдактараў.
9.50, 23.35 Серыял «Каханне ў вялікім горадзе-3».
10.45 «Пра ежу!».
11.25 Кулінарная дыпламатыя.
12.10 Гісторыі рамонту.
12.50 «Здароўе». Ток-шоу.
13.30 БеларусьLIFE.
13.55 «Зорнае жыццё». «Багатыя і незамужнія».
15.15 Навіны рэгіёна.
15.30, 0.40 «Вялікая розніца».
16.35 Давярай і правярай.
17.00 «Трыумф. Героям спорту 2014». Дзённік.
17.20 Меладрама «Бераг надзеі».
21.00 Панарама.
21.40 Меладрама «Гэтая жанчына да мяне».
0.30 Дзень спорту.

БЕЛАРУСЬ 2

6.55 Фільм-казка «Як Іванка-дурань па цуд хадзіў».
8.25 Толькі для дарослых.
8.40 М/с «Аватар. Легенда пра Ааанга».
10.00 Беларуская кухня.
10.35, 21.15 Тэлебарометр.
10.40 Капейка ў капейку.
11.15 «Экстрасэнсы вядуць расследаванне».
12.20 Вось гэта дзіва!
12.55 Серыял «Бафі — знішчальніца вампіраў».
15.25 Біятлон. Этап Кубка свету. Гонка пераследу. Мужчыны.
16.20 «Comedy woman».
17.25 Біятлон. Этап Кубка свету. Гонка пераследу. Жанчыны.
18.20 Ікра.
19.15 Ваша лато.
19.40 Латарэя «Пяцёрачка».
20.00 «Сустрэча з...» Лідзія Пташук.
20.35 Кіпень.
21.00 Спортлато 6 з 49.
21.05 КЕНО.
21.20 Камедыя «Вядзьмарка».
23.10 Камедыя «Вялікі тата».
0.35 Хакей для ўсіх.

БЕЛАРУСЬ 3

8.00 «Мужчыны сівеюць рана». Драма.
9.20 «Камертон». Станіслаў Гаварухін.
9.45, 14.00, 17.45 «Размаўляем па-беларуску».
9.50 «Прыгоды Карзінкінай». Меладрама.
10.25 «Навагоднія вечары ў Маладзечне». Вакальны ансамбль «Камерата».
11.20 «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
11.50 «Дазвольце расказаць!». Амерыканскі гітарыст Стэнлі Джордан.
12.00 «Страсці па Уладзіміру». Камедыя.
14.05 «Калошы шчасця». Фільм-казка.
15.35 «Музеі Беларусі». Музей пошты.
16.00 Канцэрт сімфанічнага «IP-аркестра» і пан-флейтыста Алега Мінакова.
17.20 «Дыя@блог P.S.».
17.50 «Падзенне Рымскай імперыі». Драма.
20.45 Калыханка.
21.15 «Блакітны анёл». Драма.
22.50 «Уладзімір Высоцкі. Беларускі след». Дак. фільм.

БЕЛАРУСЬ 5

4.05, 14.00, 18.10 Баскетбол. НБА. Чыкага — Далас.
6.15, 0.10 PRO спорт. Навіны.
6.45 Піт-стоп.
7.10, 19.55 Сноўборд. Чэмпіянат свету.
9.10 Хакей. КХЛ. «Мядзведзчак» (Загараб) — «Дынама» (Мінск).
11.00 Гандбол. Чэмпіянат свету. Катар — Беларусь.
12.25 Біятлон. Этап Кубка свету. Антхольц. Спрынт. Жанчыны.
15.40 Муай-тай. К-1. Сусветны Гран-пры.
17.45 Свет англійскай прэм'ер-лігі.
21.20 Біятлон. Этап Кубка свету. Антхольц. Гонка пераследу. Мужчыны.
22.20 Біятлон. Этап Кубка свету. Антхольц. Гонка пераследу. Жанчыны.
23.20 Еўрапейскі покерны тур.

АНТ

7.00 «Суботняя раніца».
8.00, 9.00, 16.00, 20.30 Нашы навіны.
9.05 М/с «Смяшарыкі». Новыя прыгоды.
9.25 «Валянціна Талызіна. Час не лечыць».
10.25 «Смак».
11.10 «Ідэальны рамонт».
12.15 «Разумніцы і разумнікі».
13.00 Камедыі «Кухарка».
14.20 «Аляксандр Мень. «Я ўсё паспеў...».
15.15 «Рассмяшы коміка».
16.15, 20.55 Навіны спорту.
16.20 Серыял «Масгаз».
21.00 «Сёння вечарам».
22.45 «Легенды Life. «U2».
23.30 «Цырк з іншай планеты».

СТБ

6.30 «Студэнты 2». Серыял.
7.20 «Анфас».
7.35 Камедыя «Я не ведаю, як яна робіць гэта».
9.10 «Чыстая праца».
10.00 «Іншая краіна». «Там, дзе Еўропа сустракаецца з Азіяй».
10.40, 13.40, 16.50 «Гарады, якія спяваюць».
10.45 «Гэта мой дом».
11.15 «Дарагая перадача».
11.30 «Мінск і мінчане».
12.05 «Прыгоды дылетанта».
12.40 «Сакрэтныя тэрыторыі».
13.45 «Ваенная тайна».
14.45 «NEXT 2». Серыял.
16.30, 19.30 «24 гадзіны».
16.50 «Наша справа».
17.00 «Вялікі горад».
17.35 «Дзіўная справа».
18.30 «Разумней не прыдумаеш. «Сезон адкрыццяў».
20.00 «СТБ спорт».
20.10 Маст. фільм «Каханне па правілах і без».
22.30 «Зорны рынг».
23.30 Трылер «Смяротная спадчына».
1.10 «Дакументальны праект»: «Закінуты свет».
2.00 «Глядзець усім!».

МІР

6.00 М/ф.
8.10 «Саюзнікі».
8.40 Сабака ў доме.
9.05 «Скажыце, чаму?».
9.30, 1.50 «Ой, мамачкі».
10.00, 16.00 Навіны (бягучы радок).
10.10, 2.35 «Любімыя акцёры».
10.40, 0.50 Маст. фільм «Крымінальны квартэт».
12.25 Маст. фільм «Кітайскі сервіз».
14.20 Серыял «Маленькія тайны вялікіх людзей».
15.15 «Культпрасвет».
16.10 Серыял «Амазонкі».
21.40 Маст. фільм «Довіль».
3.05 Маст. фільм «Член урада».

РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 «Пакой смеху».
7.50 Маст. фільм «Завея».
11.00, 14.00 Весткі.
11.15 «Суботнік».
11.50 «Планета сабак».
12.20 Маст. фільм «Праверка на каханне».
14.15 Серыял «Мора па калена».
16.05 «Людміла Савельева. Пасля балю».
17.10 «Гэта смешна».
19.55 Надвор'е на тыдзень.
20.00 Весткі ў суботу.
20.45 Маст. фільм «Бяражы яго, каханне».
22.30 Маст. фільм «Удавец».

НТБ—БЕЛАРУСЬ

6.05 Серыял «Гончыя».
6.55, 8.20 Серыял «Дарожны патруль».
8.00, 10.00, 13.00 Сёння.
8.50 «Урачэбныя тайны плюс».
9.25 «Справа густу».
10.20 «Галоўная дарога».
11.05 «Паедзем, паядзім!».
11.50 «Кватэрнае пытанне».
13.25 Серыял «Дзяржаўная абарона».
15.55 Маст. фільм «Двайны блюз».
17.35 «Першая кроў».
18.05 «Следства вялі...».
19.00 «Цэнтральнае тэлебачанне».
20.05 «Новыя рускія сенсацыі».
22.10 «Ты не паверыш!».
23.10 Маст. фільм «Рускі характар».
0.50 «Мужчынская годнасць».

8 КАНАЛ

9.00, 15.10, 19.10, 20.55, 23.45 «Надвор'е».
9.05 Мультпарад».
9.25 Камедыя «Добрая жанчына».
11.00 «Даведнік па краінах і кантынентах».
11.10 Прыгоды «Кніга джунгляў».
13.00 Меладрама «Красуня».
15.15 «Кінаблакнот».
15.30 «Тэлемагазін».
16.00 «Адшукваецца адпачынак».
16.30 Фантастыка «Людзі ў чорным».
18.10 Дак. фільм «Іерогліф дружбы».
19.15 Меладрама «Сірата казанская».
20.45 «Вечарніца».
21.00 «Фэшн is my прафэшн».
21.10 Драма «Парфумер».
22.30 Аляксандра Захарава, Віктар Ракаў, Аляксандр Балуеў, Сяргей Сцяпанчанка ў спектаклі тэатра «Ленкам» «Нябесныя вандроўцы».
0.15 «Тоні Бенет. Дуэты».
1.40 «І смех, і грэх». «Камунальная гісторыя». М/ф для дарослых.
2.50 «Джардана Бруна». Дак. фільм.

ВТВ

6.00 «PLAY».
8.30 М/ф «Смяшарыкі».
9.00 Серыял «Татавы дочкі. Нявесты».
10.00, 2.00 «Турбаміксер».
12.00 «Хатняя кухня».
12.30 Серыял «Каралёк — птушка пеўчая».
15.00 Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
15.30 Камедыя «Кактус».
17.30 «Уральскія пельмені».
19.00 Серыял «Супер Макс».
20.30 Меладрама «Фатальная красуня».
22.40 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
23.30 Скетч-шоу «Валера-ТБ».
0.30 «Лаві момант».
1.00 «Нерэальная гісторыя».
1.30 «Людзі Хэ».

КУЛЬТУРА

6.30 «Еўраньюс».
10.00 Біблейскі сюжэт.
10.35 «Жаніцьба». Маст. фільм.
12.10 «Астравы». Валянціна Талызіна.
12.55 Вялікая сям'я. Андрэй Жыцінкін.
13.50 Пернікавы домік. «Адыгскі касцюм».
14.20 Да 100-годдзя пачатку Першай сусветнай вайны. «Нефрантавыя нататкі». Дак. серыял.
14.50 Канцэрт дзяржаўнага акадэмічнага ансамбля Грузіі «Эрисиони» ў Дзяржаўным Крамлёўскім палацы.
16.15 «Атэла». Маст. фільм.
18.00 «Андрэй Папоў. Трэба, каб сабачка выбягаў...». Дак. фільм.
18.40, 1.55 «Туарэгі, воіны ў дзюнах». Дак. фільм.
19.35 «Рамантыка раманса». Міхаілу Ісакоўскаму прысвячаецца.
20.30 Аляксандр Шырвінт. Вечар у Доме акцёра.
21.10 Кіно на ўсе часы. Да 95-годдзя з дня нараджэння Федэрыка Феліні. «Рэпетыцыя аркестра». Маст. фільм.
22.30 Аляксандра Захарава, Віктар Ракаў, Аляксандр Балуеў, Сяргей Сцяпанчанка ў спектаклі тэатра «Ленкам» «Нябесныя вандроўцы».
0.15 «Тоні Бенет. Дуэты».
1.40 «І смех, і грэх». «Камунальная гісторыя». М/ф для дарослых.
2.50 «Джардана Бруна». Дак. фільм.

НАСТАЛЬГІЯ

6.00, 0.00 Дак. фільм «Першы прэзідэнт»
7.00, 13.00, 21.35 Канцэрт замежнай эстрады.
7.20, 1.35 Тэлеспектакль «Спяшайцеся рабіць дабро». 1982 год.
8.30 М/ф «Пластылінавая варона».
8.40 «Маленькі канцэрт» .
9.00, 15.00, 3.00 «Час».
10.00, 4.00 «Народжаныя ў СССР».
11.00 Праграма «ТЭМА» з У. Лісцьевым: «Праблемы эміграцыі». 1993 год.
11.45 Фільм-канцэрт «Спявае Івіца Шэрфезі».
12.00 Дак. фільм «Аліса Фрэйндліх. Выбранае».
13.20 Тэлефільм «Следства вядуць знатакі».
16.00 «Колба часу».
17.00 Праграма «Погляд». 1988 год. 1-я частка.
18.00 «Ранішняя пошта». 1988 год.
18.45 «Пакуль усе дома». 1992 год.
19.15 «Канцэрт у гонар Артыста». Юбілейны вечар народнага артыста СССР А. Райкіна. 1987 год.
21.00 «Што сказана, тое сказана...». Спявае Юрый Лаза. 1991 год.
22.00 Тэлеспектакль «Усяго некалькі слоў у гонар спадара дэ Мальера». 1973 год.
1.00 «Гукавая дарожка». TV-версія. 1994 год.
2.30 Фільм-канцэрт «Душы маёй прызнанні». 1981 год.
5.00 «Песня застаецца з чалавекам: «Пяшчота». 1985 год.

EUROSPORT

3.00, 5.00, 12.45, 15.00, 0.30 Тэніс. Турнір Вялікага шлема. Адкрытае першынство Аўстраліі.
12.30 Тэніс.
13.45, 18.15 Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны.
16.15, 0.00, 2.30 Тэніс. Гейм, Сэт і Матс.
16.30 Біятлон. Кубак свету. Мужчыны. Гонка пераследу.
17.15 Біятлон. Кубак свету. Жанчыны. Гонка пераследу.
18.45, 21.45 Футбол. Кубак афрыканскіх нацый.
21.00 Футбол.

КАМЕДЫЯ

6.00, 10.15, 14.30, 17.30 Серыял «Маё вялікае армянскае вяселле».
6.55 Камедыя «Рэстаран спадара Септыма».
8.15, 17.05, 19.55, 22.45, 0.55, 2.50, 5.45 Скетчком «Паміж намі».
8.35 Камедыя «Я вяртаюся да мамы».
10.00, 14.10, 19.35 «Камедыянты. Лепшае».
11.05 Прыгоды «Прыкіньця маім мужам».
12.45 Меладрама «Пастка для нявесты».
15.25 Камедыя «Дзейнічай, сястра!».
18.20 Камедыя «Невынішчальны шпіён».
20.20 Камедыя «Таймшэр».
22.00 Серыял «Былыя». 1—2 серыя.
23.10 Камедыя «Дзейнічай, сястра 2. Старыя звычкі».
1.15 Камедыя «Хросныя бацькі».
3.10 Серыял «Кірсці».
4.00 Меладрама «Стыльная штучка».

ТБ3

6.00 М/ф.
10.10 «Свая праўда».
11.05 «Хронікі маскоўскага быту».
12.10 «Гісторыі выратавання».
12.40 «Пазашлюбныя дзеці». Дак. фільм.
14.10, 3.00 «Загадка для Веры». Серыял.
17.30 «Сон і сны». Дак. фільм.
19.00 «Даўно не бачыліся!».
20.00 Маст. фільм «Пад прыцэлам кахання».
22.00 Маст. фільм «Недзе».
23.40 «Жыццё ў доўг». Спецыяльны рэпартаж.
0.10 «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.
1.40 Маст. фільм «Адплата».

ТБ1000

6.00, 13.30 Баявік «Нацыянальная бяспека».
7.30 Фільм жахаў «Жанчына ў чорным».
9.05 Камедыя «Амаль знакаміты».
11.15 Драма «Буш».
15.00 Баявік «Агент пад прыкрыццём».
16.30 Трылер «Філосафы: Урок выжывання».
18.15 Камедыя «Даю год».
20.00 Драма «Машына Джэйн Мэнсфілд».
22.10 Трылер «Прывід».
0.15 Камедыя «1+1».
2.15 Меладрама «Трыстан і Ізольда».
4.25 Драма «Рэйчэл выходзіць замуж».

ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

6.20 Камедыя «Апельсінавы сок».
8.00 М/ф «Карлік Нос».
9.30 Фантастыка «Кантакт».
11.10 Трагікамедыя «Белы маўр, або Інтымныя гісторыі пра маіх суседзяў».
12.50 Дэтэктыў «Лёс рэзідэнта».
15.30 Меладрама «Каханне без страхоўкі».
17.10 Трагікамедыя «Кококо».
18.40 Драма «Чэмпіёны».
20.20 Камедыя «Пісталет Страдывары».
22.00 Камедыя «Прывітанне, я ваш тата!».
0.10 Камедыя «Назад — на шчасце, або Хто знойдзе Сінюю птушку».
2.30 Меладрама «Вось гэта каханне!».
4.20 Меладрама «Начныя забавы».

NATIONAL GEOGRAPHIC

6.00 Сканеры старажытнага свету.
6.43 Скарбашукальнікі.
7.28 Паядынак непераможных.
8.13 Гульні розуму.
8.35 Займальная навука.
8.57 Навуковыя недарэчнасці.
9.19, 17.59, 18.44, 19.06, 20.37 Зрабі або памры.
9.42 Космас: Прастора і час.
10.27 Рэальнае паранармальнае.
11.11 Навука будучыні Стывена Хокінга.
11.56 Больш чым фокусы.
12.41, 16.28 Кіраванне натоўпам.
13.27 Прызнанні нацыстаў.
14.12 Генералы.
14.57 Прыручыць дракона.
15.43 Дзікая прырода Амазонкі.
17.13 Гульня ў лікі.
21.00, 0.47, 3.46 Расследаванні авіякатастроф.
22.31, 2.17 Эвакуацыя Зямлі.
23.16, 3.02 Уварванне на Зямлю.
0.01, 5.15 Найгоршае надвор'е ўсіх часоў?

DISCOVERY

8.00, 17.10, 5.15 Легендарны аўтамабіль.
8.50, 15.30 Хуткія і гучныя.
9.40, 16.20, 6.05 Мяцежны гараж.
10.30 Стальныя мышцы.
11.20 Мужчынскія бярлогі.
12.10 Дамы на дрэвах.
13.00, 4.00 Паляўнічыя на рэліквіі — ламбард.
13.50, 22.10 Бітвы за кантэйнеры.
14.40 Бітва за нерухомасць.
18.00 Калекцыянеры аўто.
23.00 Востраў.
23.50 Эфект Карбанара.
0.40 Мяцежнікі ледзянога возера.
1.30 Голыя і напалоханыя.
2.20 Не спрабуйце паўтарыць.
3.10 Хлопцы з Юкана.
4.50 Маланкавыя катастрофы.
7.05 Невытлумачальнае.

■ Кінагід

«КАХАННЕ І ГАЛУБЫ»

30 гадоў таму, у студзені 1985 года, на экраны краіны выйшаў фільм рэжысёра Уладзіміра Мяньшова «Каханне і галубы». Гэтую карціну, якая пасля стала славутай, некалькі разоў вярталі на дапрацоўку, лаялі, казалі, што Мяньшову здрадзіла пачуццё густу... Дзяржкіно адмовілася прыняць карціну, палічыўшы, што ў ёй шмат п'янства. Аднак Мяньшоў стаяў на сваім, і пасля доўгіх спрэчак і нязначных папраўак фільм пусцілі ў пракат. Вашай увазе — цікавыя факты пра яго.

Сцэнарый фільма напісаў акцёр, рэжысёр, драматург, член Саюза пісьменнікаў Расіі, ганаровы жыхар горада Чаромхава Уладзімір Гуркін. У аснове сюжэту — рэальная гісторыя сям'і Васіля і Надзеі Кузякіных, якія жылі на радзіме аўтара сцэнарыя. Спачатку гэта была п'еса, якая паспяхова ішла ў многіх тэатрах краіны. Там яе, дарэчы, і ўбачыў Мяньшоў, які шукаў ідэю для новага фільма. Гуркін памёр летам 2010 года, а ў 2011 годзе ў Чаромхава быў устаноўлены помнік героям фільма.

Па сцэнарыі Надзея — жанчына сярэдніх гадоў, а баба Шура — старая-пенсіянерка. Аднак актрыса Ніна Дарошына, выканаўца ролі Надзеі, на 10 гадоў старэйшая за Наталлю Ценякову, якая сыграла бабу Шуру. На час здымак Дарошынай было 50 гадоў, а Ценяковай толькі 40.

Баба Шура (Ценякова) і дзядзька Міця (Сяргей Юрскі) і ў жыцці муж і жонка. Гэта адна з самых інтэлігентных пар Санкт-Пецярбурга, і ўдвая дзіўна, як добра яны сыгралі вясковых жыхароў. У выкананні Сяргея Юрскага, якому тады яшчэ і 50 гадоў не было, вясковы дзед атрымаўся вельмі смешным і тэатральным.

У сцэне, калі з дзвярэй хаты Міхайлаў падае прама ў ваду, вадалазы ў вадзе здымалі з яго касцюм, каб акцёр вынырнуў і адразу тэкст казаў. У другім дублі пад вадой узніклі праблемы з гальштукам, акцёр ледзь не патануў, і потым гальштук давялося разразаць. Дарэчы, «спякотнае мора» здымалі хоць і ў Батумі, але ў лістападзе — у халоднай 14-градуснай вадзе.

З фільма цэнзурай было выразана мноства цікавых сцэн. Напрыклад, тая, у якой выпадковы мінак на пірсе дапіваў піва з кufляў дзядзькі Міці і Васіля. У фільм увайшоў кадр, дзе ён толькі прыступае да «справы». Самае цікавае, што ў мясцовага жыхара, спецыяльна знойдзенага для здымак сцэны, атрымалася выпіць 5 кufляў літаральна за лічаныя секунды.

Знакамітыя фразы з фільма:

— Шыбанула вашага бацьку, Людка! Усё, цяпер так і застанецца...
— Што застанецца?
— Што-што! Касавокасць!

— Страшную вестку прынёс я ў твой дом, Надзея. Кліч дзяцей...

— Інфаркт мікарду! Вось такі рубец! Ускрыццё паказала...

— Прабачце, што перашкодзіў вам грошы хаваць.

— Ну вось... Дзень узяцця Бастыліі марна прайшоў!

— Ах ты, сучка фарбаваная!
— Чаму ж фарбаваная? Гэта мой натуральны колер!

— Кікімар я не разумею! Пазбаўся ад яе, Надзея!

— Гэта адкуль да нас такога прыгожага дзядзечку замяло? Ці чаго забыўся, сказаць прыйшоў? Вой, гляньце, у вочы не глядзіць: напэўна, двойку атрымаў!

— Дзяўчаты, утаймуйце вашу маці!

— Людк, а Людк! Цьфу! Дзярэўня!

■

■ У свеце жывёл

ПАТРЫМАЦЬ ЗА ХВОСТ... ІЛЬВА!

Незвычайную забаўку прапануе сваім гасцям гатэль Protea Hotel Ranch Resort у правінцыі Лімпапо Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі: прагулку па саване ў кампаніі сапраўдных ільвоў, у тым ліку рэдкіх белых, якіх у свеце налічваецца ўсяго 100 асобін.

У рамках экстрэмальнага атракцыёна, якім і славіцца гэтае мястэчка, наведвальнікам гатэля дазваляецца выгульваць ільвоў без усялякіх падручных сродкаў. А часта нават проста трымаючы вялікую кошку за хвост. Сакрэт бяспекі рызыкоўнай, на першы погляд, задумы заключаецца ў тым, што гэтыя львы нарадзіліся і выраслі ў гатэлі, пастаянна знаходзіліся сярод людзей, да якіх ужо прывыклі і якія іх добра выдрэсіравалі.

Тут жа, у гатэлі, можна адзначыць вяселле ў кампаніі белых ільвоў і зрабіць унікальнае вясельнае фота з царом звяроў.

Варта адзначыць, што экзатычныя прагулкі з каралеўскімі асобамі жывёльнага свету становяцца ўсё больш папулярнымі. Падобныя атракцыёны ёсць таксама ў Замбіі, Мазамбіку і Кеніі. Паміж сабой яны адрозніваюцца хіба што разнастайнасцю відаў ільвоў і іх колькасцю. А смельчакам, якія жадаюць паўдзельнічаць у такой прагулцы, знаўцы ўсё ж рэкамендуюць прытрымлівацца элементарных правілаў бяспекі — напрыклад, не выходзіць на шпацыр з драпежнікамі ў абедзенны час.

БЫК ЗА ПАРУ МІЛЬЁНАЎ

Рэкордная цана была зафіксавана на аўкцыёне буйной рагатай жывёлы ў Індыі — за быка па мянушцы Мур гатовы былі заплаціць 1 870 000 долараў ЗША!

Аднак гаспадар жывёлы, Карамвір Сінгх, у апошні момант адмяніў здзелку. Справа ў тым, што жывёліна з'яўляецца элітным вытворнікам і донарам семені, яно прыносіць уладальніку да 50 тысяч долараў штомесяц. Так што, як той казаў, «такая карова патрэбна самому». Тым больш (праўда, па непацверджаных звестках) перад гэтым Карамвір прадаў брата Мура за 1 340 000 долараў.

Падрыхтаваў Іван КУПАРВАС

НЯДЗЕЛЯ, 25 СТУДЗЕНЯ

БЕЛАРУСЬ 1

7.10 Меладрама «Гэтая жанчына да мяне».
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
9.10 «Арсенал».
9.40, 0.10 Серыял «Каханне ў вялікім горадзе-3».
10.45 "Пра ежу!».
11.20 XXL WOMAN TV.
12.10 Навіны. Цэнтральны рэгіён.
12.35 «Зона Х». Вынікі тыдня.
13.05 Тайны следства.
13.40 Каробка перадач.
14.15 «Terra incognita». Беларусь невядомая.
14.45 Нашы.
15.15 Твой горад.
15.30 Вакол планеты.
16.20 «Вялікі рэпартаж».
16.50 Давярай і правярай.
17.25 Меладрама «Андрэйка».
21.00 Галоўны эфір.
21.55 Навіны надвор'я.
22.15 Меладрама «Дзякуй за каханне».

БЕЛАРУСЬ 2

7.00 Камедыя «Вялікі тата».
8.25 Вышэй за дах.
9.00 М/с «Аватар. Легенда пра Аанга».
9.50 «Fitnews».
10.25 «Зразумець і абясшкодзіць».
11.00, 20.20 Тэлебарометр.
11.05 Анімацыйны фільм «Ледніковы перыяд».
12.40 Біятлон. Этап кубка свету. Эстафета. Мужчыны.
14.10 Дэтэктыў «Сустрэчная плынь».
16.00 Я хачу гэта ўбачыць.
16.35 Кіпень.
16.55 Біятлон. Этап кубка свету. Эстафета. Жанчыны.
18.25 «Comedy Батл». Без межаў».
19.30 Суперлато.
21.00 Спортлато 5 з 36.
21.05 КЕНО.
21.20 Баявік «Тэрмінатар 3: Паўстанне машын».
23.10 Трылер «Вертыкальная мяжа».
1.10 «Перазагрузка». Маладзёжнае ток-шоу.

БЕЛАРУСЬ 3

8.00 «Падзенне Рымскай імперыі». Драма.
10.55 «Подых струн». Музычная праграма. Госць: Андрэй Плясанаў.
11.35, 13.50, 18.10 «Размаўляем па-беларуску».
11.40 «Наперад у мінулае».
12.05 Хіт парад. «Сто песень для Беларусі».
13.00 «Культурныя коды». Дак. фільм.
13.25 «Уладзімір Высоцкі. Беларускі след». Дак. фільм.
14.00 «Гармонік». Камедыя.
14.55 «Салавей». Канцэрт Людмілы Лазарчык і Нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестра Беларусі імя І. Жыновіча.
16.30 «Інтэрвенцыя». Маст. фільм.
18.15, 23.00 «Культпрасвет».
18.50 «Сталёвыя магноліі». Меладрама.
20.45 Калыханка.
21.20 «Аляксей Кортнеў, група «Несчастный случай».
23.35 В. Вярбоўская. «Заўсёды Ваш. Тарыч». Спектакль.

БЕЛАРУСЬ 5

6.05, 12.05, 19.35 Баскетбол. НБА. Вашынгтон — Портленд.
8.15, 1.45 PRO спорт. Навіны.
8.45 Сноўборд. Чэмпіянат свету.
10.10 Біятлон. Этап Кубка свету. Антхольц. Гонка пераследу. Мужчыны.
11.10 Біятлон. Этап Кубка свету. Антхольц. Гонка пераследу. Жанчыны.
13.55 Фрыстайл. Чэмпіянат свету.
16.25 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
17.25 Свет англійскай прэм'ер-лігі.
18.00 Біятлон. Этап Кубка свету. Антхольц. Эстафета. Мужчыны.
21.25 Біятлон. Этап Кубка свету. Антхольц. Эстафета. Жанчыны.
23.00 Фактар сілы.
23.35 Баскетбол. НБА. Аклахома Сіці — Кліўленд.

АНТ

7.00 «Нядзельная раніца».
8.00, 9.00, 16.00 Нашы навіны.
9.05 Нядзельная пропаведзь (з субцітрамі).
9.20 М/с «Смяшарыкі. ПІН-код».
9.35 «Бесталковыя нататкі».
9.55 «Пакуль усе дома».
10.45 «Уладзімір Высоцкі і Марына Уладзі. Апошні пацалунак».
11.45 «ТБ-таксі».
12.10 «Ералаш».
12.25 Серыял «На край свету».
16.15 Навіны спорту.
16.20 «Высоцкі».
20.00 Контуры.
21.05 «Дыханне планеты».
21.35 Да дня нараджэння Уладзіміра Высоцкага. «Свая каляіна».
23.40 Маст. фільм «Сказ пра тое, як цар Пётр арапа жаніў».

СТБ

6.35 «Студэнты 2». Серыял.
7.25, 17.10 «Аўтапанарама».
7.50 Маст. фільм «Каханне па правілах і без».
10.00 «Вялікае снеданне».
10.40, 14.00, 16.50 «Гарады, якія спяваюць».
10.45 «Тэрыторыя памылак».
12.30 «Добры дзень, доктар».
13.05 «Тайны свету».
14.05 «NEXT 2». Серыял.
16.00 «Цэнтральны рэгіён».
16.30 «24 гадзіны».
16.55 «Дарагая перадача».
17.40 Камедыя «Сем нявест яфрэйтара Збруева».
19.30 «Тыдзень».
20.40 Маст. фільм «Сэрцаед».
22.35 «Пякельная кухня-2».
23.50 Трылер «Паляўнічы».
1.30 «На тым жа месцы ў той жа час».
2.35 «Дакументальны праект»: «Марская планета».

МІР

6.00 «Мільён пытанняў пра прыроду».
6.15 М/ф.
9.05 «Ведаем рускую».
10.00, 16.00 Навіны (бягучы радок).
10.10, 1.50 Маст. фільм «Гэта цудоўнае жыццё пасля смерці».
12.05 Серыял «Гандляры».
16.10, 22.00 Серыял «Галіна».
21.00 «Разам».
0.55 Серыял «Маленькія таямніцы вялікіх людзей».
3.45 «Нітка да ніткі».
4.15 Маст. фільм «Сэрцы чатырох».

РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 «Пакой смеху».
7.50 Маст. фільм «Удавец».
11.00, 14.00 Вестк.
11.15 «Сам сабе рэжысёр».
12.10 «Смехапанарама Яўгена Петрасяна».
12.40 «Ранішняя пошта».
13.20 «У свеце жывёл».
14.15 «Кулінарная зорка».
15.10 Маст. фільм «Вам і не снілася...».
16.55 Маст. фільм «Сцерва».
18.35 «Смяяцца дазваляецца».
20.00 Вестк тыдня.
21.55 Маст. фільм «Ты будзеш маёй».
23.45 «Нядзельны вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

НТБ—БЕЛАРУСЬ

6.05 Серыял «Гончыя».
6.50, 8.20 Серыял «Дарожны патруль».
8.00, 10.00, 13.00 Сёння.
8.50 «Медыцынскія тайны».
9.25 «Ядзім дома».
10.20 «Першая перадача».
11.05 «Цуд тэхнікі».
11.50 «Дачны адказ».
13.20 Серыял «Дзяржаўная абарона».
15.55 Маст. фільм «Двайны блюз».
17.30 «Першая кроў».
18.00 «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
19.00 «Сёння. Падагульняючая праграма».
20.00 Серыял «Паляўнічыя на галовы».
23.50 «Спіс Норкіна».

8 КАНАЛ

9.00, 14.45, 18.50, 21.00, 23.15 «Надвор'е».
9.05 Мультпарад.
10.00 «Адшукваецца адпачынак».
10.30 Прыгоды «Другая кніга джунгляў».
12.05 Камедыя «Вялікія гонкі».
14.50 Баявік «Вайна».
16.30 «МакаShow».
16.50 «Сёння клюе».
17.20 «Тэлемагазін».
18.00 «Хобі TV».
18.55 Фантастыка «Час».
20.50 «Вечарніца».
21.05 Трылер «Спакуса».

ВТВ

6.00 «PLAY».
8.30 М/ф «Смяшарыкі».
9.00 Серыял «Татавы дочкі. Нявесты».
10.00, 2.00 «Турбаміксер».
12.00 «Паспець за 24 гадзіны».
12.30, 22.30 Скетч-шоу «6 кадраў».
13.00 «Я падаю на развод».
14.00 Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
15.00 Серыял «Супер Макс».
16.30 Меладрама «Фатальная красуня».
18.40, 22.40 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
19.00 «Уральскія пельмені».
20.30 Фантастыка «Філосафы: урокі выжывання».
23.30 «Нерэальная гісторыя».
0.00 «Людзі Хэ».
0.30 «Лаві момант».
1.00 Скетч-шоу «Валера-ТБ».

КУЛЬТУРА

6.30 «Еўраньюс».
10.00 «Звычайны канцэрт».
10.35 «Ва ўладзе золата». Маст. фільм.
12.10 «Легенды сусветнага кіно». Алег Даль.
12.40 Расія, любоўю мая! «Комі-пермякі. Спадчына старажытнай культуры».
13.05 Геніі і ліхадзеі. Валяр'ян Зубаў.
13.35, 1.55 «Барацьба за выжыванне». Дак. фільм.
14.30 «Пешшу...». Масква клубная.
14.55 «Што рабіць?».
15.45 Simply Red. Канцэрт на Кубе.
16.45 «Хто там...».
17.15 «Шукальнікі». «Куфар імператрыцы».
18.00 «Кантэкст».
18.40 Хрустальны баль «Хрустальнай Турандот» у гонар Іны Чурыкавай.
20.30 Да 70-годдзя вялікай Перамогі. «Вайна на ўсіх адна».
20.45 «Я родам з дзяцінства». Маст. фільм.
22.10 Памяці Алены Абразцовай. «Жыццё як карыда». Дак. фільм.
23.00 Алена Абразцова, Пласіда Дамінга ў фільме-оперы Франка Дзефірэлі «Сельскі гонар».
0.20 «Першыя людзі на Месяцы». Маст. фільм.
1.50 «Ікар і мудрацы». М/ф для дарослых.
2.50 «Вільгельм Рэнтген». Дак. фільм.

НАСТАЛЬГІЯ

6.00 Дак. фільм «Аліса Фрэйндліх. Выбранае».
7.00, 15.35, 23.40, 1.00 Канцэрт замежнай эстрады.
7.20 Тэлефільм «Следства вядуць знатакі».
9.00, 3.00 «Час».
10.00 «Колба часу».
11.00 Праграма «Погляд». 1988 год. 1-я частка.
12.00 «Ранішняя пошта». 1988 год.
12.45 «Пакуль усе дома». 1992 год.
13.15 «Канцэрт у гонар Артыста». Юбілейны вечар народнага артыста СССР А. Райкіна. 1987 год.
15.00 «Што сказана, тое сказана...». Спявае Юрый Лаза. 1991 год.
16.00 Тэлеспектакль «Усяго некалькі слоў у гонар спадара дэ Мальера». 1973 год.
18.00 Дак. фільм «Уладзімір Высоцкі. Маналог».
19.00 «Ні хвіліны спакою...». Творчы вечар кампазітара Вячаслава Дабрыніна. 1990 год.
20.50 Капітал-шоу «Поле цудаў». 1991 год.
21.35 Фільм-канцэрт «20 хвілін з «Песнярамі». 1980 год.
22.00 Маст. фільм «Фізікі».
0.00 Дак. фільм «Першы прэзідэнт». Частка другая.
1.20 Тэлеспектакль «Спяшайцеся рабіць дабро». 2-я серыя. 1982 год.
2.30 М/ф «Пластылінавая варона».
2.40 «Маленькі канцэрт» .
4.00 «Народжаныя ў СССР».
5.00 Праграма «ТЭМА» з У. Лісцьевым: «Праблемы эміграцыі». 1993 год.
5.45 Фільм-канцэрт «Спявае Івіца Шэрфезі».

EUROSPORT

3.00, 5.00, 12.45, 23.30 Тэніс. Турнір Вялікага шлема. Адкрытае першынство Аўстраліі.
12.30 Тэніс.
16.15, 23.00, 2.30 Тэніс. Гейм, Сэт і Матс.
16.30 Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны.
17.00 Біятлон. Кубак свету. Жанчыны. Эстафета.
18.30 Біятлон. Кубак свету. Мужчыны. Эстафета.
19.30 Скачкі на лыжах з трамплiна. Кубак свету.
20.45 Футбол. Кубак афрыканскіх нацый.

КАМЕДЫЯ

6.00, 10.10, 14.35, 3.10 Серыял «Маё вялікае армянскае вяселле».
6.50 Камедыя «Я вяртаюся да мамы».
8.15, 9.55, 14.00 «Камедыянты. Лепшае».
8.30 Меладрама «Пастка для нявесты».
11.05 Камедыя «Дзейнічай, сястра!».
12.45 Камедыя «Невынішчальны шпіён».
14.15, 17.10, 19.45, 21.40, 0.55, 2.50, 5.40 Скетчком «Паміж намі».
15.25 Камедыя «Дзейнічай, сястра 2. Старыя звычкі».
17.30, 22.00 Серыял «Былыя».
18.20 Камедыя «Таймшэр».
20.20 Камедыя «Няўдачлівыя».
23.10 Камедыя «Сверб сёмага года».
1.15 Прыгоды «Прыкінься маім мужам».
4.05 Камедыя «Хросныя бацькі».

ТБ3

6.00 М/ф.
10.15, 5.15 «Свая праўда».
11.10 «Паненка і кулінар».
11.40, 2.00 «Тайны следства». Серыял.
15.10 «Жонка. Гісторыя кахання».
16.30 «Сто пытанняў даросламу».
17.15 «Без падману».
18.00 «Доказ віны».
18.30 Маст. фільм «Каралеўства поўнага месяца».
20.10 «Наваражыце мне жыццё». Дак. фільм.
21.00 Маст. фільм «Заганная страсць».
23.00 «Асцярожна, махляры!».
23.30 «Часова даступны».
0.25 «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

ТБ1000

6.30 Драма «Дарыян Грэй».
8.30 Драма «Машына Джэйн Мэнсфілд».
10.45 Драма «Рэйчэл выходзіць замуж».
12.45, 3.45 Драма «Мы — адна каманда».
15.00 Драма «Месца пад хвоямі».
17.30 Фантастыка «Галодныя гульні».
20.00 Драма «Разня».
21.30 Драма «Самая п'яная акруга ў свеце».
23.30 Драма «Язмін».
1.30 Трылер «Чырвоны дракон».

ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

6.20 Прыгоды «Рыжык у Залюстроўі».
8.30 Меладрама «Каханне без страхоўкі».
10.10 Трагікамедыя «Рэпетыцыі».
12.00 Дэтэктыў «Вяртанне рэзідэнта».
14.30 Камедыя «Вострaў шанцавання».
16.00 Баявік «Бой з ценем 3D: Апошні раўнд».
18.10 Камедыя «Прывітанне, я ваш тата!».
20.20 Драма «Нябесны суд».
22.00 Камедыя «Аднакласнікі». ru: НаCLICKай удачу».
23.50 Драма «Размова».
1.10 Дэтэктыў «Забойства на 100 мільёнаў».
3.10 Драма «Вышыня 89».
5.00 Камедыя «Свята пад замком».

NATIONAL GEOGRAPHIC

6.00 Сканеры старажытнага свету.
6.43 Скарбашукальнікі.
7.28 Паядынак непераможных.
8.13 Гульні розуму.
8.35 Займальная навука.
8.57 Навуковыя недарэчнасці.
9.19 Зрабі або памры.
9.42 Космас: Прастора і час.
10.27 Рэальнае паранармальнае.
11.11 Навука будучыні Стывена Хокінга.
11.56 Больш чым фокусы.
12.41, 16.28 Кіраванне натоўпам.
13.27 Абаронцы культурнай спадчыны.
14.12 Генералы — Частка 2.
14.57 Народжаны поўзаць — лятаць можа!
15.43 Дзікая прырода Амазонкі.
17.13 Гульня ў лікі.
19.29 Непаражальныя канструкцыі.
20.15, 2.17, 5.15 Фашысцкі лагер смерці.
21.00, 0.47, 3.46 Апакаліпсіс: Другая сусветная вайна.
22.31 Фатальная стыхія.
23.16, 3.02 90-я: дзесяцігоддзе, якое нас аб'яднала.

DISCOVERY

8.00 Паляўнічыя на рэліквіі — ламбард.
8.50, 2.20 Бітва за нерухомасць.
9.40 Бітвы за кантэйнеры.
10.30, 4.00 Чыгунка Аляскі.
11.20 Хлопцы з Юкана.
12.10 Мяцежнікі ледзянога возера.
13.00 Голыя і напалоханыя.
13.50, 3.10 Экстрэмальныя выхадныя.
14.40 Востраў.
15.30, 22.10 Не спрабуйце паўтарыць.
16.20, 18.00, 23.00, 5.15 Эфект Карбанара.
17.10, 23.50 Невытлумачальнае.
20.30 Дамы на дрэвах.
21.20 Акварыумны бізнес.
0.40 Стальныя мышцы.
1.30 Хуткія і гучныя.
4.50 Маланкавыя катастрофы.

■ Выпрабавана на сабе

ЗЛАЧЫНСТВА... БЕЗ ПАКАРАННЯ

Карэспандэнт «Звязды» перажыў амаль тое ж самае, што Раскольнікаў і некаторыя іншыя героі Дастаеўскага

Вой, толькі не падумайце, бабульку-працэнтшчыцу я не забіваў. Тым не менш раптам пабагацеў: на цэлых 9 мільёнаў. Але недзе праз тыдзень пасля перажыванняў ды згрызот сумлення вярнуў тыя грошы. Што цікава, у дні душэўных пакут пазнаёміўся і з сучаснай… Сонечкай Мармеладавай. Дзяўчына, на жаль, не ацаніла высакародны ўчынак. Дарэчы, толькі адзін чалавек сказаў, што нябёсы за ўсё адплацяць, бо дабрыня вяртаецца. А астатнія часцей за ўсё круцілі пальцам ля скроні: сумленнага чалавека палічылі дурнем.

НЕ МОЖА БЫЦЬ? МОЖА!

Не буду падрабязна апісваць, як мне замест 1 мільёна рублёў выдалі цэлых 10. Толькі адзначу, што напярэдадні навагодняга свята брат, які не жыве ў Віцебску, перадаў грошы. На жаль, не асабіста. Дамовіліся, што ён пакіне іх у канторы. «Навар» апошняй за дапамогу — некалькі працэнтаў ад сумы. Калі я прыйшоў, «працэнтшчыца» выдала мне пачак грошай. Пры гэтым, што здзівіла — не запісала нават пашпартныя звесткі, нідзе не папрасіла распісацца. Больш за тое, ёй у той момант, калі я збіраўся пералічыць грошы, патэлефанавалі, і жанчына папрасіла мяне пакінуць памяшканне, каб не перашкаджаў…

Паехаў дадому. Паколькі часу было ў абрэз (трэба было нешта па працы дарабіць, сына адвесці на гурток), грошы пералічыў толькі бліжэй да поўначы. Купюры былі 100-тысячныя. 100 памнажаем на 100 — гэта… Вам смешна, а мне ніяк не верылася, што ў руках 10 мільёнаў замест аднаго.

Калі зразумеў, што грошай у 10 разоў больш, чым трэба, аж пот выступіў на лбе. Відаць, лёс падзякаваў за нешта добрае? У галаве адразу ж закруціліся думкі пра тое, што ўрэшце куплю камеру для «Скайпа», люстру новую… Ды чаго толькі не надумаў купіць сабе і дзецям. Дакладна, лішніх мільёнаў не хапіла б…

Але потым вырашыў аддаць тыя грошы… Цягнула на месца «злачынства», як Раскольнікава. Толькі з-за святочных дзён тая кантора не працавала… Не спаў некалькі начэй, бо ўсё думаў і перажываў.

У выніку вырашыў, што ў першы раз у жыцці… згуляю ў казіно. Мо, патраціўшы трохі чужых грошай, зарабіць змагу на выйгрышы? У казіно адчуў сябе ў шкуры галоўнага героя рамана Дастаеўскага «Ігрок». Высветлілася, што я, як і той Аляксей Іванавіч, вельмі азартны чалавек. Патраціў я 1 мільён рублёў, выйграў… 800 тысяч. Ніколі не гуляйце ў казіно!

ДАБРЫНЯ І ІСЦІНА ВЫРАТУЮЦЬ СВЕТ

Пасля казіно, каб вярнуць 9 мільёнаў, трэба было дакласці свае 200 тысяч кроўных! Вырашыў, што вярну ўсё роўна, і ні тысячы сабе не вазьму.

Перад гэтым успомніліся дзве гісторыі, якія канчаткова пераканалі мяне ў тым, што трэба застацца сумленным чалавекам.

Амерыканскі бяздомны вярнуў жанчыне заручальны пярсцёнак з дыяментам, які тая незнарок высыпала разам з дробяззю. Бландзінка, убачыўшы на вуліцы мужчыну, які прасіў на жыццё, выпадкова кінула ў кубак для ахвяраванняў разам з манетамі пярсцёнак. Яна, калі зразумела, дзе можа быць упрыгожанне, на наступны дзень падышла да бяздомнага. Калі запытала пра пярсцёнак, той вярнуў… Каханы прыгажуні прапанаваў у знак падзякі арганізаваць праз інтэрнэт збор сродкаў для сумленнага бяздомнага. Сам жа паклаў на рахунак 20 долараў. У выніку з многіх краін свету людзі пачалі пералічваць грошы. І ўжо праз пару дзён больш за 6000 чалавек ахвяравалі каля 150 тысяч долараў (!). Калі сумленнага бяздомнага запыталі, чаму ён вярнуў заручальны пярсцёнак, бо мог жа прадаць, адказаў, што верыць у Бога, і дадаў, што яго так выхаваў дзед-святар.

Бяздомны з Маскоўскай вобласці, які вярнуў кашалёк.

А бяздомны з Маскоўскай вобласці знайшоў і аддаў масквічцы кашалёк, у якім, акрамя 1000 расійскіх рублёў, знаходзіліся банкаўскія карткі і PIN-коды, пашпарт, правы, медыцынскі поліс і іншыя дакументы. Бяздомны па пашпарце знайшоў адрас дамы і вярнуў згубленае.

«…Той мужчына, Сяргей, пагадзіўся трохі паесці, а таксама ўзяць невялікую суму. У таксі ён садзіўся са слязамі на вачах, бо не мог паверыць, што гэта сапраўды для яго,— здзіўлялася жанчына, расказваючы журналістам пра добрага бяздомнага.— Ён выратаваў не толькі мае дакументы, ён выратаваў мяне. Я першы раз сустрэла такога чалавека і зразумела, што ў нас ёсць пасапраўднаму добрыя людзі. Пасля сустрэчы з ім я паверыла ў людзей. У нас жа цяпер усе хочуць зарабіць. А гэты чалавек не толькі нічога не прасіў, але проста катэгарычна адмаўляўся ад грошай»…

Карыстальнікі сацыяльных сетак імгненна распаўсюдзілі гэтую гісторыю. Людзі, кранутыя паводзінамі Сяргея, сталі прапаноўваць сваю дапамогу. Некаторыя заявілі пра гатоўнасць купіць яму новую куртку. Іншыя сталі заклікаць астатніх скінуцца на кватэру…

І ЗА «ДЗЯКУЙ» ДЗЯКУЙ

Калі я пра сваю «знаходку» напісаў на электронны адрас канторы, дзе мне далі лішнія грошы, у адказе намякалі на тое, што падзякуюць і матэрыяльна. У выніку жанчына, якая на некалькі дзён зрабіла мяне багацеем, прызналася, што не ведае, як такое здарылася. Павіншавала са святамі — і ўсё…

Ужо потым, каб праверыць рэакцыю, я пачаў расказваць знаёмым пра тое, што адбылося са мной. Адны раілі мне больш такога не рабіць, бо ўсё роўна не ацэніць ніхто. Іншыя гаварылі, што я дурань з-за таго, што не купіў долары адразу, як атрымаў грошы. Бо нават за тыдзень мог бы зарабіць на скачках кошту валюты. У іх вачах я, відаць, стаў падобным на ідыёта з аднайменнага рамана Дастаеўскага. Не паверыце, пазнаёміўся нядаўна з сучаснай прадстаўніцай таго «тыпу» дам, якія да рэвалюцыі зараблялі на жыццё па жоўтым білеце. Соня Мармеладава XXI стагоддзя сказала, што… ёй гэта не цікава. А па вачах я зразумеў, што таксама асуджае мой учынак.

Аляксандр ПУКШАНСКІ



Амерыканскі бяздомны, пярсцёнак і яго ўладальніца.

А ЯК З ПУНКТУ ГЛЕДЖАННЯ ЗАКОНУ? ШТО БЫЛО Б, КАЛІ Б «ПРАЦЭНТШЧЫЦА» ЗВЯРНУЛАСЯ ПА ДАПАМОГУ Ў МІЛІЦЫЮ?

Гісторыю пракаментавалі ў пракуратуры Віцебскай вобласці:

Апісаныя праваадносіны рэгулююцца раздзелам 59 Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь «Абавязацельствы з прычыны беспадстаўнага ўзбагачэння».

Асоба, якая без вызначаных заканадаўствам або здзелкай падстаў набыла або зберагла маёмасць за кошт іншай асобы, абавязана вярнуць апошняй беспадстаўна набытую або захаваную маёмасць (беспадстаўнае ўзбагачэнне).

Названыя правілы прымяняюцца незалежна ад таго, ці з'явілася такое ўзбагачэнне вынікам паводзін набытчыка маёмасці, самога пацярпелага, трэціх асоб, або адбылося не па іх волі.

Варта мець на ўвазе, што не падлягаюць вяртанню ў якасці беспадстаўнага ўзбагачэння заработная плата, пенсіі і іншыя грашовыя сумы, дадзеныя грамадзяніну ў якасці сродку да існавання, пры адсутнасці нядобрасумленнасці з яго боку і падліковай памылкі.

У нашым выпадку гаворка ідзе менавіта пра падліковую памылку чалавека, які выдаў грашовыя сродкі кліента. У сувязі з гэтым грошы павінны быць вернуты.

У іншым выпадку надыходзіць грамадзянска-прававая адказнасць, і сума спаганяецца ў судовым парадку.

■ Неасабісты суб'ектыў

СЛЯЗІНКА ДЗІЦЯЦІ

Хто яе заўважыць, калі малое яшчэ не ходзіць у садок?

СТАРЫ Новы год прынёс навіну, ад якой сэрца сціснулася, пахаладзела і ўжо вось амаль суткі не можа адагрэцца. Упэўнена, прыблізна тое самае адчуваюць многія жанчыны, якія мелі няшчасце даведацца пра падрабязнасці жудаснай знаходкі ў Гомелі. Так, я пра яе — пра маленькае цельца трохмесячнай дзяўчынкі, якое праляжала ў сваім ложачку ў замкнутай кватэры паўгода і за гэты час ператварылася ў мумію.

Колькі б яно яшчэ там ляжала — невядома, калі б не яшчэ адно няшчаснае дзіця. Немаўля, якому некалькі тыдняў, падкінулі ў пад'езд гомельскага шматпавярховіка. Людзі, якія знайшлі хлопчыка, адразу заявілі ў міліцыю. Пачалі разбірацца, і па бірцы з радзільні, якая была на руцэ малога, хутка высветлілі, хто ж яго біялагічная маці. Высветлілася — маці шматдзетная, за свае трыццаць і адзін год нарадзіла ўжо пяцярых. Што зусім не перашкаджае ёй п'янстваваць, лайдачыць, карацей, «весці асацыяльны лад жыцця». Трох старэйшых дзяцей выхоўвае іх бабуля, якая прапашчую дачку амаль не бачыць, нават у міліцыю звярталася з просьбай адшукаць, дзе яна бадзяецца… І тут паўстала пытанне: а дзе ж яшчэ адно дзіця — дзяўчынка, народжаная ў лютым мінулага года? Паехалі ў маласямейку на раёне Сельмаш, дзе раней жыла гора-мамка з сужыцелем, узламалі дзверы — і застылі ад жаху, убачыўшы высахлае цельца ў ложку.

Цяпер «бацькі» (без двукосся ў гэтым выпадку ніяк не пішацца), апраўдваюцца: пакінулі, маўляў, у маі ў кватэры жывое дзіця, спадзяваліся, што суседзі пачуюць плач, самі ўжо паўгода там не з'яўляліся. У следчых іншая версія: у тым жа маі дзіця падчас сямейнай сваркі задушыў бацька; сыходзячы з кватэры, яны ведалі, што пакідаюць мёртвую дачку.

ШТО б там ні было на самой справе — ніводзін з гэтых варыянтаў не ўпісваецца ў нашу такую прыстойную і правільную рэчаіснасць, у якой клопат пра дзяцей — зусім не пустыя словы, а канкрэтныя справы, у якой усмешкі малых і цёплыя вочы дарослых — кожны дзень і на кожным кроку. У якой маленькі чалавечак трапляе пад апеку яшчэ да свайго з'яўлення на свет, у якой смяротнасць немаўлят дзякуючы наладжанай сістэме гэтай апекі — адна з самых нізкіх у свеце… Маленькае высахлае цельца з гомельскага раёна Сельмаш, атрымліваецца, ставіць пад сумненне ўсе гэтыя паняцці, якія ў нашым грамадстве на працягу сама меней апошняга дзесяцігоддзя ўспрымаюцца ўжо як аксіёма?

Гэтая жудасная і, дзякаваць Богу, адзінкавая, нетыповая, «няняская» трагедыя паставіла рубам пытанні, на якія нам усім тэрмінова трэба знайсці дакладныя адказы, каб яна так і засталася адзінкавай і нетыповай. Я маю на ўвазе нават не чалавечую абыякавасць (пагадзіцеся, першае, што хочацца спытаць: дзе былі суседзі, дзе была тая самая бабуля?). Зусім верагодна, што суседзі — гэткія самыя гулякі і выпівохі, якім абсалютна няма справы да таго, плача дзіця за сцяной ці раптоўна змоўкла. Зусім верагодна, што бабуля, ужо немаладая жанчына з траімі малымі дзецьмі на руках, штодня б'ецца як рыба аб лёд, каб гэтыя трое былі накормленыя і апранутыя; зусім верагодна, што яна не ведала, што ў дачушкі, якая дзесь валэндаецца, нарадзілася яшчэ адно…

Цяпер трэба адказаць на іншае пытанне, у гэтым канкрэтным выпадку — самае галоўнае: дзе былі ўсе тыя людзі, якія не па маральным — па службовым абавязку павінны былі цікавіцца лёсам дзіцяці ў праблемнай сям'і? Бо недавяркі, якія пакінулі малую мёртвай ці — яшчэ горш! — жывой у замкнёнай кватэры, пачалі «злоўжываць спіртным і весці асацыяльны лад жыцця» не ўчора і не месяц назад, сведчанне таму — трое кінутых імі старэйшых дзяцей. Дзе былі сацыяльныя службы, органы апекі, участковы, нарэшце? Не на хутары, не ў глухой вёсцы — у абласным цэнтры. «Бацькі» бясследна прапалі з мая? Але ж цяпер іх знайшлі вельмі хутка, яны, атрымліваецца, і не хаваліся нідзе, проста не было патрэбы іх шукаць?

РАЗВАЖАЮЧЫ над гэтым, я ў «парадку эксперымента» патэлефанавала хроснай дачцэ, якая, медык па адукацыі, цяпер сядзіць з малым у дэкрэтным. Дэталёва распытала, што і як цікавіцца яе сынам, якому сем месяцаў. Першы месяц іх наведвала патранажная медсястра, якая заходзіла кожны тыдзень. А пасля, калі дзіцятка беспраблемнае і здаровае, усё пакідаецца фактычна на сумленне бацькоў. Так, у ідэале, кожны месяц маці з малым павінна з'яўляцца ў паліклініцы, хаця б да года. А калі не з'явіцца? «Ну, вось нам на прышчэпку чарговую трэба было ісці ў канцы снежня, але мы тады з'ехалі да свекрыві на свята і дагэтуль у паліклініку не выбраліся. І ніхто пакуль не тэлефанаваў…» А калі нават патэлефануюць або пазвоняць у дзверы і ніхто не адкажа, і не адчыніць? «Ведаеш (гэта яна мне ўжо не як маці, а як урач адказала), наўрад ці хто з нашых пойдзе гаварыць пра гэта ў міліцыю ці яшчэ куды. Першыя тры месяцы, калі самыя важныя прышчэпкі робяцца,— яшчэ магчыма. А пасля… Мы ж не абавязаны паведамляць кудысьці пра адсутнасць бацькоў і малога. А на ўчастку колькі дзяцей! Хто ж іх зможа кантраляваць?»

Вось, здаецца, і знайшлася слабая шасцярэнька ў такім адладжаным механізме. Калі малое не з'явіцца ў групе ці класе або з'явіцца з заплаканымі вачыма і сінякамі — у выхавальніка і настаўніка ёсць усе падставы біць трывогу. А вось лёсам дзіцяці ў самым кволым узросце, пачынаючы з двух-трох месяцаў ад нараджэння і да яго з'яўлення ў дзіцячым садку, цікавяцца (без «сігналаў» ад суседзяў, напрыклад, а па ўласнай ініцыятыве і службовым абавязку) вельмі мала або не цікавяцца ўвогуле. Хто павінен цікавіцца: педыятр, участковы, супрацоўнік органа апекі? Ключавое слова тут — «павінен», а хто менавіта, ужо не так важна. Але гэта, напэўна, трэба вельмі дакладна прапісаць у нейкім нарматыўным акце. Іх, гэтых актаў, у нас ужо і так ці не зашмат? Але, пагадзіцеся, каб усё было так дасканала, як хочацца думаць, не ляжала б маленькае цельца ў кватэры ў вялікім горадзе паўгода…

ІВАН Карамазаў — адзін з самых страшных і падступных герояў Дастаеўскага — і той адмаўляўся ад пазнання вышэйшай гармоніі і таямніц сусвету, калі за гэтым пазнаннем стаіць «слязінка хоць аднаго замучанага дзіцяці». А мы, законапаслухмяныя, сумленныя і шчырыя, гэтых слязінак проста не заўважаем? Ці заўважаць не хочам?

Алена ЛЯЎКОВІЧ

■ Суседзі па планеце

БЫЛІ Б ГРОШЫ І ЖАДАННЕ

Наша краіна ратыфікавала пагадненні аб адмене віз з Бразіліяй і Эквадорам

Наша дзяржава завяршыла ўнутраныя працэдуры па ратыфікацыі пагадненняў аб адмене віз з Бразіліяй і Эквадорам. Самі рашэнні былі прыняты ў лістападзе 2013 года і ў чэрвені 2014 года адпаведна. А ў канцы мінулага — парламент ратыфікаваў пагадненні аб адмене віз з Бразіліяй і Эквадорам. Тэксты абодвух пагадненняў ужо апублікаваны на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале.

У дакуменце аб адмене віз з Бразіліяй гаворыцца, што «ўрады абедзвюх краін, жадаючы гарантаваць прынцып узаемнасці і забяспечыць бязвізавыя паездкі грамадзян абедзвюх дзяржаў, а таксама для далейшага развіцця сяброўскіх адносін і працягу ўмацавання цесных сувязяў дамовіліся, што грамадзяне Беларусі і Бразіліі, якія маюць сапраўдныя дакументы для выезду за мяжу, могуць уязджаць, выязджаць, ехаць транзітам і знаходзіцца на тэрыторыі другой дзяржавы з турыстычнымі ці дзелавымі мэтамі без віз на працягу перыяду, што не перавышае 90 дзён у каляндарным годзе з даты першага ўезду». Названы перыяд можа быць прадоўжаны адзін раз на тэрмін да 90 дзён кампетэнтнымі органамі прымаючай дзяржавы.

Таксама пагадненнем прадугледжана, што грамадзяне абедзвюх дзяржаў абавязаны атрымаць неабходную візу ў адпаведнасці з заканадаўствам, калі яны маюць намер знаходзіцца на тэрыторыі другой дзяржавы на працягу перыяду, які перавышае 90 дзён.

Дакумент уступіць у сілу праз 90 дзён з даты атрымання па дыпламатычных каналах апошняга пісьмовага паведамлення аб выкананні Беларуссю і Бразіліяй унутрыдзяржаўных працэдур, неабходных для гэтых мэт.

Што да адмены віз з Эквадорам, то ўладальнікі сапраўдных праязных дакументаў вызваляюцца ад неабходнасці атрымання віз для ўезду, выезду і транзіту па тэрыторыі дзяржавы іншага боку пры ўмове, што «працягласць іх бесперапыннага знаходжання на тэрыторыі гэтай дзяржавы не перавышае 30 дзён з даты ўезду». Пры гэтым агульная працягласць іх знаходжання не павінна перавышаць 90 дзён на працягу аднаго каляндарнага года.

У пералік дакументаў, неабходных для ўзаемных бязвізавых паездак, для беларусаў увайшлі пашпарт, пасведчанне на вяртанне ў Беларусь, нацыянальнае пасведчанне асобы марака і пасведчанне члена экіпажа паветранага судна. Для грамадзян Эквадора — звычайны пашпарт, пасведчанне на вяртанне, спецыяльны пашпарт.

У дакуменце таксама гаворыцца, што грамадзяне, якія маюць намер знаходзіцца бесперапынна на тэрыторыі дзяржавы іншага боку звыш 30 дзён, за выключэннем членаў экіпажаў транспартных сродкаў, што выконваюць міжнародныя перавозкі грузаў і пасажыраў, абавязаны атрымаць візы ў парадку, прадугледжаным заканадаўствам.

У Андах ёсць месцы, дзе ўсталяваны спецыяльныя збудаванні для аматараў экстрыму: тросы для «палётаў» над прорвай, вагончыкі для паездак над прыгожымі вадаспадамі…

Дадзенае пагадненне ўступіць у сілу праз 30 дзён з дня атрымання па дыпламатычных каналах апошняга пісьмовага паведамлення аб выкананні Беларуссю і Эквадорам унутрыдзяржаўных працэдур, неабходных для гэтага.

* * *

Дарэчы, гэты накірунак нашы турфірмы не абмінаюць увагай, і, акрамя Эквадора і Бразіліі, беларускім турыстам можна наведаць Венесуэлу, Мексіку, Балівію, Калумбію, Коста-Рыку і Аргенціну. Кошт пуцёўкі ў Эквадор з Мінска вагаецца ад 1670 да 6000 долараў. Як патлумачылі ў адной з турфірм, што арганізоўваюць паездкі ў гэту краіну, накірунак вельмі цікавы, а ў суседняй Расіі ён нават вельмі папулярны. Цана ж залежыць і ад віду тура, і ад яго працягласці, і ад таго, якой авіякампаніяй ляціць падарожнік. Тое ж самае і з Бразіліяй, тыднёвы тур будзе каштаваць прыкладна ад 1700 долараў.

Надзея ЮШКЕВІЧ

■

■ Прэс-экспрэс

ДОЎГАЯ ДАРОГА ДА ДЖЫХАДУ

Як еўрапейцы папаўняюць шэрагі баевікоў-ісламістаў

Нядаўнія тэракты ў Парыжы зноў прымусілі Захад задацца пытаннем: што рабіць з тымі еўрапейцамі, хто адправіўся на вайну ў Сірыю і ў Ірак, а потым вярнуўся дадому? Расстрэл журналістаў і захоп закладнікаў паказаў, што гэтыя людзі смяротна небяспечныя. За мінулыя гады ісламісты пры патуранні Лондана, Парыжа, Берліна і Бруселя, якія захапіліся гульнямі ў вялікую блізкаўсходнюю палітыку, стварылі на тэрыторыі еўрапейскіх дзяржаў сетку вербавальных ячэек і наладзілі каналы перапраўкі добраахвотнікаў.

Пачатак «вялікага шляху»

Большасць будучых джыхадыстаў — маладыя выхадцы з ісламскай дыяспары, дзеці і ўнукі імігрантаў-мусульман, якія прыбылі ў Еўропу з краін другога і трэцяга свету ў пошуках лепшай долі. Як правіла, іх бацькі ўпарта працавалі і, усведамляючы нетрываласць свайго становішча, усімі сіламі пазбягалі канфліктаў з законам. Другое-трэцяе пакаленне дыяспары адчувае сур'ёзны крызіс ідэнтычнасці. Нашчадкі мігрантаў, з аднаго боку, растуць ужо ў іншым, заходнім грамадстве, пераймаючы яго звычкі і лад жыцця; з другога — яны не могуць цалкам упісацца ў грамадства, па-ранейшаму застаючыся для мясцовых чужынцамі. На гэта накладваюцца юнацкі максімалізм і авантурызм, жаданне знайсці сабе месца ў свеце і ідэю, дзеля якой варта жыць. Падобныя матывы рухаюць і іншай значнай групай — этнічнымі еўрапейцамі, якія прынялі ісламскую. Як і ўсе неафіты, яны вылучаюцца асаблівым энтузіязмам.

А ў Еўропе хапае тых, хто накіроўвае іх запал у патрэбнае рэчышча: практычна кожная буйная тэрарыстычная арганізацыя — «Талібан», «Ісламская дзяржава», «Аль-Каіда» — мае сваю сетку вярбоўшчыкаў у заходніх краінах. Як правіла, яны выдатна валодаюць тэхнікай, што прымяняецца ў дэструктыўных сектах, і, дзейнічаючы пры мячэцях і ва ўніверсітэцкіх гуртках, адсочваюць моладзь, што праяўляе цікавасць да ісламу. Джыхад вярбоўшчыкі малююць самымі вясёлкавымі фарбамі. Маўляў, сярод баевікоў пануе дух таварыства і братэрства, яны поўныя веры ў свае ідэалы і дзейнічаюць у імя агульнай мэты. Іх смерць — пакутніцтва ў імя Алаха, і пасля гібелі ўсе трапляюць у рай. Гэтай прывабнай перспектыве супрацьпастаўляецца беспрасветнае існаванне ў грамадстве спажывання, якое загнівае, з абавязковай выплатай падаткаў, на якія праводзяцца чарговыя ваенныя аперацыі супраць тых, хто змагаецца за перамогу ісламу.

Нярэдка будучыя джыхадысты, нагледзеўшыся ролікаў у інтэрнэце, самі свядома шукаюць вярбоўшчыкаў, цвёрда вырашыўшы адправіцца ў Сірыю або Ірак. Ісламісты актыўна ўжываюць сучасныя тэхналогіі, вядуць поўнамаштабную прапаганду ў сацыяльных сетках. Асабліва вылучаецца ў гэтым плане «Ісламская дзяржава»: яе рэкламныя ролікі, у якіх прадумана кожная дэталь, нагадваюць трэйлеры да галівудскіх фільмаў. Эксперты не выключаюць, што ў сумна вядомым відэа з пакараннем смерцю журналіста Фоўлі адзін з тэрарыстаў — 23-гадовы рэпер Джыхад Джон — наўмысна падкрэсліваў свой брытанскі акцэнт, дэманструючы, што падданых Злучанага Каралеўства будуць рады бачыць у шэрагах баевікоў Ісламскай Дзяржавы Ірака і Леванта (ІДІЛ).

Знішчыць такія вербавальныя сеткі вельмі складана: мусульманскія суполкі — гэта добраахвотныя гета, куды неахвотна пускаюць старонніх. Вядома, у вартавых парадку ёсць свае інфарматары, але іх відавочна недастаткова. Замінае і вялікая палітыка: Захад не першы год

падтрымлівае сірыйскую апазіцыю, і паліцыя вымушана заплюшчваць вочы на тых вярбоўшчыкаў, якія набіраюць добраахвотнікаў для Свабоднай Сірыйскай арміі, якая лічыцца памяркоўнай, што, натуральна, зніжае эфектыўнасць барацьбы з вярбоўшчыкамі ісламістаў.

Наступная задача завербаваных джыхадыстаў — дабрацца да месца джыхаду. Як правіла, маршрут узгадняецца з вярбоўшчыкам і праходзіць праз Турцыю ці Іарданію. Абедзве краіны маюць з Сірыяй сухапутную мяжу, праз якую ідуць бежанцы, супрацоўнікі гуманітарных арганізацый і кантрабандысты. Для тых, хто жадае далучыцца да ІДІЛ у Сірыі, бліжэйшы — турэцкі маршрут, для ахвотных паваяваць у Іраку — іарданскі: ІДІЛ кантралюе значныя ўчасткі мяжы з гэтымі краінамі. «Фронт ан-Нусра» папаўняецца ў Турцыі, Свабодная Сірыйская армія — і ў Турцыі, і ў Іарданіі. На крайні выпадак ёсць запасны шлях — праз Кіпр: з гэтага вострава ходзяць судны як у Сірыю, так і ў Ліван, адкуль без праблем можна перабрацца на тэрыторыю суседняй дзяржавы і далучыцца да змагароў супраць рэжыму Асада.

Для еўрапейцаў турэцкі маршрут найбольш зручны: практычна бескантрольна, маючы пры сабе толькі ўнутраны пашпарт, можна дабрацца да самай мяжы з Сірыяй. Там сустракаюць агенты ісламістаў і перапраўляюць праз мяжу. Амерыканцам, канадцам і аўстралійцам даводзіцца карыстацца авіятранспартам, каб трапіць у Турцыю і Іарданію, але потым усё ідзе па стандартнай схеме.

Для адзіночкі пераход мяжы таксама не складае праблемы — прыязныя кантрабандысты заўсёды гатовы дапамагчы. Да нядаўняга часу Турцыя практычна ніяк не спрабавала спыніць паток джыхадыстаў. У апошнія месяцы кантроль у прыгранічных правінцыях прыкметна стаў больш жорсткім, але грошы па-ранейшаму лёгка вырашаюць большасць праблем.

Зялёныя брыгады

Баевікі, якія прыбылі з Еўропы, звычайна разбіваюцца па зямляцтвах, улівaючыся ў «кацібы». Гэтае слова часта перакладаюць як «брыгады», хоць кацібы мала падобныя да звыклых вайсковых часцей. Па некаторых звестках, у раёне Алепа дзейнічаюць 5–6 франкамоўных брыгад, якія складаюцца з французаў і бельгійцаў, а таксама няпэўны лік нямецкамоўных. Падобны падзел па зямляцтвах — вымушаная мера. Еўрапейскія добраахвотнікі, як правіла, дрэнна ведаюць арабскую мову, і іх нельга размеркаваць па лінейных падраздзяленнях. Па апошніх звестках, у шэрагах ісламістаў сёння ваююць каля 15 тысяч грамадзян розных дзяржаў. Большасць родам з ісламскіх краін, але і еўрапейцаў нямала — некалькі тысяч.

Замежныя добраахвотнікі часта мільгаюць на відэа — яны ахвотна пазіруюць для таварышаў, жартуюць на камеру і выкладваюць фотаздымкі ў Instagram. Сумны рэкорд у гэтым плане належыць праслаўтаму Джыхад Джону, які адрэзаў галаву амерыканцу Фоўлі. Ён уваходзіць у кацібу з чатырох чалавек. Брыгада атрымала неафіцыйную назву The Beatles таму, што ўсе яе члены гавораць па-англійску і не ведаюць арабскай, а баевікоў празвалі Джон, Джордж, Рынга і Пол — па імёнах членаў легендарнага гурта.

Летась у Еўропе сапраўдную сенсацыю стварыў ролік з нейкім Абу Амарам з «Ісламскай дзяржавы», уладальнікам французскага пашпарта, які на сваім пікапе перавозіў трупы расстраляных мірных жыхароў і баевікоў з канкуруючых арганізацый. «Раней я вазіў гідрацыклы, матацыклы і квадрацыклы, — усміхаючыся, распавёў Абу Амар, — а цяпер важу муртадаў (адступнікаў) і кафіраў (няверных)». Фота яшчэ аднаго баевіка — немца Мустафы — выклаў у Facebook яго таварыш па джыхадзе, мусульманін-неафіт Філіп Бергнер. На здымку задаволены Мустафа пазіруе на фоне забітых. Як высветлілі нямецкія спецслужбы, і Мустафа, і Філіп пражывалі раней у раёне Лоберг гарадка Дынслакена зямлі Паўночны Рэйн — Вестфалія. Прычым высветлілася, што ў Сірыі ваююць адразу сем чалавек з Лоберга, і яны нават сфарміравалі ўласную кацібу — «Брыгаду Лоберг». Гэта дало журналістам падставу абвінаваціць нямецкія спецслужбы ва ўтойванні сапраўднай інфармацыі. Лоберг нічым не вылучаецца з тысяч іншых раёнаў, і калі з яго ў Сірыю адправіліся сямёра, які ж праўдзівы маштаб патоку германскіх джыхадыстаў?

Пытанне зусім не рытарычнае. Рана ці позна многія з тых, хто ацалее ў пекле вайны, захочуць вярнуцца дадому. Хоць нямала джыхадыстаў урачыста перад аб'ектывам камеры спалілі свае еўрапейскія пашпарты, жадаючы паказаць, што маюць намер змагацца да поўнай перамогі і застацца потым у «халіфаце», але так паступаюць далёка не ўсе. У верасні 2014-га начальнік паліцыі Лондана паведаміў, што валодае інфармацыяй аб 250 падданых каралевы, якія вярнуліся ў Вялікабрытанію пасля ўдзелу ў баявых дзеяннях у Сірыі на баку ісламістаў. Мэр Лондана Барыс Джонсан прапанаваў любога, хто быў у зоне баявых дзеянняў і не паведаміў пра гэта ўладам, лічыць тэрарыстам. Тады гэтая мера здалася занадта радыкальнай. Не выключана, што пасля тэрактаў у Парыжы погляды на гэта зменяцца.

Аляксей КУПРЫЯНАЎ
(www.lenta.ru)

■

ЗАПРАШАЕМ
РАЗМЯСЦІЦЬ РЭКЛАМУ
Ў ГАЗЕЦЕ «ЗВЯЗДА»
Тэл./факс: (8 017) 287 17 79, 292 04 52.
E-mail: reklama@zviazda.by.

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

Наименование	Характеристика
ЛОТ 3	
Наименование и краткая характеристика объекта, адрес расположения	Капитальное строение, инв. № 400/С-46318 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад), площадью 273,0 кв.м, как единый объект имущества в составе капитального строения с принадлежностями, расположенное по адресу: г. Гродно, ул. Озерское шоссе, 12
Земельный участок, на котором расположен объект	Кадастровый номер 440100000002000592, площадью 0,0632 га (назначение – строительство и обслуживание здания) по адресу: г. Гродно, ул. Озерское шоссе, 12
Начальная цена продажи	825 000 000 (восемьсот двадцать пять миллионов) белорусских рублей с учетом НДС
Сумма задатка	41 250 000 (сорок один миллион двести пятьдесят тысяч) белорусский рублей
Продавец	Гродненский городской филиал облпотребобщества, 230001, г. Гродно, ул. Суворова, 298
Организатор торгов	Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 41-98-32
Условия аукциона	Аукцион без условий
Условия оплаты	По договоренности сторон
Срок заключения договора купли-продажи	Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов
Номер р/с для перечисления задатка	Р/с 301 257 917 0017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области БИК 153001739, УНП 500833225
Аукцион состоится 28 января 2015 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209.	
К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: - заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении; - *юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь*: заверенная копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица и заверенные копии учредительных документов; - *индивидуальным предпринимателем*: документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются: - представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя; - физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица; - представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона. Продавец имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, до продажи объекта в процессе аукционных торгов, без объяснения причины. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов по названной аукционистом цене. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. **Извещение о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 22.11.2014 г.**	
Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница).	
Последний день приема заявлений 22 января 2015 г. до 15.00.	

Телефон для справок: 41-98-32–
Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки».
Дополнительная информация: www.ino.by

Утерянный страховой полис ЗАО «СК «ЭРГО» серии БО № 0282552 **считать недействительным.** УНП 191632284

ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

на право заключения договоров аренды земельных участков для строительства квартала малоэтажной жилой застройки и инженерно-транспортной инфраструктуры в дер. Дуброва Озерицко-Слободского сельсовета и строительства и обслуживания многоквартирного жилого дома в аг. Слобода, ул. Машерова Озерицко-Слободского сельсовета, Смолевичского района Минской области

1	**Форма проведения аукциона**	Открытый
2	**Дата, время и место проведения аукциона**	г. Смолевичи, ул. Советская, 125. Смолевичский райисполком, зал заседаний, 26.02.2015 г в 11.00
3	**Продавец и его адрес**	г. Смолевичи, ул. Советская, 125, Смолевичский райисполком
4	**Земельный участок, его кадастровый номер и адрес**	Лот № 1 – площадь 13,1143 га, кадастровый номер 624883003801000293, дер. Дуброва. Лот № 2 – площадью 0,4196 га, кадастровый номер 624883009601000862, аг. Слобода, ул. Машерова
5	**Условия продажи**	Без изменения целевого назначения
6	**Целевое назначение земельного участка**	Лот № 1 – для строительства квартала малоэтажной жилой застройки и инженерно-транспортной инфраструктуры. Лот № 2 – для строительства и обслуживания многоквартирного жилого дома
7	**Сроки аренды**	Лот № 1 – 99 (девяноста девять) лет Лот № 2 – 99 (девяноста девять) лет
8	**Сроки заключения договора аренды**	После оплаты стоимости предмета аукциона в течение 2 рабочих дней
9	**Начальная (стартовая) цена продажи**	Лот № 1 – 13 114 400 000 рублей Лот № 2 – 800 000 000 рублей
10	**Условия аукциона**	А) продажа по цене не ниже начальной; Б) участниками аукциона могут быть индивидуальные предприниматели, юридические лица Лот 2 – теплоснабжение: поквартирное отопление от существующих сетей газоснабжения. Безвозмездная передача в собственность Смолевичского райисполкома 7% общей площади жилых помещений в многоквартирном жилом доме (п.1.5 решения Минобл-исполкома от 14 ноября 2014 г. № 978)
11	**Наличие инженерной инфраструктуры**	Лот № 1 – электроснабжение Лот № 2 – электроснабжение, газоснабжение, водоснабжение, централизованное водоотведение, асфальтированный подъезд
12	**Условия оплаты**	За безналичный расчет в течение 10-ти рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона
13	**Сумма задатка и реквизиты продавца**	*р/с 3641000000205 ЦБУ 621 филиала № 616 АСБ «БеларусБанк», г. Жодино, код 812 УНП 600014139 ОКПУ 04064735, назначение платежа 04002.*

Затраты на организацию и проведение аукциона в том числе (изготовление землеустроительного дела, осуществление государственной регистрации создания земельного участка, публикация информационного сообщения, изготовление градостроительного паспорта) подлежат возмещению победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона.

Порядок предварительного ознакомления в натуре с продаваемым земельным участком – каждый четверг с 9.00 до 13.00.

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами принимаются ежедневно в рабочие дни по адресу: г. Смолевичи, ул. Подлесная, д. 11, каб. № 8.

Окончательный срок приема заявлений – 20.02.2015 г. 17.00.

Контактный телефон (8-01776) 55 3 42.

Для участия в аукционе в адрес продавца необходимо представить:

- заявление на участие в аукционе;
- документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий расчетный счет, указанный в извещении, с отметкой банка;
- индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;
- представителем индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;
- представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;
- представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;
- представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе индивидуальные предприниматели и юридические лица, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

Неявка участника аукциона на аукцион признается отказом в его участии.

ИЗВЕЩЕНИЕ

о проведении повторного аукциона (понижение начальной цены на 20%) по продаже имущества, находящегося в хозяйственном ведении РУП «Гродноэнерго»

Наименование предмета торгов, краткая характеристика	**Лот № 1** **Приспособление для уборки кукурузы Z933/2 (жатка) к комбайну ТС-59 «Нью-Холанд»,** инв. № 1391А, 2002 г.в., зав. № 343, масса 2020 кг, шестирядковая. Неисправности: требует ремонта механизм подачи початков крайнего ряда.		
Местонахождение имущества	Гродненская обл., Берестовицкий р-н, д. Старый Дворец		
Начальная цена	**77 898 320 рублей с учетом НДС**	**Сумма задатка**	**7 789 832 рублей**
Сведения о продавце	РУП «Гродноэнерго», г. Гродно, пр-т Космонавтов, 64, тел. 8(0152) 79 25 89		
Сведение об организаторе торгов	Гродненское областное учреждение финансовой поддержки предпринимателей, г. Гродно, ул. Мицкевича, 8, тел.: 8(0152) 77 23 79, 74 49 11		
Номер счета организатора торгов для перечисления задатка	р/с 3015575033025 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, г. Гродно, ул. Мицкевича, 3, код 739, УНП 500481906		
Срок заключения договора купли-продажи	В течение 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола о проведении торгов	**Условия оплаты**	В течение 10 (десяти) календарных дней со дня заключения договора купли-продажи
Торги состоятся 30 января 2015 года в 12.00 часов по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8			
Срок подачи документов для участия в торгах	**по 26 января 2015 года включительно до 16.00 часов по адресу: г. Гродно ул. Мицкевича, 8**		
Условия участия и порядок проведения аукциона размещены на сайте организатора торгов www.fincentr.by			
Дополнительная информация по телефонам в г. Гродно: 8(0152) 77 23 79, 74 49 11	Предыдущее извещение о проведении торгов опубликовано в газете «Звязда» № 192 от 09.10.2014 года		

Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ НАСТУПНЫХ ПАСАД:

- кафедра філасофіі: **дацэнт (2), прафесар, загадчык кафедры;**
- кафедра псіхалогіі і педагогікі: **старшы выкладчык, дацэнт;**
- кафедра фізічнага выхавання і спорту: **старшы выкладчык (2), дацэнт;**
- кафедра беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры: **старшы выкладчык, прафесар;**
- кафедра замежных моў: **старшы выкладчык (5);**
- кафедра тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый: **дацэнт, прафесар (2);**
- кафедра менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы: **прафесар;**
- кафедра інфармацыйных рэсурсаў: **старшы выкладчык, дацэнт, прафесар;**
- кафедра культуралогіі: **дацэнт (2), прафесар;**
- кафедра менеджменту сацыяльна-культурнай дзейнасці: **выкладчык (3), старшы выкладчык, дацэнт (4), прафесар;**
- кафедра педагогікі сацыякультурнай дзейнасці: **старшы выкладчык, прафесар;**
- кафедра міжкультурных камунікацый: **выкладчык (2), дацэнт;**
- кафедра беларускай і сусветнай мастацкай культуры: **старшы выкладчык (2), дацэнт;**
- кафедра тэорыі музыкі і музычнай адукацыі: **дацэнт, прафесар;**
- кафедра мастацтва эстрады: **выкладчык (8), старшы выкладчык (3), дацэнт;**
- кафедра духавой музыкі: **старшы выкладчык, дацэнт;**
- кафедра беларускай народна-песеннай творчасці: **старшы выкладчык, загадчык кафедры;**
- кафедра харавога і вакальнага мастацтва: **старшы выкладчык (2), дацэнт (2);**
- кафедра народна-інструментальнай творчасці: **выкладчык, старшы выкладчык, прафесар;**
- кафедра рэжысуры эстрады: **выкладчык (2);**
- кафедра аркестравага дырыжыравання: **загадчык кафедры;**
- кафедра этналогіі і фальклору: п**рафесар (2), загадчык кафедры;**
- кафедра тэатральнай творчасці: **выкладчык, дацэнт;**
- кафедра рэжысуры абрадаў і святаў: **выкладчык (2), старшы выкладчык (2);**
- кафедра народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва: **выкладчык (2);**
- кафедра харэаграфіі: **выкладчык (2), дацэнт (5);**
- кафедра рускай мовы як замежнай: **выкладчык, старшы выкладчык, дацэнт.**

Наш адрас: **220001 г. Мінск, вул. Рабкораўская, 17. Аддзел кадраў.**
Тел.: **(8017) 228 00 23, 222 76 41.**
УНП 100286677

Центр Промышленной Оценки
- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

ИЗМЕНЕНИЕ В ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

В извещение, опубликованное в газете «Звязда» от 10.01.2015, о проведении повторного открытого аукциона, назначенного на 21.01.2015, по продаже одним лотом объектов недвижимого имущества ОАО «Гроднорайагросервис», расположенных на земельном участке пл. 8,6869 га, по адресу: Гродненская обл., Гродненский р-н, Обуховский с/с д. Котра, ул. Молодежная, 2, вносится изменение:

Вместо: «Начальная цена с НДС – 17 461 316 143 бел. руб.»
Читать: «Начальная цена с НДС – 21 826 645 180 бел. руб.»

Тел.: +375 17 280 36 37; +375 29 183 69 71.
www.cpo.by. E-mail: auction@cpo.by
УНП 500030462

Не снежыла ў снежні — і гэта не дзіва:
Стаў клімат пад Слуцкам,
нібы на Мальдзівах.
На Ясельдзі ракі не спяць пад карчамі,
І лёд шчупакі разганяюць хвастамі.
І студзень, як бачыце, студзіць не надта —
Не тая пайшла сінаптычная карта.
Не тая зіма, што раней пад Лагойскам.
Было, за сумётам хавалася вёска!
Ці там, дзе Гальшанскія вежы стаялі —
Пад снегам шыпшыны у рост патаналі...

Рыхтую кажух і валёнкі сабе я —
Мо ў лютым цяпер залютуюць завеі?
Застудзяць, заснежаць, як кажуць,
рэваншам
На ўсіх кантынентах — і нашым, і вашым!
Увечар сусед мне шапнуў па сакрэту:
«Інфляцыя знішчыла клімат планеты.
Забудзь пра завеі, сумёты і крыгі —
Чакаем пачатак сусветнай адлігі!»
...Я зранку аб'яўку павесіў ля крамы:
«Мяняю вушанку на брыль саламяны».

■ Факт

ПАДАРУНКІ ДЛЯ ГОРАДА ЭНЕРГЕТЫКАЎ

У Астраўцы адкрылі дзве адукацыйныя ўстановы: у новы будынак пераехаў калектыў гімназіі, а побач узведзены яслі-сад.

Гімназія цяпер разлічана на 510 вучняў, а сад — на 190 маленькіх жыхароў, і ўсе групы ўжо запоўнены. Абедзве ўстановы маюць не толькі выдатны дызайн, але і ўсё неабходнае для навучання і адпачынку. У садку ёсць басейн, зала для заняткаў харэаграфіяй, сучасны медыцынскі блок. У гімназіі — трэнажорная зала, інтэрактыўныя дошкі, інфармацыйна-бібліятэчны цэнтр, а ў двары — пляцоўкі для заняткаў спортам і нават для вывучэння ПДД.

Падарункам ад Гродзенскага аблвыканкама сталі камп'ютарныя класы, ад райвыканкама — лінгафонны кабінет школе і абсталяванне для электроннай гульнявой яслям-саду.

Барыс ПРАКОПЧЫК

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	9.19	17.20	8.01
Віцебск —	9.15	17.03	7.48
Магілёў —	9.09	17.10	8.01
Гомель —	9.09	17.10	8.01
Гродна —	9.33	17.36	8.03
Брэст —	9.27	17.44	8.17

Месяц

Апошняя квадра 13 студзеня.
Месяц у сузор'і Стральца.

Імяніны

Пр. *Малахіі, Гардзея.*
К. *Валерыі, Вальдэмара, Уладзіміра.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



■ Добрая навіна

БЯСПЕКА ПЕРШ ЗА ЎСЁ

Напярэдадні Дня ратавальніка ў Магілёве адкрылася новая пажарная часць

Двухпавярховы будынак з'явіўся якраз на мяжы двух буйных мікрараёнаў горада — Казіміраўкі і Спадарожніка. Тут прыжывае прыкладна шостая частка насельніцтва абласнога цэнтра — каля 60 тысяч чалавек. І абодва мікрараёны актыўна забудоўваюцца. Толькі ў Спадарожніку прадугледжана ўзвядзенне 46 жылых дамоў, 2 агульнаадукацыйных школ, 5 дзіцячых садкоў, іншых сацыяльна значных аб'ектаў.

— У нашай дзяржаве ўсё робіцца для таго, каб камфортна жылося чалавеку, — адзначыў падчас адкрыцця **старшыня Магілёўскага аблвыканкама Уладзімір ДАМАНЕЎСКІ.** — І новае пажарнае дэпо добры прыклад гэтаму. Мы павінны прымаць усе меры па абароне насельніцтва. Пра станоўчы вынік працы ратавальнікаў сведчыць тое, што колькасць людзей, якія загінулі на пажарах, штогод памяншаецца.

Дарэчы, узвядзенне дэпо было прадугледжана інвестыцыйнай праграмай Магілёўскай вобласці на 2013-2014 гады. На яго будаўніцтва выдаткаваны 21 мільярд рублёў. На ўзбраенні часці новая пажарная тэхніка, у тым ліку пад'ёмнік з вышынёй 48 метраў, які дазволіць аператыўна дабірацца на высокія паверхі жылых дамоў. Баявую вахту на новым аб'екце будуць весці адначасова 10 ратавальнікаў. Для іх працы і адпачынку тут створаны ўсе ўмовы.

— Пытанням бяспекі насельніцтва ў нас надаецца шмат увагі, — падкрэсліў **міністр МНС краіны Уладзімір ВАШЧАНКА**. — Безумоўна, людзі таксама павінны валодаць навыкамі супрацьпажарнай абароны. Трэба актыўна весці тлумачальную працу сярод грамадзян, пастаянна нагадваць аб правілах паводзін у надзвычайных сітуацыях і неабходнасці іх выконваць. І тое, што ўсе органы ўлады працуюць у цесным узаемадзеянні, толькі на карысць агульнай справе. Мы разам шукаем больш дасканалыя формы і метады працы.

У якасці падарунка ад абласной улады новая пажарная часць атрымала пажарную аўтацыстэрну.

Нэлі ЗІГУЛЯ

УСМІХНЕМСЯ

— Мужыкі, таксі выклікалі?

— Так.

— Разумееце, у мяне машына зламалася. Давайце я вас пешшу дадому праводжу.

Лесаруба, арыштаванага за незаконную высечку лесу, прысудзілі да пяці гадоў законнай высечкі.

— Дарагая, навошта табе кветкі? Яны ж усё адно звянуць!

— Дарагі, а навошта мне ты? Ты ж усё роўна калі-небудзь памрэш!

Лепшы спосаб пераканаць жонку зрабіць генеральную прыборку кватэры — расказаць ёй пра заначку, якую забыў, дзе схаваў.

Адэса, дыялог на Прывозе.

— Вой, нешта ваша скумбрыя не залаціцца...

— Дамачка, вы сабраліся на яе жаданні загадваць або такі есці?..

Даты Падзеі Людзі

16 СТУДЗЕНЯ

1905 год — 110 гадоў таму нарадзіўся (вёска Прусінава, цяпер Уздзенскі раён) Алесь Пальчэўскі, беларускі пісьменнік. У 1931 годзе скончыў БДУ. Першыя яго вершы і апавяданні былі надрукаваны ў 1925-м. Аўтар п'ес «З чырвоным сцягам», «Суседка», зборнікаў апавяданняў і аповесцяў «Жнівеньская раніца», «Дым над лесам» і іншых. Быў двойчы рэпрэсаваны (1936, 1949 гадах), высылаўся ў Краснаярскі край. Пасля рэабілітацыі (1954) жыў у Мінску. Працаваў у газеце «Зорька», быў рэдактарам у Дзяржвыдавецтве БССР, адказным сакратаром часопіса «Вясёлка». Памёр у 1979 годзе.

1920 год — «Сухі закон» у ЗША быў замацаваны канстытуцыйна. Яшчэ ў канцы XIX стагоддзя ў ЗША пашырыўся антыалкагольны рух. У 1869 годзе была нават створана партыя «сухога закону», асабліва супраць «спойвання нацыі» выступалі жаночыя аб'яднанні і царква. У 1917 годзе Кангрэс прыняў і накіраваў на зацвярджэнне штатаў праект васямнаццатай папраўкі да Канстытуцыі аб увядзенні «сухога закону». У верасні 1917-га ў краіне была спынена вытворчасць віскі, а ў маі 1919-га тая ж доля спасцігла і вытворчасць піва. З 1 ліпеня 1919 года на тэрыторыі ЗША быў цалкам забаронены продаж спіртных напояў. 16 студзеня 1920 года была, нарэшце, прынятая 18-я папраўка да Канстытуцыі ЗША. Цяпер закон пазбаўляў ліцэнзій на бізнес вінаробаў, пастаўшчыкоў алкаголю і гандляроў спіртным. Супраць ратыфікацыі «сухога закону» выступілі штаты Канэктыкут, Ілінойс, Род-Айлэнд і Вісконс. Менавіта адтуль у іншыя рэгіёны краіны ішла кантрабанда алкаголю. На барацьбу з парушальнікамі было выдаткавана больш за 12 мільёнаў долараў. Адмена «сухога закону» адбылася 5 снежня 1933 года, пасля прыняцця Кангрэсам ЗША 21-й папраўкі. Пры гэтым і сёння дапускаюцца абмежаванні на абарачэнне алкаголю на ўзроўні штатаў.

1969 год — створана першая ў свеце эксперыментальная арбітальная станцыя. «З берага Сусвету, якім стала зямля нашай Радзімы, не раз адпраўляцца ў нязведаныя далі касмічныя караблі, — пісаў акадэмік Каралёў. Кожны іх палёт і вяртанне будзе вялікім святам...». У гэты дзень у 1969 годзе адбылася важная падзея ў сусветнай гісторыі: касмічныя караблі «Саюз-4» і «Саюз-5» састыкаваліся ў космасе, утварыўшы першую эксперыментальную арбітальную станцыю. Касманаўты Яўген Хруноў і Аляксей Елісееў правялі эксперымент, які не меў на той момант аналагаў: праз адкрыты космас перайшлі з аднаго карабля ў другі. Далейшыя запускі касмічных караблёў «Саюз» дазволілі да 1971 года наладзіць стварэнне арбітальных станцый, якія маглі працяглы час знаходзіцца на арбіце.

Было сказана

Рыгор БАРАДУЛІН, народны паэт Беларусі:

«Бачыць далей маладое вока,
Вока старое глядзіць глыбей».

НАРОДЖАНЫЯ 16 студзеня

Асноўная мэта іх жыцця — бездакорнае выкананне абавязкаў, а інструмент самаацэнкі — задавальненне ад усведамлення здзейсненага ўчынку. Іх задачы павінны быць дакладна акрэслены, таму што яны не здольны пераадольваць цяжкасці на шляху да пастаўленай мэты, засяроджвацца на штодзённых клопатах і рэалістычна ацэньваць свае магчымасці, даводзячы сябе да стану разгубленасці. У сувязі з тым, што перамены ў іх жыцці паўстаюць нечакана і маланкава, яны ўмеюць па-майстэрску ўцягнуць сябе ў бездань стрэсаў і песімізму, для выхаду з якога ім неабходна навучыцца надаваць увагу ўзаемаадносінам з іншымі людзьмі.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 21.073. Індэкс 63850. Зак. № 216.

Нумар падпісаны ў 19.30 15 студзеня 2015 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12